Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПЯТНІЦА, 29 сакавіка 1985 г. № 13 (3267) ⊙ Выходзіць з 1932 г. ⊙ Цана 10 кап.

Унумары:

Вера ВЯРБА.

Новыя вершы.

●

Анатоль КАЗЛОЎ.

Кароткія апавяданні.

●

Святлана БЕРАСЦЕНЬ.

Кінагод: лічбы і эмоцыі.

●

Уладзімір КАЗБЯРУК.

Міфы і рэальнасць.

ЯШЧЭ РАЗ ПРА АУТАРСТВА ПАЭМЫ «ТАРАС НА ПАРНАСЕ».

Святлынь. Фотаэцюд С. КРЫЦКАГА.

БЕЗЗАПАВЕТНА СЛУЖЫЦЬ НАРОДУ

Першая сесія Вярхоўнага Савета Беларускай ССР адзінаццатага склікання

У Мінску 28 сакавіка адбылася першая сесія Вярхоўнага Савета БССР адзінаццатага склікання.

Зала Дома афіцэраў. 10 гадзін 30 мінут. Месцы ў прэзідыуме займаюць таварышы М. М. Слюнькоў, І. Я. Палякоў, У. І. Бровікаў, Г. Г. Барташэвіч, В. Г. Балуеў, М. І. Дземянцей, М. В. Кавалёў, А. Т. Кузьмін, М. І. Лагір, У. А. Ляпёшкін, У. А. Мікуліч, І. Ф. Якушаў, сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Л. П. Чагіна, члены Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, намеснікі Старшыні Савета Міністраў БССР, міністры.

Сесію адкрыў адзін са старэйшых дэпутатаў Вярхоўнага Савета БССР, народны паэт Беларусі П. Е. Панчанка.

Дэпутаты мінутай маўчання ўшанавалі памяць Канстанціна Усцінавіча Чарненкі.

Сесія аднагалосна выбрала Старшынёй Вярхоўнага Савета Беларускай ССР дэпутата І. Я. Навуменку, пісьменніка, віцэ-прэзідэнта АН БССР. Былі таксама выбраны яго намеснікі.

Вярхоўны Савет зацвярджае парадак дня сесіі. У яго ўключаны пытанні: выбранне Мандатнай камісіі Вярхоўнага Савета БССР; выбранне Прэзідыума Вярхоўнага Савета рэспублікі; утварэнне пастаянных камісій Вярхоўнага Савета БССР; аб зацвярджэнні Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР; утварэнне Савета Міністраў БССР; утварэнне Камітэта народнага кантролю рэспублікі; выбранне Вярхоўнага суда БССР; аб задачах Саветаў народных дэпутатаў, міністэрстваў і ведамстваў Беларускай ССР па рацыянальнаму выкарыстанню і ўзмацненню рэжыму эканоміі паліўна-энергетычных рэсурсаў; справаздача аб рабоце Камітэта народнага кантролю Беларускай ССР.

Заслухаўшы даклад выбранай на сесіі Мандатнай камісіі, Вярхоўны Савет прымае пастанову аб прызнанні паўнамоцтваў дэпутатаў Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, выбраных па 485 выбарчых акругах.

Затым сесія пераходзіць да выбрання Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР.

Слова атрымлівае першы сакратар ЦК КПБ дэпутат М. М. Слюнькоў. Па даручэнню Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі ён уносіць прапанову, падтрыманую партыйнай групай і Саветам Старэйшын Вярхоўнага Савета БССР, зноў выбраць Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР дэпутата І. Я. Палякова.

І. Я. Палякоў аднагалосна выбіраецца Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР. Ён сардэчна падзякаваў Цэнтральнаму Камітэту КПСС, Цэнтральнаму Камітэту Кампартыі Беларусі, Вярхоўнаму Савету рэспублікі за аказаны гонар і вялікае давер'е і запэўніў, што ўсе свае сілы, вопыт і веды будзе аддаваць служэнню народу, Камуністычнай партыі, сацыялістычнай Радзіме.

Аднагалосна быў выбран таксама Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР.

Затым сесія прымае пастанову аб утварэнні пастаянных камісій Вярхоўнага Савета БССР. Выбіраюцца саставы камісій.

Зачытваецца паступіўшая на разгляд Вярхоўнага Савета БССР заява Савета Міністраў БССР аб тым, што ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Беларускай ССР Савет Міністраў рэспублікі лічыць свае абавязкі вычарпанымі і складае паўнамоцтвы перад нававыбраным Вярхоўным Саветам Беларускай ССР.

Першы сакратар Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі дэпутат М. М. Слюнькоў па даручэнню ЦК КПБ прапанаваў адобрыць дзейнасць урада рэспублікі і зноў назначыць Старшынёй Савета Міністраў БССР дэпутата У. І. Бровікава, даручыўшы яму прадставіць прапановы аб саставе ўрада Беларускай ССР.

Вярхоўны Савет БССР аднагалосна прыняў пастанову, у якой адобрыў дзейнасць урада рэспублікі і назначыў Старшынёй Савета Міністраў БССР дэпутата У. І. Бровікава.

Заслухаўшы даклад сакратара Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР дэпутата Л. П. Чагінай, Вярхоўны Савет зацвердзіў Указы Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, прыняў адпаведныя законы.

Па прапанове Старшыні Савета Міністраў БССР дэпутата У. І. Бровікава Вярхоўны Савет утварыў урад Беларускай ССР.

У. І. Бровікаў ад імя Савета Міністраў БССР сардэчна падзякаваў дэпутатам за аказаны гонар і выступіў з заявай аб будучай дзейнасці ўрада. Сесія аднагалосна прыняла пастанову, у якой адобрыла асноўныя напрамкі будучай дзейнасці ўрада рэспублікі.

Вярхоўны Савет утварыў Камітэт народнага кантролю БССР, выбраў Вярхоўны суд Беларускай ССР.

З дакладам «Аб задачах Саветаў народных дэпутатаў, міністэрстваў і ведамстваў Беларускай ССР па рацыянальнаму выкарыстанню і ўзмацненню рэжыму эканоміі паліўна-энергетычных рэсурсаў» выступіў намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР дэпутат Л. С. Фірысанаў.

Пасля абмеркавання гэтага пытання Вярхоўны Савет БССР прыняў адпаведную пастанову.

Са справаздачай аб рабоце Камітэта народнага кантролю БССР выступіў яго старшыня дэпутат М. І. Лагір. Вярхоўны Савет пасля абмеркавання прыняў пастанову па справаздачы.

На гэтым першая сесія Вярхоўнага Савета БССР адзінаццатага склікання завяршыла работу.

БЕЛТА.

27 САКАВІКА ГРАМАДСКАСЦЬ АДЗНАЧЫЛА МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ ТЭАТРА

КАБ АДГУКАЛАСЯ СЭРЦА

Вясновыя афішы заўсёды прываблiваюць гледачоў, бо ў гэтую пару года набліжаецца заканчэнне тэатральнага сезона, выпускаюцца прэм'еры, абвешчаныя летась, робяць творчую справаздачу сёлетнія дэбютанты — рэжысёры і артысты. І адзначаецца Дзень тэатра — свята, аднолькава радаснае для работнікаў сцэнічнага мастацтва і для наведвальнікаў тэатральных залаў усіх узростаў. Сёлета гэта свята праходзіла пад дэвізам: «Мір адстаялі — захаваем мір» і прысвячалася ваенна-патрыятычнай тэме. На падмостках — вобразы герояў Вялікай Айчыннай вайны, якая закончылася сорак гадоў назад разгромам гітлераўскага рэйха.

Прыкметная з'ява сакавіка — спектаклі, пастаўленыя новымі галоўнымі рэжысёрамі абласных тэатраў. Дэбютант у драматургіі гомельскі журналіст Васіль Ткачоў выходзіць да гледачоў з дзвюма прэм'ерамі. Першая — драма «Сівы бусел», якую паказаў Магілёўскі абласны драматычны тэатр у пастаноўцы А. Дольнікава (раней ён працаваў чарговым рэжысёрам у Брэсцкім тэатры імя Ленінскага камсамола Беларусі). Галоўны рэжысёр у Гомелі Г. Пімена ў творчым кантакце з В. Ткачовым рыхтуе спектакль па другой п'есе маладога драматурга — «Вокны», дзе востра дэбатуюцца пытанні адносін сучасніка да роднай зямлі, яго абавязку і сумлення пры выбары лёсу і справы жыцця. Галоўны рэжысёр Рэспубліканскага тэатра юнага гледача У. Караткевіч, які паставіў ужо з гэтым калектывам драму «Паядынак» М. Матукоўскага і інсцэніроўку «Пунсовых ветразяў» А. Грына (п'еса «Асоль» В. Лукшы), да юбілею Перамогі савецкага народа над фашызмам прапануе сцэнічнае ўвасабленне драмы «У спадчыну — жыццё» А. Петрашкевіча. Неўзабаве пазнаёміць грамадскасць з новай работай Рускі тэатр БССР, дзе галоўны рэжысёр В. Маслюк пераносіць на сцэну аповесць В. Быкава «Знак бяды». Па-ранейшаму карыстаюцца ўвагай гледачоў творы, што выкрываюць антычалавечую ідэалогію фашызму і славяць барацьбітоў супраць гітлераўскага «новага парадку» — «Судны час» Р. Суруса (Дзяржаўны тэатр музычнай камедыі БССР), «Балеро» М. Равеля (Акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета БССР). У Брэсце галоўны рэжысёр абласнога тэатра У. Забела паставіў п'есу сучаснага балгарскага драматурга Г. Данаілава «Восень следчага».

Дзень тэатра адзначаны сустрэчамі артыстычных калектываў з прадстаўнікамі грамадскасці, воінамі Савецкай Арміі, школьнікамі, гутаркамі пра надзённыя праблемы сцэнічнага мастацтва, выстаўкамі ў фае.

К. ТУР.

Галоўны рэжысёр Гомельскага абласнога тэатра Генадзь Піменаў і аўтар п'есы «Вокны», якую ён ставіць. Васіль Ткачоў на рэпетыцыі.

Фота А. ВАЙНШТЭЙНА.

СТВОРАНА ЛІТАБ'ЯДНАННЕ

Са Шклоўскага раёна выйшаў шэраг вядомых пісьменнікаў — празаік У. Шыцін, паэты А. Сербантовіч, С. Гаўрусёў, Я. Крупенька, А. Жыгуноў... І зараз у раённай газеце «Ударны фронт» змяшчаюцца літаратурныя старонкі, дзе выступаюць са сваімі творамі калгаснік з вёскі Лазіцы Л. Галіноўскі, інспектар электранагляду Ф. Гунёў, работніца аптэкі В. Канькова, механік раённага аддзялення «Сельгасхіміі» В. Байдакоў, тэхнолаг папяровай фабрыкі «Спартак» Я. Гуцол і іншыя аўтары.

Нядаўна яны сабраліся ў рэдакцыі на сход. Рэдактар Л. Анціпенка расказаў аб удзеле пачаткоўцаў у рабоце газеты. Сакратар Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў БССР І. Аношкін спыніўся на надзённых задачах мясцовых літаратараў.

Створана літаратурнае аб'яднанне, якое ўзначаліла Я. Гуцол.

А. НОВІК.

КОНКУРС ЧЫТАЛЬНІКАЎ

Адбыўся агляд-конкурс чытальнікаў і калектываў мастацкага чытання горада Мінска, прысвечаны 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. У гэтым мерапрыемстве, якое праходзіла два дні ў Доме літаратара, прыняло ўдзел больш за 150 чалавек.

Парадавалі слухачоў сваім высокім майстэрствам удзельнік маладзёжнага тэатра ЖЭС № 66 Сяргей Мацкевіч, студэнт Беларускага тэхналагічнага інстытута імя С. М. Кірава Амад Манжэйро, удзельніца мастацкай самадзейнасці Палаца культуры і спорту чыгуначнікаў імя Ільіча Лілія Захаркіна, механік аўтакалоны ўпраўлення грузавога транспарту Васіль Лушчыцкі, студэнтка Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага Ірына Забаўская, студэнтка Мінскага інстытута культуры Тамара Крук, навучэнка сярэдняй школы № 113 Алена Коўшык, інжынер аднаго з прадпрыемстваў Арнольд Пятроў. Яны і прызнаны лаўрэатамі агляду-конкурсу.

На высокім мастацкім узроўні прачытаў свае ўласныя вершы «Хатынь» і «Пакуль гучала песня» рэдактар радыёперадач завода электронна-вылічальных машын Аляксандр Сарапкін.

— У рэпертуары чытальнікаў і ўдзельнікаў літаратурна-музычных кампазіцый шмат было твораў беларускіх пісьменнікаў — Васіля Быкава, Ніла Гілевіча, Анатоля Вярцінскага, — падводзячы вынікі конкурсу, зазначыла старшыня журы, дацэнт Мінскага інстытута культуры, заслужаная артыстка БССР Рыма Фёдараўна Маленчанка.

К. ПЯРШАЙСКІ.

У ДАПАМОГУ НАСТАЎНІКАМ

«Бібліятэка настаўніка беларускай мовы і літаратуры» — падпісное выданне, выпуск якога выдавецтва «Народная асвета» распачало некалькі гадоў назад, карыстаецца папулярнасцю ў тых, хто далучае школьнікаў да непаўторнага свету роднага слова. Рэгулярна ў серыі выходзяць чарговыя кнігі. На пачатку сёлетняга года пабачыла свет яшчэ адна — «Вывучэнне тэорыі літаратуры ў школе», напісаная А. Ленсу.

Аўтар імкнецца дапамагчы настаўнікам у выкладанні пытанняў тэорыі літаратуры, на якія звяртаецца першапачатковая ўвага ў чацвёртых — сёмых класах. Кніга пабудавана такім чынам, што пытанні тэарэтычнага плану суседнічаюць з выкарыстаннем канкрэтных прыкладаў з твораў вядомых беларускіх пісьменнікаў. Увесь матэрыял аб'яднаны ў раздзелы «Вывучэнне сродкаў мастацкай выразнасці», «Развіццё ўяўлення аб пейзажы і яго роля ў літаратурным творы», «Засваенне паняцця «літаратурны герой», «Аб мастацкай функцыі партрэта» і іншыя.

М. ВАРАНЦОЎ.

ВЕЧАРЫ, СУСТРЭЧЫ

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Рыгор Барадулін і народны артыст рэспублікі Генадзь Гарбук сардэчна віталі свайго школьнага настаўніка Аляксандра Антонавіча Карабаня, выказалі яму словы ўдзячнасці за тое, што ў свой час адкрыў дарогу ў вялікі шлях ведаў і жыцця, прыпаднеслі кветкі, а Р. Барадулін да ўсяго прачытаў і вершы, прысвечаныя чалавеку, якога заўсёды ўспамінае са спагадай як дарагога старэйшага таварыша.

А. Карабань — былы дырэктар Ушацкай сярэдняй школы — даў пуцёўку ў жыццё сотням выхаванцаў, сярод якіх і вядомая беларуская паэтэса Еўдакія Лось. Навогул, прафесія педагогаў у Карабаняў стала сямейнай. Па шляху бацькі пайшла і дачка — Вольга Аляксандраўна выкладае рускую мову і літаратуру ў СШ № 140 г. Мінска. Марыць стаць настаўніцай яе дачка, унучка Аляксандра Антонавіча.

Сям'я Карабаняў не выпадкова была запрошана на вечар «Цяпло сэрца свайго — дзецям», што праходзіў у мінулую пятніцу ў Палацы культуры Белсаўпрофа ў рамках цыкла «Мая прафесія — мой гонар». На ім сабраліся і іншыя прадстаўнікі настаўніцкіх дынастый Фрунзенскага раёна беларускай сталіцы. Вядучая вечара заслужаная артыстка БССР З. Бандарэнка прадставіла прысутным таксама і Героя Сацыялістычнай Працы Лідзію Кузьмінічну Тарасевіч і Валянціну Адамаўну Разумовіч.

Педагогаў віталі заслужаны артыст БССР Я. Еўдакімаў і артыстка Белдзяржфілармоніі З. Феакцістава, са змястоўнай праграмай выступіў і эстрадны аркестр Палаца культуры Белсаўпрофа.

П. ГАРДЗІЕНКА.

Адзін з момантаў вечара.

Фота А. САСІНОЎСКАГА.

Творчая сустрэча са студэнтамі трэцяга курса акцёрскага факультэта Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута прайшла ў Доме работнікаў мастацтваў у рамках цыкла «Маладыя — маладым». Пра справы творчай моладзі расказала кіраўнік курса народная артыстка БССР З. Браварская.

Студэнты паказалі ўрыўкі з вучэбных спектакляў «Дванаццатая ночы» В. Шэкспіра, «Лаўка» А. Гельмана, «Альпійская балада» В. Быкава і іншых, кампазіцыю «Хатынь».

Г. ПЯТРОЎСКІ.

●

Чарговы вечар з цыкла «Пісьменнік у замежнай паездцы» прайшоў у Доме літаратара. На гэты раз пра сваю паездку ў Індыю расказаў вядомы беларускі паэт і вучоны-літаратуразнавец А. Лойка.

Вечар адкрыў і вёў старшыня Беларускага камітэта па сувязях з пісьменнікамі Азіі і Афрыкі А. Асіпенка.

Е. ДРОМІН.

У МІНІСТЭРСТВЕ КУЛЬТУРЫ БССР

20 сакавіка адбылося чарговае пасяджэнне калегіі Міністэрства культуры БССР, на якім было разгледжана шэраг актуальных пытанняў культурнага будаўніцтва ў рэспубліцы.

Калегія абмеркавала вытворча-фінансавую дзейнасць галіны за 1984 год і два месяцы 1985 года.

На пасяджэнні разгледжаны рэпертуарныя планы драматычных і лялечных тэатраў рэспублікі на 1985 год.

Падведзены вынікі рэспубліканскага сацыялістычнага спаборніцтва паміж абласцямі, гарадамі і раёнамі на лепшую пастаноўку культурна-масавай работы сярод насельніцтва ў 1984 годзе, а таксама сацыялістычнага спаборніцтва сярод тэатральна-глядзельных прадпрыемстваў галіны.

Калегія разгледзела вынікі работы з творчай моладдзю і шэраг іншых пытанняў.

ВЯСНА ПРЫБАЛТЫЙСКАЯ

З 4 па 9 красавіка ў Рызе пройдзе традыцыйны фестываль «Прыбалтыйская тэатральная вясна». Сёлета ён прысвячаецца 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Як вядома, гэтае свята мастацтваў збірае дзеячаў і аматараў тэатра Літвы, Латвіі, Эстоніі, Калінінградскай вобласці і Беларусі. Нашу рэспубліку на сёлетнім фестывалі прадстаўляе Акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы, які пакажа ўдзельнікам і гасцям «Прыбалтыйскай тэатральнай вясны» спектакль «Радавыя» па п'есе А. Дударава.

С. ВЕТКА.

ВЫСТАЎКІ

Марозны дзень.

У Палацы мастацтваў адкрылася яшчэ адна персанальная выстаўка. У сувязі з 60-годдзем творчую справаздачу трымае Вячаслаў Ражкоў. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, выпускнік Палехскага мастацкага вучылішча імя М. Горкага, ён з 1961 года жыве і працуе ў Мінску. Асноўны жанр, у якім выступае, лакавая мініяцюра. Прадаўжаючы традыцыі майстроў, В. Ражкоў афармляе куфэркі, шкатулкі, дэкаратыўныя пано.

Некаторыя з мініяцюр мастака прадстаўлены на выстаўцы. Аб шматграннасці таленту В. Ражкова сведчыць яго зварот да жанру эцюда. «Марозны дзень», «Прамень сонца», «Фарбы асеннія», «На заходзе сонца» — гэтыя і шмат якія іншыя творы пазначаны аўтарскай назіральнасцю, уменнем паэтызаваць з'явы рэчаіснасці. У экспазіцыі — шмат акварэлей, што таксама сведчаць аб своеасаблівасці почырку аўтара.

Часта звяртаецца В. Ражкоў да казачна-гістарычных і фальклорных сюжэтаў.

Г. ЛОСЕУ.

Спаўняецца 150-годдзе з дня нараджэння Крыш'яніса Барона — латышскага фалькларыста, пісьменніка і грамадскага дзеяча, збіральніка народных песень.

К. Барону прысвечана кніжная выстаўка, якая адкрылася ў Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя У. І. Леніна. Яе арганізавала Дзяржаўная бібліятэка Латвійскай ССР імя В. Лаціса ў парадку культурнага абмену кніжнымі выданнямі са сваімі калегамі з Беларусі.

Выстаўку адкрыла начальнік бібліятэчнай інспекцыі Міністэрства культуры БССР Т. Папова.

Латышскія прапагандысты кнігі расказалі пра творчую і грамадскую дзейнасць К. Барона, прадставілі яго творы.

На выстаўцы экспануецца больш за 150 экземпляраў кніг, брашур, ілюстраваных выданняў.

М. РОЗУМ.

У фае кінатэатра «Беларусь» горада Слуцка працуе выстаўка твораў навучэнцаў народнай самадзейнай студыі выяўленчага мастацтва мясцовага Дома піянераў і школьнікаў. У экспазіцыі — каля 30 работ. У асноўным — гэта графіка. Увагу наведвальнікаў прыцягваюць творы Сашы Уласава, Светы Дзмітрук, Анжэлы Сярэдзінскай і іншых.

А. РАМАНОВІЧ.

КАНФЕРЭНЦЫЯ ВЫКЛАДЧЫКАЎ

У Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А. В. Луначарскага адбылася навукова-тэарэтычная канферэнцыя прафесарска-выкладчыцкага складу на тэму: «Укараненне навукова-даследчых, метадычных і творчых работ у навучальны працэс».

Канферэнцыю адкрыла прарэктар па навуковай і ідэйна-творчай рабоце кандыдат мастацтвазнаўства, прафесар К. Сцепанцэвіч, якая выступіла з дакладам на тэму: «Аб стане навукова-даследчай і метадычнай работы ў Белдзяржкансерваторыі і задачах на 1986 — 1990 гады».

Тэматыка дакладаў была разнастайная і шырокая. Цэлы шэраг іх быў прысвечаны новым формам і метадам работы з творчай моладдзю, накіраваных на фарміраванне ў яе марксісцка-ленінскага светапогляду, актыўнай жыццёвай пазіцыі, выхавання творчай самастойнасці.

У іншых паведамленнях расказвалася пра новыя дапаможнікі і вучэбныя праграмы, над якімі працуюць выкладчыкі і якія ўжо выйшлі з друку і ўкаранёны ў навучальны працэс ВНУ.

Асаблівая ўвага была нададзена пытанням вывучэння і пашырэння даследаванняў у галіне фальклору і сучасных твораў кампазітараў Беларусі.

Своеасаблівым вынікам усёй вялікай навуковай і творчай работы стаў канцэрт, складзены з твораў беларускіх аўтараў. У ім прынялі ўдзел выкладчыкі і студэнты кансерваторыі, а таксама навучэнцы Сярэдняй спецыяльнай музычнай школы.

Э. СКУРАТАВА.

З ІМГНЕННЯЎ САТКАНАЯ РАДАСЦЬ

Заўтра апошнія акорды гэтага радаснага свята, якое афіцыйна называецца Тыдзень музыкі для дзяцей і юнацтва. Праводзіцца ён па ўсёй краіне ў дні вясновых школьных канікул. Сёлетні прайшоў у чатырнаццаты раз. І, як папярэднія, быў пазначаны шмат якімі цікавымі канцэртамі, сустрэчамі з вядомымі калектывамі і выканаўцамі. А паколькі прысвячаўся 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, шмат увагі было ўдзелена ваенна-патрыятычнаму выхаванню хлопчыкаў і дзяўчынак. Тэма мужнасці савецкага народа ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі гучала неаднаразова.

У сапраўднае свята ператварылася ўрачыстае адкрыццё Тыдня, якое адбылося ў суботу ў канцэртнай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Да юных слухачоў звярнулася сакратар Мінскага абласпрофа, старшыня Мінскага абласнога аргкамітэта па правядзенні Тыдня Р. Давідовіч, якая гаварыла аб вялікай ролі музыкі ў выхаванні падрастаючага пакалення, аб тым, што творцы рэспублікі шмат якія са сваіх твораў адрасуюць дзецям.

У выкананні сімфанічнага аркестра Дзяржтэлерадыё БССР прагучала «Святочная увертюра» А. Мдзівані, што стала запеўкай да ўсяго канцэрта.

Сваё майстэрства дэманстравалі і юныя выканаўцы. У прыватнасці, выступалі хор СШ № 1, вакальны ансамбль Спецыяльнай сярэдняй музычнай школы пры Белдзяржкансерваторыі імя А. В. Луначарскага, дзіцячы ансамбль сучаснага танца «Мульцін» вытворчага аб'яднання вылічальнай тэхнікі, узорны ансамбль танца «Равеснік» Палаца культуры Белсаўпрофа, а таксама асобныя юныя артысты — вучаніца чацвёртага класа СШ № 7 В. Вішнеўская, вучаніцы Сярэдняй спецыяльнай музычнай школы І. Рыдлеўская, Н. Мяцельская.

Праграму канцэрта вяла заслужаная артыстка БССР З. Бандарэнка.

У наступныя дні Тыдзень набыў у беларускай сталіцы новыя акорды. Найбольш значныя канцэрты адбыліся ў памяшканні філармоніі. Былі прадоўжаны вечары з цыкла «Музычныя гісторыі», «Музычная архітэктура». Многім спадабаўся і цыкл «Спяваюць дзіцячыя хоры». На гэты раз у канцэрце прынялі ўдзел хор «Равеснікі» СШ № 2 з Барысава (мастацкі кіраўнік — А. Шуб) і хор «Чабарок» дзіцячай музычнай школы № 9 г. Мінска (мастацкі кіраўнік — Н. Сліжэўская).

Урачыстае адкрыццё Тыдня.

Фота Ул. КРУКА.

Актыўны ўдзел у правядзенні Тыдня прынялі таксама Дзяржаўны ордэна Леніна акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета БССР і Дзяржаўны тэатр музычнай камедыі БССР, якія паказалі юным гледачам шэраг спектакляў.

Цікавыя мерапрыемствы ў рамках Тыдня прайшлі і ў іншых гарадах рэспублікі.

В. ЦЕРАХ.

АДКРЫЦЦІ ШТОДНЯ

Нямала цікавых сустрэч падарыў школьнікам Усесаюзны тыдзень кнігі для дзяцей і юнацтва. Праходзілі яны і ў Доме літаратара, і ў школах, і ў кнігарнях. У тым ліку і ў магазіне-клубе «Светач», што знаходзіцца ў беларускай сталіцы па праспекту Машэрава.

Выдавецтва «Юнацтва» ў гэтыя дні арганізавала тут справаздачную выстаўку кніг, якія выйшлі за чатыры гады работы калектыву. Былі прадстаўлены зборнікі паэзіі і прозы, калектыўныя зборнікі, навукова-папулярнай літаратуры, што выпушчаны раней, а таксама тыя, якія пабачылі свет нядаўна.

Хлопчыкі і дзяўчынкі, што завіталі ў мінулую суботу ў магазін-клуб, маглі пачуць шмат каго са сваіх любімых пісьменнікаў. На сустрэчу да сваіх юных сяброў прыйшлі старэйшы беларускі паэт, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР і Міжнароднага ганаровага дыплома імя Г.-Х. Андэрсена Васіль Вітка, сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў рэспублікі Б. Сачанка, дырэктар выдавецтва «Юнацтва» В. Лукша, галоўны рэдактар Я. Карашукоў, супрацоўнікі выдавецтва У. Карызна і У. Машкоў, мастачка А. Лось, празаікі П. Місько, С. Міхальчук і іншыя.

Адбылася шчырая гаворка, пад час якой дзеці даведаліся шмат цікавага і аб выданні кніг, і аб напісанні твораў, а галоўнае, маглі пагутарыць з пісьменнікамі, якіх добра ведаюць па шматлікіх кнігах.

Б. САКОЛЬСКІ.

Любяць дзеці казкі дзеда Васіля. Васіль Вітка з юнымі чытачамі.

Фота М. МІНКОВІЧА.

ОПЕРА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Народны оперны тэатр Палаца культуры Белсаўпрофа паставіў спектакль для дзяцей — оперу-казку «Кот у ботах» Ц. Кюі. Рэжысёр — народны артыст БССР М. Сярдобаў, дырыжор — заслужаны дзеяч мастацтваў рэспублікі П. Кірыльчанка. Танцы паставіла народная артыстка БССР А. Нікалаева. У ролях заняты Л. Івашкоў, Л. Глазырына і іншыя.

І. ГРЫНЬКОЎ.

СТУДЫЯ Ў КЛІМАВІЧАХ

Спектаклем па п'есе Э. Брагінскага «Пакой» пачала сваю творчую работу тэатральная студыя, створаная ў Клімавічах.

Рэжысуру і пастаноўку камедыі ажыццявіла выпускніца Мінскага інстытута культуры Г. Собалева, якая кіруе калектывам мастацкай самадзейнасці Дома культуры камбіната будматэрыялаў.

Н. Жданок (Ліза), М. Шпакаў (Дзергачоў), Г. Собалева (Альбіна) і іншыя ўдзельнікі студыі пакарылі гледачоў сваім артыстызмам і шчырасцю.

М. ГЛУЗДОЎ.

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

ТУТ НАСТАЎНІЧАЎ КОЛАС...

Нядаўна мы наведалі школьны музей Якуба Коласа ў вёсцы Пінкавічы, дзе ў 1903—1905 гадах працаваў настаўнікам народны паэт Беларусі. Уражанняў пасля знаёмства з экспазіцыяй музея, сустрэч з яго стваральнікамі — настаўнікамі і вучнямі Пінкавіцкай школы — засталося шмат. Звонкі, хвалюючы расказ дзяўчынкі-экскурсавода, знаёмства з прадметамі побыту, нацыянальным адзеннем палешукоў, фотаздымкі перанеслі нас у пачатак стагоддзя, калі прыехаў у вёску маладзы настаўнік Канстанцін Міцкевіч.

У музеі сабрана шмат успамінаў, якія апавядаюць пра Канстанціна Міхайлавіча як настаўніка і як чалавека спагадлівага, чулага да лёсу простага народа.

Мы пазнаёміліся са шматлікімі выданнямі кніг Якуба Коласа на мовах народаў СССР і іншых народаў свету.

Хочацца сказаць цёплыя словы падзякі арганізатарам Пінкавіцкага школьнага музея. Іх намаганні дапамаглі нам сэрцам далучыцца да жыцця і дзейнасці любімага песняра, які аддаў нашаму краю свае маладыя гады, сеяў сярод палешукоў «разумнае, добрае, вечнае», прысвяціў Палессю лепшыя свае творы. А працаваў Канстанцін Міхайлавіч таксама ў Люсіне, Лунінцы, Купяцічах і ў самім Пінску.

Мы любім свой родны Пінск, ён прыгажэе з кожным днём. Якуб Колас, як вядома, настаўнічаў тут тры гады, і за гэты час многае стварыў.

На нашу думку, было б вельмі правільна, каб у нашым старажытным Пінску адзін са скверaў быў упрыгожаны помнікам народнаму песняру. Мяркуем, што гэта жаданне многіх пінчан і ўсіх аматараў творчасці Якуба Коласа.

Навучэнцы 312-й групы Пінскага гідрамеліярацыйнага тэхнікума.

Да 80-годдзя рэвалюцыі 1905-1907 гадоў у Расіі

ХРОНІКА ПАДЗЕЙ

9 студзеня 1905 г.

7 студзеня сяляне Лепельскага павета Бельскай воласці вёскі Стараселле-2-е зрабілі напад на мой фальварак Багуславава і разбурылі жылы дом з намерам пазбавіць жыцця лясного стоража, які там пражываў.

Пасля прыбыцця ўрадніка 8 студзеня тыя ж сяляне публічна перад паліцыяй і стороннімі асобамі заявілі, што яны зробяць агульны пагром у маёнтку, дзе я пражываю. З прычыны такога настрою і пагроз прашу ваша правасхадзіцельства аб уцяхміранні бунту і таксама аб ахове майго маёнтка Белае Лепельскага павета.

Графіня Жазэфіна Забела.

1905 г. 16 студзеня. Тэлеграма пракурора Кіеўскай судовай палаты міністру юстыцыі пра ўсеагульную забастоўку і дэманстрацыю рабочых у г. Гомелі.

Зараз атрымаў дэпешу, што сёння ў Гомелі сабраўся натоўп да 2 тысяч чалавек з мэтай зрабіць усеагульную забастоўку, пры гэтым паліцыяй і войскам зроблена да 40 стрэлаў, параненых няма. Парадак адноўлены.

Данясенне горацкага павятовага спраўніка судоваму следчаму Магілёўскага акружнога суда па Горацкім павеце аб дэманстрацыі навучэнцаў мясцовых навучальных устаноў у г. Горках і забойстве навучэнцаў Ф. Ерафеева і П. Бруцара.

16 студзеня 1905 г.

Гэтага числа ў чатыры гадзіны дня ў г. Горках у канцы Смаленскай вуліцы натоўп дэманстрантаў... выхаванцаў мясцовых вучылішчаў ведамства земляробства і дзяржмаёмасцей у ліку каля ста чалавек зрабіў узброены напад на чыноў паліцыі, якія прымалі меры да прыпынення дэманстратыўнага іх шэсця з чырвоным сцягам. Пасля таго, як з боку дэманстрантаў пачуліся рэвальверныя стрэлы, накіраваныя на чыноў паліцыі, апошнія вымушаны былі таксама ўжыць зброю, прычым у перастрэлцы аказаліся забітымі вучань IV класа рамесных вучылішчаў Фама Ерафееў, 20 год, сын селяніна вёскі Аўсянкі Гарадзішчанскай воласці, і цяжка паранены вучань IV класа земляробчага вучылішча Пётр Бруцар, 21 года, сын селяніна Вендзенскага павета Ліфляндскай губерні.

Пасля дастаўкі ў бальніцу цяжкапаранены Бруцар памёр. Абодва забітыя і паранены жыхар мястэчка Горак, шавец Рызаў знаходзяцца ў мясцовай гарадской бальніцы. Аб выкладзеным паведамляецца вашаму правасхадзіцельству на разгляд.

1905 г. 20 студзеня. З дакладной запіскі в. а. Гродзенскага губернатара Віленскаму генерал-губернатару пра палітычныя забастоўкі і дэманстрацыі рабочых у Гродзенскай губерні.

Забастоўкі на гродзенскіх фабрыках, як і ў іншых месцах губерні, выкліканы, мяркуючы па ўсім, зусім не якімі-небудзь патрэбамі фабрычнага насельніцтва або незадавальнення іх умовамі свайго быту, а маюць чыста сацыяльна-палітычны характар... Паўсюдна наглядалася наяўнасць моцнай агітацыі...

З пастановы віцебскага губернатара аб прыцягненні да адказнасці агітатараў, якія заклікалі рабочых ільнопрадзільнай фабрыкі «Дзвіна» да забастоўкі салідарнасці з рабочымі Масквы і Пецярбурга.

24 студзеня 1905 г.

14 гэтага студзеня, а 8-й гадзіне вечара, на Віцебскай ільнопрадзільнай фабрыцы, размешчанай у раёне I стана Віцебскага павета, пры выхадзе рабочых пасля заканчэння работы, нейкая жанчына, дазнаннем не знойдзеная, разам з некалькімі мужчынамі спыняла рабочых і пераконвала іх спыніць работы, кажучы, што ў С.-Пецярбурзе, Маскве і іншых гарадах, а таксама і за мяжой не працуюць. Паліцэйскі ўраднік 2 участка Кляменцьеў, які заўважыў гэта, спрабаваў затрымаць жанчыну, але яе адбілі асобы, якія былі з ёю...

Паведамленне з газеты «Полесский листок» пра дэманстрацыю ў Магілёве.

Магілёў. 25-га студзеня Магілёўскай арганізацыяй Палескага камітэта на галоўнай вуліцы Магілёва была арганізавана дэманстрацыя з нагоды забойства безабаронных рабочых царскім войскам у Пецярбурзе і ўчынкаў мясцовай паліцыі. У дэманстрацыі прымалі ўдзел рабочыя, а таксама навучэнцы...

Паведамленне з газеты «Полесский листок» (1905 г. Люты. № 3) пра дзейнасць групы РСДРП у Оршы.

Апошнім часам работа ў нашым горадзе і яго ваколіцах стала прымаць больш правільны характар. Ідуць заняткі ў гуртках, часта арганізуюцца масоўкі. Так, за апошнія месяцы такіх масовак было 3. На іх былі зроблены прамовы: 1. пра маніфест царскі і ўказ ад 12 снежня; 2. пра пецярбургскія падзеі 9 студзеня; 3. пра сучасныя падзеі і значэнне дэманстрацый. Апошняе пытанне абмяркоўвалася і на масоўцы ў Барані, на якой было каля 60 рабочых з цвікова-дроцтавага завода. Усе гэтыя пытанні вельмі хвалююць масы, выклікаюць шмат новых пытанняў. І, натуральна, што кожную масоўку рабочыя пакідаюць бадзёрыя, поўныя веры ў сваю вялікую справу.

З рапарта інспектара Слуцкага гарадскога 3-х класнага вучылішча дырэктару народных вучылішчаў Мінскай губ. аб забастоўцы навучэнцаў Слуцкай гімназіі і прыняцці мер па недапушчэнні навучэнцаў да ўдзелу ў дэманстрацыях.

22 лютага 1905 г.

У дапаўненне да свайго рапарта, ад 18 лютага за № 42, маю гонар данесці вашаму правасхадзіцельству, што 21 лютага адбылася забастоўка вучняў мясцовай гімназіі. Вучні старэйшых класаў гімназіі пасля ранішняй малітвы дэманстратыўна адмовіліся ад заняткаў і натоўпам з гімназіі рушылі па вуліцах горада спачатку да жаночага пансіёна, дзе патрабавалі спынення заняткаў, потым — да даверанага мне вучылішча, а затым да духоўнага вучылішча, у якім таксама пагрозамі прымусілі спыніць заняткі. Паколькі я нападзадні ноччу ўжо даведаўся аб гэтым жа ад дырэктара гімназіі, а раней ведаў ад розных асоб аб забастоўцы, якая рыхтуецца, то каб не дапусціць вучняў даверанага мне вучылішча да ўдзелу ў дэманстрацыях, я вымушаны быў ноччу ж паміж 1—3 гадзінамі аб'ехаць усе вучнёўскія кватэры і адпусціць іх да сваіх бацькоў да 28 лютага.

1905 г. Сакавік 17. Паведамленне газеты «Вперед» пра камітэты і групы РСДРП, якія выказаліся за скліканне III з'езда.

У рэдакцыі газеты «Вперед» атрыманы звесткі (натуральна, няпоўныя), што за скліканне з'езда выказаліся камітэты: Тульскі, Варонежскі, Уральскі, Казанскі, Самарскі, Саратаўскі і Палескі; групы: Мінская, Бабруйская, Пермская, Екацярынінабургская, «Голас працы», Харкаўская і Кіеўская арганізацыя «Вперед».

Абавязковая пастанова віцебскага губернатара аб забароне дэманстрацый, мітынгаў і сходаў.

22 сакавіка 1905 г.

1. Сходы і зборы на вуліцах, плошчах, скверах і іншых месцах грамадскага і прыватнага карыстання — забараняюцца.

2. Прыпынкі публікі групамі на прыгаданых у арт. 1-м месцах, якія не выклікаюцца відавочнай неабходнасцю, а таксама прагулкі натоўпам — забараняюцца.

3. Сходы і зборы для нарад або дзеянняў, супярэчных дзяржаўнаму парадку і грамадскаму спакою, забараняюцца як у прыватных і грамадскіх дамах, так і на фабрыках, заводах, у майстэрнях і ў іншых публічных будынках, а таксама ў месцах грамадскага і прыватнага карыстання.

4. Усялякія дзеянні, накіраваныя на парушэнне дзяржаўнага парадку, грамадскага спакою і ўвогуле нармальнай плыні жыцця — забараняюцца.

5. Пры ўзнікненні вулічнага беспарадку збіранне старонняй публікі і ўмяшальніцтва яе ў дзеянні або распараджэнні паліцыі — забараняецца. Па першым патрабаванні паліцыі публіка, якая сабралася, павінна адразу ж разысціся.

6. Домаўладальнікі, арандатары, упраўляючыя і загадчыкі дамоў, кватэранаймальнікі, уладальнікі гасцініц, мэбляваных пакояў, заезджых дамоў, пастаялых двароў і т. п. устаноў, гаспадары фабрык, заводаў, майстэрань, або асобы, якія іх замяняюць, а таксама вартаўнікі, дворнікі і швейцары, дзе яны ёсць, абавязаны адразу ж паведамляць паліцыі аб усякай падзеі, якая здарылася ў занятых імі або ў іх валоданні надворных пабудовах і дварах, а роўна пра ўсялякія сходкі і аб падазроных і незнаёмых асобах.

7. Нашэнне агнястрэльнай і халоднай зброі, а таксама нажоў, касцетаў і т. п. забараняецца.

1905 г. 26 сакавіка. З данясення гродзенскага губернатара віленскаму ген.-губернатару пра рэвалюцыйныя дэманстрацыі ў г. Гродне.

Сёння, 26 сакавіка, каля 6 гадзін вечара ў г. Гродне на Мураўёўскай вул. сабраўся натоўп — прыблізна да 100 чалавек, які пачаў раскідваць пракламацыі і з чырвонымі сцягамі рушыў да Саборнай вул., дзе, убачыўшы набліжэнне паліцыі і казацкага раз'езда, разбегся ў розныя бакі. З натоўпу чуліся крыкі «ўра» і былі зроблены рэвальверныя стрэлы. Затрымана 9 чал., пры гэтым у 2-х з іх знойдзены рэвальверы і ў 2-х — баявыя патроны.

Дакладваючы аб вышэйвыкладзеным да ведама вашага правасхадзіцельства, лічу патрэбным нагадаць, што дэманстрацыі за апошні час сталі паўтарацца ў г. Гродне вельмі часта і для іх папярэджання ў маім распараджэнні няма неабходных сродкаў.

ТАК ПАЧЫНАЛАСЯ...

«Рэвалюцыі — святы прыгнечаных і эксплуатуемых, — пісаў У. І. Ленін. — Ніколі маса народа не здольна выступаць такім актыўным творцам новых грамадскіх парадкаў, як у час рэвалюцыі. У такія часы народ здольны на цуды, з пункту гледжання вузкай, мяшчанскай меркі пасцяпенаўскага прагрэсу».

Мітынгі, дэманстрацыі, забастоўкі, барыкады, сялянскія паўстанні, мяцяжы ў арміі і на флоце — вобразы гэтага свята.

Стан духоўнага ўздыму народных мас, іх палітычнага абуджэння, пераходу да адкрытага рэвалюцыйнага дзеяння выразна перадаюць дакументы, якія сёння публікуюцца. Праўда, у іх адлюстраваны толькі асобныя эпізоды рэвалюцыйнай барацьбы працоўных мас Беларусі ў перыяд са студзеня па сакавік 1905 г. Але гэта тыповыя эпізоды з тыповых сітуацый, якія раскрываюць найбольш характэрныя рысы і тэндэнцыі развіцця рэвалюцыі на яе першым этапе.

Вось паведамленні аб студзеньскіх стачках у Гомелі, Гродне, Віцебску, Магілёве. Гэта эпізоды шырокага руху (444 тысячы ўдзельнікаў) салідарнасці расійскага пралетарыяту з барацьбой пецярбургскіх рабочых. У Беларусі ён ахапіў 30 населеных пунктаў і выявіўся ў 26 стачках, 22 дэманстрацыях, 44 мітынгах і маніфестацыях (34 тысячы ўдзельнікаў). Гэта значыць, што пралетарыят Беларусі актыўна падтрымаў сваёй атакай на самадзяржаўе і капітал пралетарыят сталіцы, які пачаў адкрытую барацьбу. Як правіла, стачкамі і дэманстрацыямі кіравалі арганізацыі РСДРП. Характэрна, што гэта пацвярджаецца не толькі паведамленнямі сацыял-дэмакратычнай прэсы, але і паліцэйскімі данясеннямі.

Царскія ўлады ўжывалі ўсе захады для падаўлення палітычных выступленняў пралетарыяту. Асабліва важныя аб'екты былі ўзяты пад ахову войск і паліцыі. У сувязі з гэтым не ўдалося адразу арганізаваць забастоўкі ў чыгуначных майстэрнях. Але ўжо ў лютым чыгуначнікі — у агульным страі бастуючых.

Тыповай таксама з'яўляецца тэлеграма памешчыцы Забела віцебскаму губернатару з просьбай абараніць маёнтак ад сялян, якія бунтуюць. Такія тэлеграмы ў студзені—сакавіку ўжо нават не дзесяткамі, а сотнямі паступалі ў паліцэйскія ўпраўленні. Прычым, дапамагчы землеўладальнікам ужо не заўсёды хапала сілы і сродкаў. Пад уплывам рабочага руху сялянскія выступленні, у пачатку разрозненыя і стыхійныя, набывалі паступова масавасць, вастрыню, палітычную накіраванасць. Дакументы з былых паліцэйскіх дасье — гэта з бясспрэчнасцю пацвярджаюць. Усяго ў студзені —сакавіку ў Беларусі зафіксавана 53 сялянскія выступленні.

Хваляванні навучэнцаў гімназій і вучылішчаў — яшчэ адно сведчанне ўздыму рэвалюцыйнага руху, які ўцягваў у сваю арбіту шырокія пласты дэмакратычнай грамадскасці.

На чале студзеньска-сакавіцкіх выступленняў працоўных мас у Беларусі стаялі арганізацыі РСДРП. Умацаванне іх кіруючай ролі ў рэвалюцыйным руху праходзіла ў вострай унутрыпартыйнай барацьбе з апартуністычным меншавіцка-прымірэнчым крылом. Меншавікі спрабавалі сарваць скліканне III з'езда РСДРП, падпарадкаваць свайму ўплыву ўсе партыйныя арганізацыі. Паведамленне ў газеце «Вперед» аб падтрымцы Палескім камітэтам, Мінскай і Бабруйскай групамі рашэння аб скліканні з'езда адлюстроўвае як складанасць гэтай барацьбы ў Беларусі, так і канчатковы поспех яе. У хуткім часе ў падтрымку з'езда выказаўся і Паўночна-Заходні камітэт.

Галоўны вынік першага этапа рэвалюцыі заключаўся ў тым, што яна адразу прыняла масавы ўсенародны характар.

Матэрыял падрыхтавалі

Я. БРАВЕР, загадчык аддзела Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва БССР,

А. КАРОЛЬ, навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ.

МАРКСІСЦКАЕ СЛОВА ШУКАЛА ДАРОГУ

У пастанове «Актуальныя пытанні ідэалагічнай, масава-палітычнай работы партыі», прынятай на чэрвеньскім (1983 г.) Пленуме ЦК КПСС, падкрэслівалася, што «сіла ідэйна-выхаваўчай работы, як і палітыкі партыі ў цэлым, — у яе навуковай абгрунтаванасці, у апоры на самую перадавую марксісцка-ленінскую тэорыю, якая пастаянна развіваецца». Зразумела, што ў сувязі з важнымі задачамі ідэалагічнай работы на сучасным этапе надаецца вялікае значэнне прапагандзе і засваенню шырокімі коламі насельніцтва твораў Карла Маркса, Фрыдрыха Энгельса, Уладзіміра Ільіча Леніна, якія ва ўсе часы з'яўляліся важкай зброяй у пабудове новага грамадства.

Як вядома, першыя творы К. Маркса і Ф. Энгельса ў Расіі з'явіліся ў другой палове дзевятнаццатага стагоддзя, тады ж яны трапілі і на беларускую зямлю. Напрыклад, ужо ў 1875 годзе навучэнцы Мінскай і Слуцкай гімназій, а таксама Пінскага рэальнага вучылішча арганізоўваліся ў гурткі, у якіх знаёміліся з літаратурай атэістычнага і сацыяльна-рэвалюцыйнага зместу, што атрымлівалі з Пецярбурга і іншых гарадоў, а ў 1881 годзе першы том «Капіталу» К. Маркса вывучаўся ў рэвалюцыйных гуртках Гродні.

Гэта толькі асобныя факты, якія сведчаць аб тым, як хутка знаходзіла марксісцкае слова дарогу сярод рэвалюцыйна настроенай моладзі Беларусі. У кнізе А. Кузняева «Зброя рэвалюцыйнага пераўтварэння свету», якую толькі што выпусціла выдавецтва «Беларусь», іх прыводзіцца дзесяткі. І не выпадкова, бо сам падзагаловак выдання — «Распаўсюджванне твораў К. Маркса, Ф. Энгельса, У. І. Леніна ў Беларусі ў дакастрычніцкі перыяд», — вымагаў ад аўтара шырокай і рознабаковай гаворкі па дадзеным пытанні. А. Кузняеў сістэматызаваў багаты фактычны матэрыял, што дае магчымасць атрымаць поўнае і цэласнае ўяўленне аб цікавасці тагачаснага насельніцтва Беларусі да твораў класікаў марксізму-ленінізму.

У першых раздзелах «Абуджэнне» і «Спалучэнне навуковага сацыялізму з рабочым рухам» асаблівая ўвага звернута на паказ таго, як перадавыя людзі свайго часу пачыналі шукаць у творах К. Маркса і Ф. Энгельса, а потым і У. І. Леніна адказ на самыя надзённыя пытанні жыцця.

У сувязі з 80-годдзем першай рускай рэвалюцыі, якое сёлета адзначаецца ў краіне, асаблівую цікавасць уяўляе раздзел «У дні рэвалюцыі 1905-1907 гг.», у якім асабліва добра відаць, наколькі моцнай падтрымкай для пралетарыяту і іншых рэвалюцыйна настроеных пластоў насельніцтва ў барацьбе сталі творы класікаў марксізму-ленінізму, а таксама выданні, што друкавалі і прапагандавалі іх. У прыватнасці, газету «Вперед», у якой з 22 снежня 1904 года па 5 мая 1905 года было апублікавана каля 40 артыкулаў У. І. Леніна, атрымлівалі ў многіх гарадах Беларусі. Тое ж самае можна сказаць і пра газету «Пролетарий».

«У гады рэакцыі і рэвалюцыйнага ўздыму» і «Напярэдадні рашаючага штурму» — і заключныя раздзелы кнігі, з якіх бачна, як распаўсюджваліся творы К. Маркса, Ф. Энгельса і У. І. Леніна ў гады пасля першай рускай рэвалюцыі, калі царская Расія, перажыўшы рэакцыю, праз новы рэвалюцыйны ўздым ішла да Вялікага Кастрычніка.

У якасці дадатку ў кнізе змешчаны спісы твораў класікаў марксізму-ленінізму, якія мелі распаўсюджванне на тэрыторыі Беларусі ў дакастрычніцкі перыяд.

В. РУСАКОВІЧ.

КАБ ПАМЕНЕЛА ПРАБЛЕМ...

ПА СТАРОНКАХ ДЗІЦЯЧЫХ ЧАСОПІСАЎ

Мая цікавасць да часопісаў «Бярозка» і «Вясёлка» абумоўлена ў значнай меры чытацкімі інтарэсамі маіх дачок (адной 14 год, другой — 6). Я жадаю, натуральна, абудзіць у дзяцей любоў да прыгожага пісьменства, далучыць іх з маленства да нацыянальнай культуры.

Тое, што дзеці ўсіх рэспублік маюць магчымасць чытаць кнігі, часопісы, газеты на роднай мове, — агромністая заваёва сацыялізму. Мільёны рублёў выдаткоўвае дзяржава на выдавецкія патрэбы, тысячы кваліфікаваных работнікаў — ад рэдактараў да мастакоў і паліграфістаў — кожны дзень, як руплівыя пчолы, нясуць свой узятак у вулей агульнай справы. На жаль, не заўсёды якасны бывае мёд...

А зараз колькі непазбежных агаворак. Па-першае, я не прэтэндую на ўсебаковы і ўсеабдымны агляд нашых дзіцячых часопісаў. (І ці памятаеце вы такія, наогул, на старонках рэспубліканскай прэсы?) Падругое, гаворачы пра якасць літаратурнай прадукцыі ў «Бярозцы» і «Вясёлцы», нельга не ўлічваць стану ўсёй беларускай дзіцячай літаратуры. Што ні кажы, але матэрыялы часопісы бяруць не з неба, а з пісьменніцкіх партфеляў. Традыцыйна склалася, аб чым гаварылася аднойчы з пісьменніцкай трыбуны, што з гэтых партфеляў друкуецца практычна кожны напісаны твор (а ў дзіцячага пісьменніка, дадам, тым болей з прычыны іх нешматлікасці). Дык ці варта, як кажуць, з хворай галавы валіць на здаровую?..

За агаворкамі пойдуць пытанні. Каму адрасаваны часопіс «Бярозка»? Сярэднім школьнікам, гэта значыць — падлеткам. І не нейкаму там абагульнена-безаблічнаму падлетку, а нашаму сучасніку, акселерату, які далучаны сродкамі інфармацыі да ўсіх падзей, трывог і навацый свету. Што менавіта з жыцця, інтарэсаў, запатрабаванняў сучаснага школьніка адлюстравана ў мастацкіх творах, надрукаваных у часопісе?

Перада мной падшыўка за 1984 год. З немалой колькасці празаічных твораў тры апавяданні прысвечаны школьным будням. Іх асноўная якасць — падабенства між сабою, абумоўленае як безаблічнасцю стылю, так і прыкметным налётам маралізатарства. Вось якімі радкамі заканчваецца адно з іх (М. Зарэмба, «Гукавое пісьмо»): «Усё будзе добра, Генадзь! Цяпер мы не дадзім цябе ў крыўду. Разам будзем змагацца», — ...Голас настаўніка запаланіў Гену, прагнаў яго крыўды, сумненні, прымусіў усміхнуцца. І хлопчык адчуў незвычайную палёгку, нібы толькі што адолеў круты схіл высокай гары, з вышыні якой адкрыўся шырокі і светлы далягляд». У наяўнасці белымі ніткамі шыты дыдактызм. Аўтар нібыта баіцца, што без «шырокіх і светлых» далягляду мы няправільна зразумеем «крыўды і сумненні» «цяжкога» падлетка. Ды і не хвалююць штосьці гэтыя крыўды, бо яны несапраўдныя, прыгладжаныя і прычасаныя. Між тым, асмелюся сцвердзіць, кожны школьны дзень — ужо апавяданне, кожная чвэрць — аповесць. Трэба толькі пабыць побач з дзецьмі, паназіраць, зразумець сутнасць іх канфліктаў.

Разнастайнасці сюжэтаў у прозе мы, аднак, не назіраем. Апавядаючы пра неардынарныя, мужныя ўчынкі піянераў (у час пажару, шторму, пры сутычцы з браканьерамі і г. д.), аўтары задавальняюцца пераказам факта, не ствараюць характараў. Узнікае ўражанне другаснасці, вычарпанасці тэматычнага пласта. Хіба толькі ў А. Капусціна («Гром з яснага неба») ёсць спроба паглыбіцца ў псіхалагізм.

За нялёгкую задачу ўзяўся А. Косаў — напісаць апавяданні пра рэальнага, вядомага ўсім нам чалавека, лётчыка-касманаўта У. Кавалёнка. І не справіўся з ёю: сплаву біяграфічнага з мастацкім не атрымалася. Узровень фабулы аказаўся відавочна нізкім для ўвасаблення задумы.

Цяжка назваць апавяданнем і «Дом на беразе» М. Даніленкі (аб рабоце школьнага вучэбна-вытворчага камбіната). Гэта бясколерны экзерсіс на зададзеную тэму. Сама ж тэма працы ў святле школьнай рэформы набывае надзвычай актуальнае гучанне і чакае свайго ўвасаблення.

Я. Бяганская («Крутая лыжня») прасочвае зараджэнне першага, яшчэ неўсвядомленага пачуцця. Прызнацца, я была прыемна здзіўлена. Уражвае сам факт звароту да тэмы, якой пісьменнікі старанна пазбягаюць.

Вось тыя абсягі сучаснага жыцця падлеткаў, што асвятляюцца ў часопісе. Не абсягі — вузкія палоскі. Узаемаадносіны са старэйшымі, самавыхаванне, абавязкі і правы — неўзараная цаліна ў літаратуры для дзяцей. Нагадваецца, як адзін сталага веку чалавек сказаў пра аўтараў «Бярозкі»: «Яны пішуць пра маё дзяцінства». Так, яны пішуць у асноўным пра яго і сваё дзяцінства. У горшым выпадку — канструіруюць літаратурныя схемы.

Я не стаўлю перад сабой задачу эстэтычнага аналізу большасці са змешчаных твораў (сярод іх ёсць і вартыя падрабязнага разгляду). Пры мастацкай нераўназначнасці мяне ўсё ж непакоіць іх тэматычная, стылявая і жанравая аднастайнасць, нейкая бяскрыласць, анемічнасць. У прыватнай гаворцы мой калега, вядомы драматург, неяк прызнаўся: гледачы плачуць на спектаклях у тых мясцінах, дзе плакаў пры напісанні ён сам, і смяюцца, дзе ён смяяўся. Ці маглі б сказаць нешта падобнае празаікі, што пішуць для дзяцей?..

Прыкладна палова надрукаваных твораў вяртае нас да падзей Вялікай Айчыннай вайны. Іх аўтарам у нейкім сэнсе лягчэй: яны могуць з поўным правам абапірацца на ўражанні дзяцінства. Але неабходнасць успамінаць не выключае неабходнасці асэнсоўваць і абагульняць. А гэтага якраз і не хапае. Ваенная тэма сама па сабе не гарантуе высокіх ідэйна-мастацкіх якасцей твора. Ні кніга, ні кінафільм, ні спектакль, звернутыя да гераічнага мінулага і прызначаныя дзецям, не будуць выконваць выхаваўчай функцыі, калі не пазначаны талентам, фантазіяй, не сагрэты душэўнай цеплынёй.

З шэрагу твораў, прысвечаных гераізму савецкага народа, я вылучыла б аповесць Хведара Жычкі «Вышэй галовы, арляняты» (№№ 7 і 8). Пры некаторай кампазіцыйнай расплывістасці аповесць прываблівае займальнасцю зместу, яскравасцю дэталей, жывасцю стылю. Пісьменнік умее некалькімі штрыхамі стварыць характар героя. Ціт Качан, мастак-самавучка, пакутуе з той прычыны, што не можа адмыслова намаляваць мора і горы—ніколі не бачыў. У яго сябра Кузі Пінчука наконт малявання праблем няма: «Белыя — ворагі, чырвоныя — свае. Вораг павінен быць агідны, свой — прыгожы». Горы, адпаведна, калі свае, — ружовыя ці блакітныя, а калі варожыя — маляваць іх трэба цёмнай фарбай. Падлеткі ў творы натуральныя, не прыдуманыя і ў гульнях, і ў сялянскай працы, і ў сваёй нянавісці да ворага. Цікава чытаецца эпізод, як яны робяць у кузні «кошку», трохпалы якар, каб выцягнуць з калодзежа нямецкую вінтоўку.

Выклікае сімпатыю дзед Ахрэм. Гэта ён расказаў дзецям паданне пра Вашчылаў камень і ўпарта шукае схаваны скарб. На пытанне старшыні, навошта яму золата, адказвае зусім шчыра: «Яшчэ адну трохтонку для калгаса купім». Прывяду кавалачак тэксту, як характэрны ўзор мовы і стылю твора. «— Каб вы жыватамі па печы ездзілі! — кляне фашыстаў стары Ахрэм. — Гэта ж стаяў у печы гаршчэчак з недаедзенай бабкай, дык ён выдраў яе кіпцямі, як сабака лапай. «Гут, гут!» — і ў ранец...»

Менш удаўся аўтару вобраз галоўнай гераіні — піянерважатай Ані. Яна намалявана, згодна з густам знаёмага нам Кузі Пінчука, ружовай фарбай і без адценняў, і ўспрымаецца болей як сімвал, чым як мастацкі вобраз.

Часопіс адзначыў 40-годдзе вызвалення Беларусі не толькі мастацкімі творамі на ваенную тэматыку, але і вялікай колькасцю публіцыстычных матэрыялаў: артыкуламі, нарысамі, допісамі чытачоў. Пастаяннай з'яўляецца рубрыка «Баявы лісток», аздобленая здымкамі ваеннай хронікі. Спадабаецца падлеткам, асабліва хлапчукам, і фотаматэрыял «Зброя перамогі».

Барацьба за мір, будаўніцтва новага жыцця ў Афганістане, дружба народаў, мастацтва, спорт — вось тэмы, якія знаходзяцца пад неаслабнай увагай работнікаў рэдакцыі. Сучасна выкладзены і прыемна чытаюцца навукова-папулярныя артыкулы аб метэарытах, бурштыне, прымяненні ў навуцы магнітнай вадкасці. Пажадана было б прыцягнуць да супрацоўніцтва псіхолагаў, сацыёлагаў, педагогаў, юрыстаў. Можа, усе яны, узяўшыся дружна, ліквідавалі б прагалы, існуючыя ў літаратуры для гэтага ўзросту. Менавіта публіцыстыка дапамагае часопісу, які адсвяткаваў сваё 60-годдзе, паспяваць за часам, ажыццяўляць комплекснае выхаванне падрастаючай змены.

Шкада, што для школьнікаў не пішуць маладыя. Імён празаікаў з пакалення трыццаці-саракагадовых я не ўбачыла. (Гэта пакаленне зусім чамусьці не прыцягнута да супрацоўніцтва з часопісам). Паэтам шанцуе больш: змешчаны вершы С. Панізніка, В. Жуковіча, В. Гардзея, а таксама маладзейшых В. Шніпа, А. Глобуса, Г. Булыкі, У. Сцяпана. Праўда, тут не абышлося без выдаткаў. Пры ўсім жаданні я не здолела знайсці паэзіі ў многіх вершах М. Шайбака (чытачоў здагадаліся папярэдзіць, што ён працуе ў жанры хоку).

У белай місе,
Нібы вока восені,
Чырвоны яблык.

Зрокава чырвонае з белым выглядаюць прыгожа. Але вока ў місе, ды яшчэ чырвонае?!

У 8-ым нумары творам Л. Паўлікавай адкрылася рубрыка «Першае апавяданне ў «Бярозцы», і гэта абнадзейвае. Прыток новых сіл, несумненна, зрушыў бы дзіцячую літаратуру з інерцыйнай каляіны і паспрыяў бы часопісу. А пакуль існуе рэальная небяспека, што складаны свет юнага, задзірыстага і адначасова няўпэўненага ў сабе чалавека будзе сам па сабе, а часопіс — сам па сабе. Не адбудзецца кантакту, не зацікавіцца падлетак, не прыме да душы тое, чым яго ў дадзены момант «кормяць» — эфект нулявы. Я не за тое, каб мы прыніжаліся перад дзецьмі і падсоўвалі ім толькі ласыя кавалачкі — хоць бы спажывалі. Не! Але не ўлічваць іх узроставых асаблівасцей і слабасцей, іх псіхалогіі— нельга.

А цяпер — пра «Вясёлку», з якой сустракаюся кожны месяц. Адны нумары атрымліваюцца больш чытэльныя, другія — менш, але заўважаецца наступная тэндэнцыя: выданне для малодшых школьнікаў імкнецца выглядаць не па ўзросце сур'ёзным і сталым. Яно не толькі шырока адзначае ўсенародныя святы (інакш і быць не можа), яно памятае і пра ўсе юбілейныя даты пісьменнікаў, з-за чаго нагадвае часам каляндар. Напрыклад, у студзеньскім нумары за мінулы год адзначаны юбілеі К. Буйло, А. Гайдара, А. Якімовіча і Г. Шыловіча. Няблага было б улічваць спецыфіку часопіса. Пераказ біяграфій і літаратуразнаўчыя выкладкі тут недарэчы.

На жаль, «Вясёлка» абмежавала сябе вузкімі ўзроставымі рамкамі: ад сямі да дзесяці год. Пра дашкольнікаў яна забываецца, адсылаючы тых да «Веселых картинок». Большасці матэрыялаў малыя ўспрыняць не ў стане. Ды і акцябрат, для якіх выходзіць часопіс, лічыць ці не маленькімі дзядкамі. Вось, для прыкладу, першыя старонкі сёмага нумара. Харошы, варты павагі намер: пазнаёміць дзяцей з імёнамі паэтаў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай. Паглядзім, як намер ажыццяўляецца. Зверху — амаль акадэмічная ўрэзка, ніжэй — вялікія здымкі на фоне ордэнскай стужкі, пад імі — вершы. Дарослыя вершы дарослых паэтаў. Разварот, такім чынам, можна перакінуць у «Бярозку», і мы не заўважым падмены. Ці трэба такое вось узроставае «змыканне»? Ці трэба дзецям голая інфармацыйнасць, хай сабе і пад гучнай рубрыкай «Падарожжа ў пяцігодку»? Ці не лепш было б даць болей месца фантазіі і знаходлівасці мастакоў? (Тым больш, што мастацкае афармленне нараканняў не выклікае). Мала гульняў, маляванак, загадак, пацешак. Мала гумару: усяго паўстаронкі «хвілінак-весялінак». А гумар для дзіцячага ўспрыняцця — што дрожджы для цеста. Я памятаю, як ажывалі вучні пры чытанні «Міколкі-паравоза» М. Лынькова, як да сэрца прымалі «Мы з Санькам у тыле ворага» і «Мы — хлопцы жывучыя» І. Сяркова.

Разумею, што мае заўвагі шмат у чым па-чытацку суб'ектыўныя. Увогуле ж узровень белетрыстыкі ў «Вясёлцы» вышэйшы, чым у «Бярозцы», магчыма, за кошт паэзіі. Радуешся, калі сустракаешся на старонках з вершамі В. Віткі, Э. Агняцвет, С. Шушкевіча, В. Вольскага, А. Грачанікава, супрацоўнікаў часопіса К. Камейшы і М. Маляўкі і многіх іншых. Калі пішацца, як дыхаецца, тады нараджаюцца вось такія запамінальныя радкі (верш М. Лужаніна «Снег»):

Ветру нудна не было,
Накруціла, намяло:
А далёка,
А глыбока,
А высока,
Аж да вокан!
І на полі,
І на голлі,
Дзе ні глянеш,
Дзе ні станеш, —
Ай-яй-яй! Які сняжок:
Што ні ступіш, дык слядок.

Проза, як і належыць, прадстаўлена малымі жанрамі. Яе героі — часцей за ўсё вясковыя дзеці альбо маленькія гараджане, што прыехалі ў вёску на лета. (Пра вясковыя карэні беларускай літаратуры шмат пісалася нашымі крытыкамі). Малую Насцечку з аднайменнага апавядання Б. Сачанкі ніхто не прымушае брацца за работу. Аднак, бачачы рупнасць дзеда і бабулі, яна адчувае неўсвядомленую патрэбу ім дапамагаць, быць карыснай.

Неназойліва, далікатна навучаюць дзяцей добраму творы У. Юрэвіча, П. Місько і іншых. Невялікі памер вымушае ад пісьменніка высокага ўзроўню майстэрства. Усялякая штучнасць вылазіць з кароткага твора, як шыла з мяшка. Так здарылася з абразкамі В. Хадатовіча «Цік-так, цік-так...» і «Арэлі». У першым дзяўчынка дзівіцца, чаму не цікае намаляваны гадзіннік, у другім—нясе ў талерцы арэлям кашу — каб падсілкаваліся. Выратаваць абразкі мог бы гумар, ды аўтар, на жаль, да яго не звярнуўся.

На старонках абодвух часопісаў побач з прафесійнымі пісьменнікамі нярэдка друкуюцца выпадковыя аўтары. Любоў да дзяцей і цяга да роднай літаратуры выклікаюць, безумоўна, павагу, але не даюць яшчэ падставы выступаць у рэспубліканскім друку. Для дзяцей, памятаючы словы класіка, трэба пісаць, як для дарослых, толькі лепей. Зрэшты, робіцца гэта, пэўна, не ад добрага жыцця. Мала, да крыўднага мала імён маладых! Гэта праблема не толькі беларускай літаратуры. С. Міхалкоў, выступаючы на пленуме праўлення Маскоўскай пісьменніцкай арганізацыі, казаў: «Наша задача — ствараць для самых юных чытачоў творы, якія былі б вартыя вялікіх тыражоў. Са смуткам трэба сказаць, што ў літаратуры для маленькіх і прыток новых сіл, на жаль, малаваты».

Мушу паўтарыць на заканчэнне ўжо неяк выказанае: кожны здольны пісьменнік павінен лічыць сваім грамадзянскім абавязкам напісаць хоць бы адну добрую кнігу для дзяцей. Возьмем жа прыклад з нашага народнага пісьменніка Кандрата Крапівы (глядзіце шосты нумар «Бярозкі»). Тады, можа, паменее праблем і ў «Бярозкі», і ў «Вясёлкі», і ва ўсёй нашай дзіцячай літаратуры.

Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ.

КНІГАПІС

А. ВЯЛЮГІН. Выбраныя творы ў двух тамах. Мінск. «Мастацкая літаратура», 1984.

У гэты двухтомнік увайшло лепшае з напісанага лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы Анатолем Вялюгіным.

У першым томе змешчаны вершы, балады, пераклады паэтычных твораў. У другім, апрача перакладаў, надрукаваны паэмы, кінасцэнарыі. Асобнае месца тут займаюць эсэ, партрэты сяброў, у якіх апавядаецца пра жыццёвы і творчы шлях Аляксея Пысіна, Антона Бялевіча, Пятра Глебкі, Максіма Танка, Кастуся Кірэенкі.

У другім томе таксама і аўтабіяграфія пісьменніка — «Пад ветразем у полі. Старонкі жыцця».

А. РОВІЧ.

М. ПАСЛЯДОВІЧ. З табою побач. Аповесць. Мінск. «Мастацкая літаратура», 1984.

Гэтая кніга — апошняя, якую пабачыў у карэктуры Макар Паслядовіч.

У цэнтры аповесці Антон Карніцкі. Пісьменнік за правобраз галоўнага героя ўзяў выдатнага сына беларускага народа Героя Савецкага Саюза і Героя Сацыялістычнай Працы Кірылу Арлоўскага.

Д. МІХАЛЕВІЧ.

А. ВОЛЬСКІ. Сонца блізка ўжо зусім. Казкі і вершы. Мінск, «Юнацтва», 1984.

Вось ужо трыццаць гадоў працуе Артур Вольскі ў цяжкім і важным жанры — у галіне дзіцячай літаратуры. Працуе плённа і спорна. Аб гэтым сведчаць яго шматлікія зборнікі для дзяцей.

Новы зборнік казак і вершаў склалі лепшыя творы пісьменніка, напісаныя раней і апошнім часам.

А. ІВАНОЎ.

НА ПЕРАКАЦЕ

ПАМІЖ «Дваццаццю хвілінамі з Немезідай» і «Перакатам» (другім і трэцім на сёння празаічнымі зборнікамі В. Іпатавай) — адлегласць, якая пройдзена няпроста, праз адольванне, перакочванне праз падводныя камяні, што здольны стаць небяспекай на шляху пасталення творцы. На перакаце як нідзе навідавоку і чысціня плыні, і тое, што замінае яе празрыстасці; перад перакатам — назапашванне творчай энергіі і настойлівая патрэба азірнуцца на пройдзенае. Перадусім, на апавяданне, якое дало назву папярэдняму зборніку і ўключана аўтарам у апошнюю кнігу. Сапраўды ёсць сэнс правесці гэтыя дадатковыя дваццаць хвілін сам-насам з суровай багіняй, паслухаць яшчэ раз нервовы, экспрэсіўны маналог гераіні.

Тут няпэўнае, зыбкае нечакана перапыняецца важкай, як свінцовая пячатка, фразай; тут думка вавёркай скача з галінкі на галінку; рацыянальная развага часам патанае ва ўсплёску эмоцый. Але неўпарадкаванасць сюжэта ўяўная. Ён падначалены «ёй», арганізуецца яе, гераіні, асобай. Але хто яна сама?

Яе клічуць Стэлай, што азначае «зорка». Няроўнае, ліхаманкавае яе мігценне. Гульня святла і ценяў, кантрастаў і паўтонаў. Драпежніца з наманікюранымі кіпцямі, якая хапае ўсё ад жыцця, якой яна часам выстаўляе сябе самую ў параксізме самаабвінавачвання? Дылетантка, аўтарка крытычных артыкулаў па кінамастацтве, якія, па ўласнай жа апэнцы, «помесь дамскага шчэбету і кіназнаўчай тэрміналогіі»? Але папрокі, кінутыя сабе самой, самаабвяргаюцца. Патрабавальнасцю да сябе заваёўваецца права меркаваць аб асяроддзі, аб людзях, з якімі даводзіцца сустракацца. Судзіць з пазіцыі свайго болю, сваёй, хай сабе і прыватнай, драмы.

У мігценні святла, якім зорыць свядомасць Стэлы, нібыта імгненнай фотаўспышкай выхопліваюцца абліччы астатніх персанажаў. Юрка Амельчанка, «ён», «белазубы кучаравы блазен», высакародны Рамэа ў абшарпаных джынсах, фігура хай сабе і крышку прыдуманая, прыўзнятая на катурн, але такая патрэбная дзеля напружанай працы «яе» сумлення. Яе мама, нястрымная ў сваім жаданні ў што б то ні стала, любымі сродкамі ладзіць «дабрабыт» уласнай дачкі. Муж, «самы выпрасаваны, задаволены», — і гэта ўсё аб ім...

Рацыянальнае ў творы спрасавана ў ёмістыя формулы. Формула таленту, напрыклад: «Гэта нібы нейкае акенца, праз якое прырода дыктуе нам свае таямніцы і адкрыцці». Вусны гераіні — не рупар чужых думак, манера афарыстычна выказвацца пасуе да яе ўнутранага «я», і таму такія згусткі рацыянальнага зместу не выглядаюць ў творы іншароднымі целамі.

Цяжка вылічыць ступень аднадумства аўтаркі і гераіні, тую мяжу, за якой канчаецца «я» творцы і пачынаецца «я» персанажа, ды і ці варта ставіць паміж імі нейкі шлагбаум? Адзначым толькі высокую ступень умення ўжыцца ў вобраз прыдуманага чалавека, перадаць тое жаночае, імпульсіўнае, надта ўспрымлівае да самых складаных этычных рэбусаў жыцця, якое заўважаеш, акрамя В. Іпатавай, у шмат якіх прадстаўніц нашай сучаснай літаратуры, асабліва ў паэтак.

В. Іпатава піша ў жанры малога эпасу. Мабыць, таму такое і непаслухмянае «я» яе гераінь перад спробамі атаясаміць яго з «я» аўтаркі, што эпічнае тут у сімбіёзе, у шчыльным перапляценні з лірычным. І не ў тым прычына, што прозай загаварыла паэтэса. Сакрэт у абставінах мастацкага ўжывання. Мастак умее і прыблізіць, і аддаліць ад сябе створаны вобраз. І тое няўлоўнае, чым лірызуецца празаічны матэрыял, бярэ вытокі, здаецца, ужо ад «яе» (гераіні), яе індывідуальнасці. Ствараецца «яе» малы свет, мікракосм.

Правінцыяльны гарадок, які небагата займае месца ў прасторы, затое бязмежна распасцёрся ў часе, у гісторыі. Уздымаемся на ўтравелы груд замчышча, амаль згадваем знаёмыя абрысы рэшткаў старадаўняга збудавання, і імя горада гатова ўжо сарвацца з вуснаў, але... гэта ўжо іншы горад, прыдуманы аўтарам дзеля таго, каб правесці па яго бруку пяшчотнае, з далікатнай, тонкай душой стварэнне. «Апоўначы, калі б'юць куранты». Гэта апавяданне настрою, а апошні залежыць галоўным чынам ад таго, што думае, гаворыць і робіць «яна» — дыхае водарам разнатраўя ля камянёў былога замка, па-свойску гутарыць з новым знаёмым — малым Антакам, прыгублівае з кубка гаркавае казінае малако. Твор зачароўвае, пакуль жывіцца гэтым настроем, але магія развейваецца якраз тады, калі на сцэне з'яўляецца «ён», — каўбой на матацыкле, чый гіпертрафіраваны эгаізм неяк навят штучна выстаўляецца напаказ усяму свету.

Перад з'яўленнем «яго» «яна» бачылася нібыта агорнутай флёрам задумення і смутку, пасля — засталася проста пакрыўджанай. Лірыка выціснулася меладрамай. Але не тою, што выклікае слёзы, бо гэта ўжо — па-за настроем гераіні, якой мы ўжо звыкліся яе ўяўляць. Не проста адмаўленне ад арганічнага ўжывання ў вобраз — яшчэ і псіхалагічная недакладнасць: як яна, такая непадобная да традыцыйнай «беднай Лізы», з яе тонкім адчуваннем таямніц чужой душы, раней не здолела разгледзець зла ў антыгероі, што проста б'е ў вочы?

Настраёвасць парушылася тэатральным прыёмам, ужытым дзеля знешняга эфекту. В. Іпатавай лепш удаецца перадаць канфлікт іншага роду — сутыкненні, супярэчнасці ўнутры чалавечай свядомасці. Кожная з лепшых яе навел — яшчэ і драма, драма найперш душы, думак і пачуццяў, і ў гэтым выпадку ўжо не лішнія і знешнія элементы тэатральнага дзейства, як у апавяданні «Мышка ў капелюшы».

Апавядаецца аб прэм'еры ў тэатры юнага гледача, і само дзеянне разгортваецца, нібыта спектакль. На сцэне (і за кулісамі) робяць кожны сваё: Прынцэса, Пачвара, Прынц. А рэжысёрам над імі—зноў «яна». Яна — Багуміла, выпускніца тэатральнага, з тых прыезджых правінцыялак, якія натоўпамі шукаюць свайго прызвання ў мастацтве і, бывае, знаходзяць — нямногія, такія вось, як гэта. Напачатку яны няўпэўненыя і няўмелыя, але апантанасць і адоранасць бяруць сваё — і прыносяць поспех. Яшчэ адно амплуа жаночага вобраза.

«Яна» дужая, бо трымае ў руках усе ніці дзеяння, таго, што на тэатральнай сцэне, але бывае бездапаможнай, разгубленай, калі спектакль саступае месца непрыдуманаму жыццю, не заўсёды спагадліваму ў сваіх складанасцях да такіх вось навічкоў.

У кантэксце яе ўсхвалявянага маналога-споведзі згладжваюцца і апраўдваюцца ўсе тэатральныя, навят меладраматычныя метамарфозы, што адбываюцца з тымі, хто і ў жыцці выконвае нечую ролю. Таму мы з гатоўнасцю суперажываем катастрафічнае развянчанне Прынца, хоць сюжэтна рэалізавалася яно далёка не новым сцэнічным сродкам — у выніку знянацку падслуханай размовы.

Герэіні розныя і ў нечым падобныя, нібы сёстры, ды інакш і быць не можа, бо кожная з іх — тварэнне аднаго аўтара.

Шкада, але не ўсе амплуа ге-

В. Іпатава. Перакат. Апавяданні. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1984.

АПАВЯДАННІ ПРА КАМЕННЫ ВЕК

Выдавецтва «Народная асвета» выпусціла кніжку вядомага беларускага археолага Міхася Чарняўскага «Страла Расамахі». Кніжка разлічана на дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту, але яе прачытаюць з цікавасцю і дарослыя людзі.

Напісана яна з добрым веданнем справы, літаратурнаю моваю, проста і даступна. Кніга ўяўляе сабою зборнік кароткіх нарысаў пра жыццё людзей каменнага веку на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Толькі два ці тры нарысы датычаць іншых раёнаў нашай краіны.

Тэматычна ўсе нарысы падзяляюцца на тры часткі, якія адпавядаюць перыядызацыі каменнага веку, вызначанай вучонымі-археолагамі: старажытны каменны век (палеаліт), сярэдні каменны век (мезаліт) і новы каменны век (неаліт). Такім чынам, паступова, паводле храналагічнага прынцыпу, апавядаецца пра жыццё людзей той аддаленай ад нас эпохі, пра авалоданне імі агнём, пра гаспадарчую дзейнасць людзей — збіральніцтва, паляванне, рыбалоўства, а пазней земляробства, жывёлагадоўлю. Гаворка вядзецца ненавязліва, без залішняй дыдактыкі.

Аўтар да кожнага нарыса дадае інфармацыю: колькі год назад і дзе менавіта адбывалася ці магла адбывацца тая ці іншая падзея. Пры гэтым у большасці выпадкаў М. Чарняўскі дакладна лакалізуе месца здарэння, адносячы яго да вядомых беларускім археолагам і самому аўтару (там, дзе ён сам вёў раскопкі) паселішчаў чалавека каменнага веку.

Таму кожнаму нарысу ўласціва гістарычная верагоднасць, падмацаваная навуковай дасведчанасцю аўтара.

У нарысах апавядаецца і пра тое, як чалавек навучыўся здабываць агонь, як палявалі на мамонта, як з'явіліся ўзоры першых мастакоў каменнага веку, як жылі ў старажытных буданах. Цікава напісана пра авалоданне лукам і стрэламі (нарыс «Страла Расамахі»), пра асенняе паляванне, пра вынаходніцтва глінянага посуду, пра тое, як рабіліся чаўны, як збіралі зёлкі, пра абрад пахавання і г. д. Адным з самых цікавых з'яўляецца нарыс пра шахцёраў каменнага веку, што ў капальнях здабывалі крэмень для прылад працы і зброі.

М. Чарняўскі. Страла Расамахі. Для сярэдняга школьнага ўзросту. Мінск, «Народная асвета», 1985.

ЗАГЛЫБЛЯЮЧЫСЯ Ў СУТНАСЦЬ

«Жывая памяць народа». Ужо ў самой назве кнігі Таісы Грамадчанка бачыцца той зыходны пункт, з якога даследчыца падыходзіць да разгляду творчасці Івана Чыгрынава. Пішучы нарыс пра здзяйсненні і набыткі пісьменніка, яна асноўную ўвагу звяртае на тое, як у апавяданнях і раманах І. Чыгрынава адлюстроўваецца тэма Вялікай Айчыннай вайны, як аўтару іх, што перажыў суровыя выпрабаванні хлапчуком, удалося сказаць сваё, непаўторнае слова пра ўсенародны подзвіг, паказаць барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі той вялікай, ачышчальнай сілай, якая яшчэ раз падкрэсліла трываласць савецкага ладу жыцця, непераможнасць марксісцка-ленінскіх ідэй.

Творчасцю І. Чыгрынава Т. Грамадчанка цікавіцца даўно. Некалькі гадоў назад яна паспяхова абараніла кандыдацкую дысертацыю пра творчасць пісьменніка, неаднаразова выступала ў друку з рэцэнзіямі, артыкуламі. Таму ёсць усе падставы гаварыць пра нарыс «Жывая памяць народа» не як пра першую спробу асэнсавання таго, што з'явілася з-пад пяра І. Чыгрынава, але як пра першы вынік вывучэння яго творчасці. Як гэта бачна з кнігі, даследаванне гэтае канцэптуальна-цэласнае, вытрымана ў асноўным на высокім ідэйна-мастацкім і навукова-тэарэтычным узроўні.

Паколькі ў аснову нарыса пакладзена кандыдацкая дысертацыя, ён пабудаваны паводле традыцыйнай у такіх выпадках схемы: уступ, асноўная частка, заключэнне. Даючы ва ўступе агульнае ўяўленне аб жыццёвым і творчым шляху пісьменніка, крытык адзначае, што, хоць колькасна празаікам напісана не так і шмат (каля трыццаці апавяданняў, тры раманы), творчасць яго—«яркая старонка ў сучаснай беларускай прозе. Лепшыя апавяданні і раманы пісьменніка вылучаюцца глыбокім пранікненнем ва ўнутраны свет чалавека-працаўніка, значнасцю пастаўленых праблем, высокім мастацкім майстэрствам. І. Чыгрынаў як пісьменнік ужо выявіў адметнасць, самабытнасць свайго творчага «я», знайшоў сваё месца ў літаратуры».

Уся гаворка Т. Грамадчанкі і падначалена таму, каб паказаць чытачу адметнасць, своеасаблівасць таленту І. Чыгрынава, вызначыць, у чым жа сапраўды заключаецца самабытнасць яго творчага «я». Даследчыца правільна зрабіла, вылучыўшы ў гэтай размове два асноўныя напрамкі, адпаведна стварыўшы ў нарысе два самастойныя раздзелы, што ўзаемадапаўняюць адзін аднаго—«Іван Чыгрынаў-навеліст» і «Іван Чыгрынаў-раманіст».

І ў першым, і ў другім раздзеле, зразумела, аўтар не замыкаецца толькі ў коле тых праблем, якія вырашае проза І. Чыгрынава. Робіцца выхад — у асноўным паспяхова, хоць часам даецца ў знакі і спроба «падагнаць» той ці іншы твор, каб падмацаваць свае вывады і абагульненні, — і на напісанае іншымі празаікамі. У прыватнасці, Т. Грамадчанка звяртаецца да апавяданняў Вячаслава Адамчыка, Барыса Сачанкі, Мі-

Т. Грамадчанка. Жывая памяць народа. Нарыс творчасці Івана Чыгрынава. Мінск. «Навука і тэхніка», 1984.

раінь вытрымліваюць выпрабаванне непадатлівым жыццёвым матэрыялам — якраз тады, калі парушаецца тая самая іх унутраная еднасць з мастаком. У апавяданні «Размова» маналог стракаціць прастамоўнымі выразамі, гэта банальная жальба кабеты, пакрыўджанай жыццём і найперш мужам, прычым ужыванне тут саступіла месца стылізацыі, прыпадабненню мовы да прастарэкавання жанчыны невысокага інтэлекту. Ад гэтага твор не выйграе. Няўдалай здаецца нам і спроба аўтаркі ўвайсці ў свядомасць «душы-хлопца», які мовіць на слэнгу, ужо не зусім нават сучасным («уколваць», «продак»), тым больш навязваць яму апрабаванае белетрыстыкай выйсце ад усіх сямейных неладоў — канечне ж, туды, на вялікую будоўлю (апавяданне «...А цягнік грукоча»).

Эфект мастакоўскага ўжывання ў вобраз мінімальны, калі персанаж прыгнечаны спудам сканструяванага сюжэта, кідкага вонкава, але не больш (як у апавяданнях «Мой брат Цімка», «Зачараваная півоня», «На дрызіне па шчанюка»).

Складана гаварыць пра апавяданні і з цыкла «Гул далёкіх стагоддзяў». Гістарычная тэма сёння для літаратуры і жаданая, і выйгрышная, але разам з тым і адказная, і ад твораў, прысвечаных ёй, чакаеш немалога. Большага, чым ілюстрацыя да старонкі падручніка беларускай літаратуры, той, дзе апавядаецца пра Паўлюка Багрыма («Ваўкалакам абярнуся»); большага, чым абразок жыццябыцця з часоў Рагвалода або Усяслава Чарадзея. Зразумелае і бясспрэчна апраўданае жаданне аўтаркі ўжыцца ў абставіны той альбо іншай эпохі. Але менавіта ад В. Іпатавай чакаеш не адных дыхтоўна выкананых дэкарацый, а выявы свядомасці людзей, дзеля якіх створаны гэты жывапісны інтэр'ер.

Нетры пракаветнай пушчы, дзе палюе на лася князь Рагвалод, толькі тады ўяўляюцца як нешта рэальнае, калі з'яўляецца «яна» (апавяданне «Святаслава»). Толькі побач з «ёй» на твары драўлянага Дажбога з'яўляецца жывы выраз. Святло ідзе ад дзяўчыны, той, якую напаткаў злы лёс славутай Бандароўны. Больш бы аўтарскага суперажывання, і «гул далёкіх стагоддзяў» чуўся б яшчэ выразней.

«Жывасці», зямной канкрэтнасці хацелася б бачыць у вобразе таямнічай палачанкі (апавяданне «Расанка»); дзеянне толькі завабіла хараством, экзотыкай падання — і прамільгнула, не пакінуўшы ўражлівага ўспаміну.

...Вось так, здаецца, абмерана ўздоўж, ушыркі і ўглыб рэчышча прозы В. Іпатавай, здаецца, і сакрэт лепшых яе твораў знойдзены, і цяпер застаецца апошняе — даць традыцыйны крытычны рэцэпт. Нешта параіць. Ад нечага засцерагчы. Бо вунь колькі падводных перашкод тоіцца «на перакаце». І тут сумненне: а ці патрэбен ён, такі рэцэпт?

Мы дазволім сабе палюбавацца «ёю» — гераіняй прозы В. Іпатавай. Але не варта на падставе гэтага захаплення навязваць аўтару спакуслівую задуму — бясконца папаўняць галерэю жаночых вобразаў, бо партрэты могуць зліцца ў адзін твар.

У апавяданні «Перакат» ужо не гераіня, а герой, хлопчык, пакутуе ад людской чэрствасці. У жанчыны, якая дала яму жыццё, не знаходзіцца ў сэрцы цеплыні, якая б сагрэла ягонае існаванне, а невылечная хвароба пагражае гэта жыццё адабраць. І раптам прыходзіць збавенне — у зліцці, у еднасці з прыродай, чые таямнічыя сілы аказваюцца магутнейшымі за лекі. Адбываецца цуд, і цуду верыш. Як верыш у тугу спакутаванага старога арганіста, які грае харалы і месы для яснавяльможнай публікі, але скрозь гранне не-не дый прарастуць, вырвуцца памятныя яму з маленства гукі: «Ой, рана на Йвана», «На лузе каліна чырвоненькая...» Гэта апавяданне-прытча «Песні маці...»

І ўсё ж — што можна пажадаць таленту, які сталее з кожнай новай кнігай? Хіба што адно: прыслухоўвацца найбольш да сябе, адштурхоўваць няшчырае, халодна-разумовае, тое, што паўстае небяспечнай перашкодай «на перакаце».

Пятро ВАСЮЧЭНКА.

Трэба адзначыць вельмі добрыя і кваліфікаваныя (з навуковага пункту гледжання) ілюстрацыі мастакоў Г. Сянькоўскага і К. Гардзеева, а таксама схемы і малюнкі дзідаў, стрэл, раслін, розных прадметаў, што ўжываліся тагачаснымі людзьмі. Ілюстрацыі надаюць кнізе яшчэ большую дакументальнасць і больш даходліва перадаюць чытачу звесткі пра жыццё людзей першабытнага грамадства.

М. Чарняўскі, здаецца, закрануў усе асноўныя бакі нялёгкага жыцця старажытных насельнікаў цяперашняй тэрыторыі Беларусі. Але сёе-тое ён абмінуў. Паколькі кніга ўсё ж такі разлічана на школьнікаў, то ў ёй амаль зусім не гаворыцца пра родавую структуру грамадства, матрыманіяльныя адносіны людзей (спачатку ў чалавечым статку, а потым і ў родавай абшчыне). Неяк адразу аўтар пачынае апавядаць пра манагамную сям'ю на чале з бацькам («Смерць Стронга»). На наш погляд, усё ж такі трэба было ў даступнай для школьнікаў форме штосьці расказаць пра родавую арганізацыю чалавечага грамадства.

У цэлым жа кніга М. Чарняўскага атрымалася цікавая і, перакананы, патрэбная. Яна фактычна з'яўляецца навукова-папулярнай працай. Напісана яна з адказнасцю за сваю справу, на высокім прафесійным узроўні, з любоўю да роднай зямлі. Можна не сумняваццa, што кніга будзе сустрэта добра не толькі вучнямі, але і настаўнікамі (для якіх, дарэчы, яна можа быць дапаможнікам), юнымі і дарослымі чытачамі.

Анатоль ГРЫЦКЕВІЧ.

ВЫХАВАННЕ ПОДЗВІГАМ

Новая кніга Анатоля Сульянава «Пасееш вецер...» — пра вызваленне беларускай зямлі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Кніга для навучэнцаў» — так аўтар вызначыў жанр яе, абраўшы прынцып падачы матэрыялу ў яго храналагічнай паслядоўнасці, засяроджваючы ўвагу на больш значных эпізодах з пэўнага перыяду вайны, расказваючы не толькі пра добра вядомыя подзвігі савецкіх людзей, пра якія ўжо неаднойчы паведамлялася ў друку, але і звяртаючыся да такіх, што сталі вядомы параўнальна нядаўна. Для гэтага выкарыстоўваюцца вытрымкі са шматлікіх дакументаў і данясенняў, урыўкі з успамінаў ваеначальнікаў, радавых удзельнікаў векапомных падзей. І, зразумела, за ўсімі гэтымі фактамі, лічбамі, назвамі праведзеных аперацый, прозвішчамі герояў бачыцца асоба самога аўтара — пісьменніка, ваеннага лётчыка першага класа, генерал-маёра авіяцыі, чалавека, які лічыць сваім маральным абавязкам расказаць падрастаючаму пакаленню аб тым, якой цаной было заваявана мірнае неба над галавой.

Асноўны змест кнігі — расказ пра вызваленне беларускай зямлі ад ворага, але А. Сульянаў палічыў патрэбным пазнаёміць чытача і з распрацоўкай фашыстамі плана «Барбароса», і з пачаткам вайны, і з цяжкімі першымі баямі. Зроблена гэта з адзінай мэтай: паказаць, у якіх цяжкіх умовах клаліся першыя цаглінкі ў падмурак будучай перамогі, як набліжалі яе воіны Савецкай Арміі, партызаны, падпольшчыкі. І тыя, хто насмерць стаяў ля сцен Брэста, і абаронцы Магілёва...

Калі кранаецца пісьменнік чалавечых лёсаў, ён не хавае сваёй узрушанасці і захаплення подзвігамі. Расказвае эмацыянальна, непасрэдна, з адценнем лірычнай узнёсласці. У кнізе з'яўляюцца своеасаблівыя ўстаўныя дакументальныя навелы, якія запамінаюцца, бо героі кожнай — з кагорты тых, пра каго ніколі не забудзе народ. Як, скажам, гомельская падпольшчыца Марыя Еўдакімава.

Было гэта восенню сорак першага... Фашысты пачалі другое наступленне на Маскву і «на ўвесь свет раструбілі аб поспехах аперацыі «Тайфун» і «падзенні сталіцы бальшавікоў». Паспяшаліся паўсюдна арганізаваць афіцэрскія балі, урачыстасці. На такое зборышча сабраліся і ў Гомелі. Ніхто з іх не звярнуў увагі на новую афіцыянтку, а Марыя Еўдакімава, паклаўшы ўзрыўчатку, збіралася ўзвесці ўзрыўное прыстасаванне і пакінуць залу. Ды нікога не выпускалі... Болем адзываюцца ў сэрцы радкі, напісаныя падпольшчыцай за некалькі хвілін да гібелі — сумачку Марыі і запіску знайшлі пасля вайны сярод развалін былога начнога казіно гітлераўцаў — 86 фашыстаў знішчыла гераіня: «Не веру, што Масква ўзята... Не веру і таму вырашыла ўзарваць гітлераўцаў і загінуць сама. Бывайце!..»

А подзвіг лейтэнанта Малкіна? Ён быў здзейснены ўжо тады, калі шырокім фронтам пачалося вызваленне акупіраванай тэрыторыі рэспублікі. Лётчык зрабіў усё магчымае — правільней, нават немагчымае: з абвугленымі нагамі, абпалены, ён усё ж пасадзіў самалёт, выратаваў дзяцей... На падобных эпізодах А. Сульянаў даволі часта засяроджвае ўвагу. І гэта важна. І не толькі таму, што юныя чытачы самой душой далучаюцца да подзвігу. Ёсць і іншая прычына таго, чаму паранейшаму так падрабязна патрэбна пісаць пра смерць і слёзы. Знаходзяцца за мяжой фашысцкія недабіткі і іх новыя прадаўжальнікі, якія гатовы любымі сродкамі і спосабамі прыменшыць значэнне таго ўкладу, што ўнёс савецкі народ у разгром нямецкага фашызму. Гэтая агалцелая кампанія набывае размах цяпер, калі ўсё прагрэсіўнае чалавецтва рыхтуецца адзначыць 40-годдзе Вялікай Перамогі.

«Увага! У вагонах дзеці!» — так называецца адно з дакументальных апавяданняў. Набліжалася чаканае вызваленне Бабруйска. І хоць фашысцкі гарнізон, выконваючы асабісты загад Гітлера: «Бабруйск утрымліваць як крэпасць!», працягваў супраціўляцца, танкавыя калоны 1-га Беларускага фронту ўсё цясней і цясней бралі горад у свае клешчы. У гэты час батальён пад камандаваннем капітана І. Кабякова рухаўся ўздоўж чыгуначнага палатна. Камандзір убачыў эшалон, у вокнах вагонаў якога — сумнення быць не магло — заўважаліся дзіцячыя тварыкі. Але ж мост, што наперадзе, узарваны. І тады камбат загадаў камандзіру замыкаючай роты: «Выходзь на рэйкі! Развярні танкі! Перакрый шлях саставу!» 689 дзяцей было выратавана. Дзяцей, якім фашысты рыхтавалі смерць: састаў спыніўся за некалькі метраў ад абрыву.

А. Сульянаў выкарыстоўвае і раздзелы агляднага характару, калі патрэбна расказаць аб правядзенні значнай баявой аперацыі ці даць чытачу ўяўленне аб абстаноўцы на франтах. Не абмінае пісьменнік і падзей, якія хоць адбываліся на тэрыторыі Беларусі, але мелі толькі пэўнае дачыненне да яе вызвалення. Падобны прынцып выкарыстання фактычнага матэрыялу таксама апраўданы, паколькі не заўсёды можна правесці — ды і наўрад ці гэта патрэбна рабіць — мяжу паміж тым, што прама ўплывала на разгортванне стратэгічна-наступальнай баявой аперацыі «Баграціён» ці ўскосна. Галоўнае: даць чытачу зразумець, што ў час барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ўся краіна была адзіным фронтам. Таму арганічна ўваходзіць у кнігу і нарыс «Смерш» — «Смерць шпіёнам», у якім падрабязна расказваецца пра дасканала праведзеную савецкай контрразведкай аперацыю па выкрыцці варожых дыверсантаў Палітава і Адамічавай, што павінны былі знішчыць вядомых палітычных і ваенных кіраўнікоў Савецкага Саюза, членаў Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання.

Разумеючы дасведчанасць сучаснага чытача аб усім, што тычыцца падзей мінулай вайны, А. Сульянаў імкнецца да таго, каб расказ не страчваў сваёй жывасці. Дасягаецца гэта, паўтараем, рознымі спосабамі, але добра і тое, што аўтар спасылаецца на выказванні фашысцкіх генералаў, гісторыкаў, якія таксама не маглі не прызнаваць мужнасці і гераізму савецкіх людзей. Матэрыял фактычны, дакументальны, тым самым стварае асаблівую пераканаўчасць.

У сувязі з гэтым хочацца сказаць вось аб чым. У выдавецтвах «Детская литература», «Просвещение» і іншых часта практыкуецца выпуск кніг, напісаных «людзьмі бывалымі» — вядомымі лётчыкамі, наватарамі вытворчасці, вучонымі... І не толькі такіх, са старонак якіх ажываюць пэўныя моманты біяграфіі саміх аўтараў. «Людзі бывалыя» расказваюць аб розным: і падзеях з жыцця краіны, і аб асобных навуковых адкрыццях. Нават аб тым, да чаго, здавалася б, самі ніякага дачынення не маюць. Але такія кнігі заўсёды **чытаюцца**. Чытаюцца, бо для хлопчыкаў і дзяўчынак, якія рыхтуюцца да самастойнай дарогі, важна не толькі тое, пра што напісана, але і кім напісана.

Ці не паспрабаваць і нашым рэспубліканскім выдавецтвам — магчыма, той жа самай «Народнай асвеце» — прадоўжыць намаганні ў гэтым кірунку? І абавязкова падрабязней расказваць у пачатку кніг пра жыццё аўтараў. Шкада, што пра А. Сульянава дзеці даведаюцца мала. Перад народным пісьменнікам Беларусі Васілём Быкавым, які напісаў прадмову, стаяла зусім іншая задача, таму ён і абмежаваўся толькі некалькімі словамі пра аўтара.

Бадай, трэба патрабавальней ставіцца і да афармлення падобных кніг. Усё ж — пагадзіцеся — «Пасееш вецер...» выйшла не на лепшым мастацка-паліграфічным узроўні. Пераплёт пад плёнкай, збрашураваныя ў адзін сшытак дакументальныя здымкі — ілюстрацыі атрымаліся нейкімі аляпаватымі — не выйсце са становішча. Кніга павінна не толькі чытацца, але і глядзецца — тады выхаванне подзвігам ці іншымі, не менш добрымі і значнымі справамі, будзе адбывацца яшчэ на больш высокім ідэйна-мастацкім узроўні.

Алесь МАРЦІНОВІЧ.

А. Сульянаў. Пасееш вецер... Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Кніга для навучэнцаў. На рускай мове. Мінск, «Народная асвета», 1984.

хася Стральцова, Уладзіміра Дамашэвіча, якія, як і І. Чыгрынаў, «пачыналі з «малой» прозы», а таксама Івана Пташнікава і Уладзіміра Караткевіча, якія «напачатку выступілі ў іншых жанрах».

Усё гэта, безумоўна, садзейнічае больш шырокаму і глыбокаму разуменню творчасці І. Чыгрынава як з'явы ў сучаснай беларускай літаратуры, а таксама дае лепш адчуць важкасць таго ўкладу, які ўнёс ён у развіццё ўсёй савецкай шматнацыянальнай літаратуры, асабліва ў распрацоўку адной з самых важных яе тэм—тэмы ўсенароднага подзвігу ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Заглыбляючыся ў сутнасць набыткаў пісьменніка, даследчыца паступова прасочвае, як з Чыгрынава-навеліста нараджаўся Чыгрынаў-раманіст.

Праўда, крытык далёкая ад думкі, што сярод твораў «малога» жанру ўсе раўназначныя ў сваіх ідэйна-мастацкіх вартасцях. Сям-там у І. Чыгрынава сустракалася і празмерная рацыяналістычнасць, калі-нікалі не хапала «глыбокага асэнсавання саміх па сабе цікавых жыццёвых фактаў». Не абышлося ў асобных выпадках і без пэўнай эскізнасці. У гэтым у пэўнай меры з крытыкам можна пагадзіцца. Аднак не зразумела, адкуль узяла яна, «эскізнасць» у апавяданні «Самы шчаслівы чалавек», адным з самых лепшых чыгрынаўскіх твораў «малога» жанру, у якім пісьменніку ўдалося стварыць праўдзівы вобраз, раскрыць шматгранны характар пагранічніка Балаша, прадстаўніка пакалення саракавых, якое шчыра верыла, што вайна з гітлераўцамі, калі пачнецца, закончыцца праз тыдзень-другі на варожай тэрыторыі.

Гэта, як кажуць, прыватнасці. Галоўнае ж у тым, што Т. Грамадчанка ўдаецца знайсці, адчуць своеасаблівы «пульс» усёй прозы І. Чыгрынава—яго здольнасць у большасці выпадкаў ісці няторанымі сцяжынкамі. Гэта бачылася пасля з'яўлення ў друку апавяданняў. Правільнасць падобнай думкі — а найбольш чуйныя крытыкі адразу гэта адчулі — падмацаваў раман «Плач перапёлкі»: ён «стаў у многім новым словам пра вайну, пра жыццё народа ў часіну цяжкіх выпрабаванняў». Наступныя раманы — «Апраўданне крыві» і «Свае і чужынцы» — таксама пацвярджэнне таму, што І. Чыгрынаў ідзе менавіта сваім шляхам.

Пры разглядзе раманаў даследчыца шмат увагі засяроджвае на прачытанні вобразаў галоўных герояў — Дзяніса Зазыбы і Радзівона Чубара. Менавіта Зазыба і Чубар утвараюць сабой тое своеасаблівае сілавое поле, якое прыцягвае — не можа не прыцягваць — да сябе многіх людзей. Зразумець правільна, хто яны ёсць на самай справе, — значыць, адчуць, як паступова адбывалася ажыццяўленне значнай пісьменніцкай задумы, як нараджаліся па-сапраўднаму народныя характары, хоць празмерная засяроджанасць крытыка толькі на вобразах гэтых персанажаў у пэўнай меры паслабляе адчуванне значнасці, «патрэбнасці» іншых герояў раманаў.

Бадай, варта было хоць крыху сказаць і пра кнігу публіцыстыкі, літаратурна-крытычных артыкулаў «Новае ў жыцці, новае ў літаратуры», якая выйшла з друку нядаўна і сведчыць аб плённасці пошукаў пісьменніка і ў гэтым кірунку. І ўсё ж тое, што Т. Грамадчанка сказала пра творчасць І. Чыгрынава, дае даволі поўнае ўяўленне пра пісьменніка.

Тым больш прыемна, што кніга «Жывая памяць народа» працягвае серыю нарысаў, што ўжо з'явіліся ў рэспубліканскіх выдавецтвах і расказваюць пра прадстаўнікоў сённяшняга, так званага сярэдняга, пакалення беларускіх літаратараў: раней, нагадаем, выйшлі кнігі пра творчасць Ніла Гілевіча, Рыгора Барадуліна, Генадзя Бураўкіна. Дарэчы, толькі што пабачыў свет нарыс Яўгена Лецкі «Хараство і боль жыцця», у якім прасочваецца творчы шлях Вячаслава Адамчыка.

В. ЛЫСОЎ.

З ПАЭТЫЧНАГА СШЫТКА

Вера ВЯРБА

Лірнік

Не лірык першым быў, а лірнік
Наш спадарожнік на зямлі,
І струны песень яго мірных
Гучаннем памяці жылі.

Усім трапляўся на дарогах,
Хто не адолеў свет спярша,
Спыняўся ў хатах ля парога,
Куды прыводзіла душа.

Вылечваў сэрцы ён ад болю,
Умеў адвесці ад бяды...
Адорвалі—хто хлебам з соллю,
А іншыя—глытком вады.

За праўду гаварыла ліра,
Слыла за мудрасць між
людзей,
Хоць не было тады куміраў
І жабраком быў дабрадзей.

Непадуладны да высновы;
Паданняў змест святлей
святла.
Напэўна, з іх народа мова
Паэтам гонар зберагла.

Каб сэрцы адкрывалі шчыра
Спрадвечнай чысцінёю мук,
Стары жабрак пакінуў ліру,
Як развітальнай песні гук.

●

Галубоў буркатанне
Сэрца слухае ў скрусе.
Гэта чыстае ранне,
Як вясновыя гуслі.

Вецер струны настроіў
На балады лясныя.—
Ціхі дом пад гарою,
Аканіцы разныя...

Сонца вымыла вокны
Да празрыстай сінечы,
На бярозе высокай
Аблачына трапеча.

І душы маёй цесна,
Прагне шчасця і долі,
Жаўруковае песні
Над прасторамі поля.

А зямлі не ўзаралі,
Надвячоркам марозна,
Паміж голых праталін
Снег ляжыць у барознах.

Але ўсё ў наваколлі
Зрух прыроды вітае.
Хутка прыйдзе на поле
Зноў пара пасяўная.

На адноўленых пожнях
Будзе рунь каласіцца,
І вясны маёй позняй
Адгукнуцца грамніцы.

●

«Не прадаецца міг натхнення,
Ды можна рукапіс прадаць!»—
Хацеў вясёлым жартам геній
Заробкі з вершаў апраўдаць.

Мяняліся часы і званні,
Услед за ісцінай старой
Імкнуць паэты апраўдання
Сумленнай годнасці сваёй...

Да славы лірык несвядомы,
Не дасягнуў яе вушэй.
Сусед, дырэктар гастранома,
Па значнасці—куды вышэй!

Абранніка пазнаць па карку,
Набыткамі жыве сям'ёй.
Ці ж так наладзіш гаспадарку
З капрызнай музаю сваёй?

І ўсё ж цікаўнасць ёсць такая,
Да працы нашае папрок—
Знаёмы здзіўлена пытае:
— Няўжо вам плацяць
за радок?

Што праўда, тут
не растлумачыць,
Залішне многа нам даюць,
Таму паэты, не іначай,
За век больш вып'юць, чым
з'ядуць...

Быў ходкім верш заўжды
таварам,
Куды б яго гандляр ні збыў.
Шкада вось толькі—
з ганарару
Ніхто бяссмерця не набыў.

Прыхільны лёс да нас
нязменна,
Смерць выбірае без чаргі,
А за труной—юнацтва цені
І пажыццёвыя даўгі.

Хоць многіх ты, крылаты геній,
Парадай мусіў апраўдаць:
— Не прадаецца міг
натхнення,
Ды можна рукапіс прадаць!..

●

Сцяжынка, чыстая слязінка,
Зіма-матуля састарэла,
Але віхурыцца сцяжынка
З яе рукі заледзянелай.

Удзень і ўноч завея кружыць,
Вятры гуляюць, як
з пахмелля,—
Ці месяц нежанаты тужыць,
Ці ведзьма справіла вяселле...

Наступны тыдзень у тумане
Паўстала сонца за градою,
Нібы павеяла дыханнем
Снягоў з расталаю вадою.

Я каву п'ю, адчуўшы горыч
Расстання і дарогі новай,
А ты пра нешта мне гаворыш,
Але не разумею словы.

Далёка позірк мой блукае,
У іншых днях быцця
праменных,
Дзе галасы вясну гукаюць
На спадзяванне перамены.

Здаецца, слухае прырода,
Адлічвае сама імгненні
Пары адвечна юнай года,
Ад сну шчаслівага збавення.

●

Сяброўства шчырыя кабеткі!
Ці варты вас мае радкі?—
Не запрашаю чорта ў сведкі,
Шкадуючы яго бакі...

Шчаслівым выпадкам упартым
Калі б якую ні сустрэць—
Не трэба варажыць на карты,
У люстэрка можна не глядзець.

Усё дакладна вам вядома
У мінулым і на гэты час:
Каго кахаю, з кім знаёма,
Што я піла: віно ці квас.

Чым сын парадаваў у школе?
Як сустракала Новы год?
Чаго сабака мой скуголіў?
Ці начаваў у хаце кот?

Дзе шыла модную сукенку?
Хто сёння мне званіў на дні?—
Адказ чытаю ў вашых зрэнках
Расчуленае дабрыні.

Сізіф, да цяжкасцей ахвочы,
Не здужыць тое за вякі,
Што паспыталі вашы вочы,
Перамалолі языкі.

Расстацца з вамі немагчыма,
Не вымесці пад памяло...
Што б зналі пра жанок
мужчыны,
Каб іх сябровак не было?!

Я з вашых рук прымаю каву
Прыязні даўняй саладзей,
І дзеля вас мой твар рухавы
Самой усмешкі маладзей...

●

Плывуць на захад аблачыны,
Зімовы горад, як у сне,
А мой чарговы адпачынак,
Як і заўсёды—па вясне.

Так, уздыхаючы, употай
Вясны чакаючы ганца,
Жыву і мару за работай,
Каторай не відно канца.

Марудны час маёй кватэры
Да сонца цягнецца смялей,
Ліст распачатае паперы
За першы снег ляжыць бялей.

Усё для працы пад рукою,
Падрыхтаванае даўно,
З усім нятворчым непакоем
Раз-пораз зазірну ў акно.

Не прамінуць бы той хвіліны,
Як загучыць птушыны спеў,
Ад сну абудзяцца галіны
Высокіх пракаветных дрэў.

Забуду ўсё: старыя звычкі,
Сяброў і рукапісны стог,—
За паўгадзіны электрычка
Пазбавіць колішніх трывог.

Калі на ўзлесак выйду ціха,
Дзе задуменна сярод дня
Стаіць магутная ласіха
І з ёй малое ласяня.

Ім хлеба пакладу акрайчык,
Для смаку сыпануўшы соль...

УПЕРШЫНЮ ў «ЛІМе»

Суцяцальніца

— Гэй ты, дзіцятка, не шчымі ў сэрцы злосць, не акручвай яго гадзюкай чорнай. Яно і так трапеча ў грудзях тваіх, як ластаўка за акном: ірвецца, крывёю абліваецца. Заспакой яго, любка, і зладзіцца ўсё, нядзельным снегам кане, з ночкай згіне. А любоў, каханейка тваё яшчэ будзе. Прыйдзе, дзіцятка. І вочы нечыя пададуцца табе мілей і святлей зорак майскіх.

Ты паляжы, паслухай, што некалі бабка мая гаманіла. А было ж тое не так даўно, хоць і не так блізка. Загуляла Марфачка Леўкіна з печкуром маладым з-пад Сожа. Гуляла, галаву згубіўшы, ночкі цешылася, днямі спала. Алёна, матка яе, глядзела на гэта як праз палатно — песціла Марфачку. Пячкур жа быў, як месяц, зірнеш — прыгажосць вочы адбярэ, загаворыць — драмата галаву туліць. Больш за ўсё любілі яны, маладыя, Арцемчыкава азярцо з дубамі. Вада была там, што васількі на ўзмежках поля, дубы — волаты, зірнеш на вяршочак — шапка з галавы падае.

Часта чулі жанкі ды дзяўчаты, як звінеў смехам Марфаччын голас, а то песенька плыла з-пад дубоў ды такая, што дых перахоплівала, сэрца саладкаватай нудой сыходзіла.

Ніхто ў вёсцы не помніў, не ведаў такога кахання.

І вясна так прамінула, похапкам лета шуснула, восень загойсала па дрэвах, першае лісце паляцела на дол... Захацелася пайсці Марфачцы па журавіны ў Багуннікава балота. Гэ, раней іх было, як насыпана. Аж ззяла ад іх.

І пайшла Марфачка туды адна, толькі з суседскаю кашолкаю. Як пайшла, так і не вярнулася. Шукалі дзень-два — дарма, ні слыху ні дыху. А пячкур? Не вытрываў, не вынес бяды, дзіцятка, засіліўся на дубе высокім каля таго азерца. Во як яно бывае, мая галубка, ад вялікай любові...

Дык што я табе скажу, дарагое маё дзіцятка?! Калі надумаўся пайсці ад цябе, дык няхай ідзе: як ні прасі застацца, як ні прымай, калі вернецца, — парванае без рубца не сшыецца... А каханейка, дзіцятка, яшчэ прыйдзе да цябе. Быць таго не можа. Пакуль стаіць зямля наша, датуль і ўсё добрае ды мілае нязводнае...

Анатоль КАЗЛОЎ

Абразкі

Анатоль КАЗЛОЎ прыкметна вылучаўся на апошнім семінары маладых літаратараў у Каралішчавічах. Па-першае, сярод празаікаў быў самы малады (ён — студэнт Гомельскага дзяржаўнага універсітэта), па-другое, была адметная яго проза.

Анатоль Казлоў любіць пісаць невялікія сцэны з народнага жыцця. У іх рэалізм суседнічае з казкаю, сённяшняе з мінулым, у выніку чаго паўстае нейкі своеасаблівы прываблівы свет, своеасаблівыя вобразы добрых людзей. Пакуль што, мусіць, рызыкоўна гаварыць, ці і далей Анатоль будзе пісаць, як вызначае ён сам, міфалагічныя апавяданні, ці яны некалі стануць толькі сцэнамі, падсветкаю ў яго буйных празаічных творах, але ўжо і цяпер (нават па абразках, што прапаноўваюцца ўвазе чытача) бясспрэчна адно: у нашу прозу шукае дарогі здольны малады чалавек. Пажадаем жа яму плённых пошукаў і знаходак.

Генрых ДАЛІДОВІЧ.

Крыўда

— Кажаш, папрасіла б, дык і памаглі б ? А паспрабуй да іх падступіцца, з якога боку і як лашчыць. Толькі слова спаганіш ды сэрца ад крыўды зойдзецца. То ўжо лепш паціхеньку сама, па-каліўку, па крошцы, што зраблю, як зраблю — і ладна.

— Унукі ж хоць прыходзяць? Не выракаюцца?

— Прыбягаюць крадком. Дзеўка падлогу памые, у хаце прыбярэ, вады, дроў прынясе... Адным словам, дзеці добрыя ў іх, няма чаго наракаць.

— А за што ж так яны цябе, матку, знелюбілі?

— Бог іх ведае. Як стала Галя дырэктаркай, а Лёнік мой пры старшыні закруціўся, дык і змяніліся, зчужэлі. Бывала, зануджуся адна ў хаце, дык за кавеньку і да іх. А яны і пазіраюць няветла, і маўчаць, як вады ў рот набралі, а то ні з таго, ні з сяго ўспыхне каторае і гыркне. Пасяджу карчом і пацягнуся ў сваю хату. Адзін раз Галя дык зусім ястрабіхаю накінулася: «Не валачылася б, не мазоліла вочы сваімі хустамі, кавенькаю, калі госці ў хаце... Перачакала б, як пойдуць людзі, дык тады зайшла б, калі гэтак ужо цягне сюды...» Павярнулася я тады і пайшла прэч, заліўшыся слязамі. Выплакала слёзы, а потым і думаю сабе: «А можа, мне і не трэба лезці да іх. Хоць і родная кроў, але ў іх, маладых, сваё, а ў мяне, старой, сваё. Ці ж я ведаю тое, што яны ведаюць, ці ж я скажу тое, як яны скажуць? Выгадавала сына адна, без чалавека — дык і добра. радуйся, што жыве, сям'ю мае, хлеб е і да хлеба ўсяго поўная хата...» Дык вот, любка, я ўжо і не хаджу да іх. Лёнік мой, як сустрэне, дык хоць пра здароўе папытае ці памагчы захоча дроў накалоць, а нявестка на другі бок дарогі пераходзіць...

Старыя пастаялі, памаўчалі, ківаючы галовамі ды задуменна пазіраючы ў свет вялікі, а пасля пайшлі кожная сваёю дарогаю. Са сваімі клопатамі.

Жаўка, мяцеліца і Сяргейка

Ой, загула-загула мяцеліца,
Закруціла, з дарожанькі збіла.
Ой, загула-загула беспрасветная,
У лясок у глухі залучыла.

З народнага.

Мяцеліца гуляла трэці дзень. Выла, дзьмула снег, накруціла харомы, ні табе кроку ступіць, ні табе нагу смела паставіць. Вышэй не толькі платоў, але і невысокіх стрэх белыя падушкі харомаў, да калодзежа не дабярэшся. Ды што да калодзежа — дзвярэй сянец не адчыніць, а адчыніш — нікуды не ткнешся. Пакапалі людзі тунелі ды ходзяць імі да хлява, да суседа ці да таго ж калодзежа.

Затое сабакам воля. Паспускалі іх з ланцугоў, от яны і гойсаюць: то па

Праменлівы аслепіць зайчык,—
Пранізлівы свабоды боль.

●

Памерла бабуля Марыля.
Застаўся магілы грудок.
Дрэвы старыя накрылі
І голас яе, і слядок...

— У роднай зямельцы,
не ў скрусе
Пятнаццаты год ляжыш.
Прабач, што ніяк не збяруся
Паправіць пахілены крыж.

На радаўніцу не схадзіла,
Бо клопаты з-за дзяцей.
І з кветак, што я насадзіла,
Ніводная ўжо не цвіце...

Сюды ў адзіноце прыходжу,
Нягледзячы на пару,
Фарбуючы агароджу,
З табой услых гавару.

І смерць мне здаецца не болей
Працягу ў зямным адкрыцці.
Каб ведаць, дзе меней
болю,—
У «гэтым» ці ў «тым» жыцці?

Як многае лёсам страчваў,
Хто літасць спакою прасіў?
Даўно я, бабуля, не плачу,
Даруючы ўсё і ўсім...

Вось гэтак у месцы жалобным
Няспешныя думкі цяклі.
І сэрца здалося падобным
На жменьку сухой зямлі...

●

Сонца высока ў зеніце.
Мірна паснулі сычы.
А перапёлачка ў жыце
Зранку тужліва крычыць.

Сон гэта ці напамінак,
Што спасылае жыццё?—
Нібы маленства, развіну
Жытніх калоссяў асцё...

Дзе перапёлчына гора
Лёгка блукала за мной,
Там расступалася мора
І паўставала сцяной.

Колькі з таго перажыта!
След ад маленства ачах.
Ледзь нагадае пра жыта
Хлеба духмянага пах.

Не закрываючы вочы,
Слухаю голас начы.
Піць перапёлачка хоча,
Недзе тужліва крычыць.

Калыханка

Калыханку я спяваю
На твае жаданні-сны.
Словы з песень адбіраю
Паўзабытай даўніны.

Што каханымі пражыта,
Не адмерыць смутак мой—
Узышло на нівах жытам,
Парасло ў лугах травой.

Па гаях лістотай новай
У праменнай вышыні
Трапяталі сны любові,
Незасмучаныя дні.

Людзі верылі і зналі,
Як калісьці ў даўніну
Варажбіткі чаравалі
Ад кахання і агню.

Ад сурокаў і сухотаў
Слова дзейснае было,
Толькі вось ад адзіноты
Нам замовы не дайшло.

Пад халодным небасхілам
Песняй зорку калышу
І тваіх жаданняў, мілы,
Адзінокую душу.

Мімозы

Стаялі лютыя марозы,
Скавалі ўсе шляхі зямныя.
У хаце першыя мімозы
Праменілі святлом жывыя.

Я ведала, як засынала,
Што водар іх мяне разбудзіць,
Так пахне толькі снег расталы,
Калі вясну ўдыхаюць грудзі.

Ты з кожнай новае паездкі
Заўсёды кветкі мне прывозіў,
У дні мае па назвах кветак
Цяпер прыйшла пара мімозы.

Пара надзей, пара спатканняў,
Што апявалі ўсе паэты,
Па ёй спыняліся ў блуканні
Людскія зоры і планеты.

І я малю за той прытулак,
Каторы знойдзеш ты, каханы,
Цяплом і радасцю прачулы,
З дарог цяжкіх расчараваны.

Прачнешся раніцай вясновай
І час з усмешкай прывітаеш,
Успомніўшы спагады словы,
Мяне, далёкую, згадаеш...

●

Пакуль жыву, цябе кахаю,
Пакуль кахаю—я жыву.
І першы снег, і квецень мая
Тваім сузор'ем назаву.

Як лістапад пагаслы ўвосень,
Хмурынка памяці мая,
За боль, каторы ты прыносіў,
За роспач, што дарыла я.

Ні паратунку, ні збавення
Ужо ніколі не знайсці,
Сустрэч кароткія імгненні
Аднойчы выпалі ў жыцці.

І тых хвілін не растлумачыць,
Што нагадаюць шчасця міг,
Калі цябе ізноў пабачу
Як прадказанне дзён маіх.

На сонечны прамень вясновы
Галін раскрыецца лісцё,—
Так мне імгнення дастаткова
Пражыць з табой адно жыццё.

Цяпло бацькаўшчыны.

Фотаэцюд А. БАЙДАК.

тунелях, то па гурбах і стрэхах. Узбяруцца на якую адну хату ды ўсчыняць валтузню, енк, гарэзныя гулі, што аж жах бярэ. А то яшчэ, от нячыстая сіла, дабяруцца да коміна і, падсунуўшы пад цагліны пысы, давай падвываць. Выберацца тады хто-небудзь з хаты, шпульне ў гайню кіем і, прагнаўшы, зноў шусне туды, пад снежнае царства.

Каб вы ведалі, як карцела Сяргейку выскачыць на двор, як карцела прабегчы па снежных палацах, заскочыць да Петрака. Ды дзе там, баба Рыпіна і слухаць не хоча, каб выпусціць яго з хаты. Прыстрашыла: выскачыш сам — возьме дзверы на кручок, на дварэ пакіне начаваць. От і сядзі дзень і ноч у хаце.

— Баб, а баба, ік, ік, баба, чуеш, ік, ік?

— Чаго ты, вярза, хочаш?

— Ікаўка прыстала.

—Лезь на печ, не лындай па халоднай падлозе. Застудзішся, што я тады матцы скажу?

Сяргейка залез на печ, выпрастаўся на чарэні. Гладкія цагліны, адпаліраваныя спінамі, лагодна прылашчылі цела лёгкім цяплом.

Баба Рыпіна размотвала маток нітак і скручвала іх у клубок.

— Ік, ік...

— Што — і ў цяпле не праходзіць?

— Не.

— Слухай тады,—прамовіла баба. — Паўтары за мной тры разы: «Ікаўка, ікаўка, сядзь ля варот, хто будзе ісці — ускоч таму ў рот». Запомніў? Дык вот і скажы тры разы — усё як рукою здыме.

— Баба, а вароты ж пад снегам, як яна сядзе ля варот? — запытаў Сяргейка.

— От, радзімец, не думай шмат. Лепш паўтары тое, што я сказала.

Сяргейка забубнеў — раз, другі, трэці. На хвіліну заціх, упэўніваючыся, ці адскочыла ад яго ікаўка, ці не.

Нейкі час у хаце панавала сціпанасць. І от зноў пачулася з печы ік ды ік.

— Баба, яна не праходзе.

— Ды чую, што не адчэпліваецца. Каб ты раней залез на печ, не ныў, каб пусціла на двор, дык не было б ніякай ікаўкі. Гора мне з табою. Маці цалюткі дзень на рабоце, а ты во тут са мною. І сам нудзішся, і мне галаву дурыш.

— А ты завядзі мяне дадому, — папрасіў Сяргейка. — Я адзін буду.

— Куды я цябе павяду? На двор вунь няможна нос вытыркнуць. Ды і мароз толькі што сем баб павёз.

— Якіх сем баб?

— А во такіх, як я. Строгіх, сярдзітых.

— А чыіх баб ён павёз? Петракову ўзяў?

— Петракову не ўзяў, — баба Рыпіна хітравата ўсміхнулася.

— Ік, ік, — зноў заікаў Сяргейка.

— Давай яшчэ па-другому паспрабуем прагнаць ад цябе гэтую ікаўку, — сказала баба. — Гавары: калі памінае свой род, дык галавой у мёд, калі чужы — то галавой аб лёд.

— І гэта тры разы казаць?

— А як жа. Усё тры разы трэба гаварыць, бог тройцу любіць.

— Баба, а калі мамка мяне ўспамінае, дык яна трапіць галавой у мёд?

— У мёд, куды ж яшчэ. Ты ж — сын, радасць, апірышча.

— А вот і няпраўда, — усклікнуў Сяргейка. — А вот і няпраўда. У нас няма мёду. Дзядзька Іван увосень даў слоік мёду, дык мы яго ўжо з'елі. Ага, бабачка, не трапіць мамка галавой у мёд. І добра, што не трапіць, бо мёд ліпучы, галаву з яго не выцягнеш. Дык я і не буду гаварыць такія словы.

— Бач ты, — са здзіўленнем паківала галавою баба. — Разумны, як і стары. У каго ты ўдаўся, дык ужо і не ведаю.

— А калі нехта дасца галавой аб лёд, дык гэта ж надта балець будзе. Летась я — ік, ік — каленам ударыўся, дык балела...

— Бо вельмі ж дападны, усюды, дзе трэба і не трэба, улезеш, дападзеш, — паўшчувала баба Рыпіна. — Ды яшчэ сплёўся з Петраком гэтым. Ён, бальшун да дабра цябе не давядзе. Ён і цябе навучыць, як і яго дзядзька рабіў, у кашы з даху лятаць.

— Як у кашы з даху? — здзівіўся Сяргейка, што нават ад гэтага здзіўлення ікаўка пра яго забылася.

— Як? Проста. Залез Міцька...

— Які Міцька?

— Ну дзядзька Петрака, шылахвост, штукар адмысловы. Цяпер недзе па свеце круціць. Дык вось гэты Міцька, калі быў малады, зацягнуў на страху хаты вялікі кош, якім рыбу ловяць. прывязаў да яго венікі, сеў і падскочыў — ляці, кош... Аж кош не паляцеў, а пакаціўся кубарам уніз. Думалі, што Міцька гэты і касцей не збярэ. Аж грымнуўся, паляжаў трохі белы — і нічога, выжыў. Нічога не адбіў. А смеху было на ўсю вёску. Жаніх, у сваты пара ісці, а ён дурнее — на кашы палётаць хоча. Дык вось, унук, дурнотаю не трэба займацца. Бо ці сам галаву скруціш, ці пасмешышчам будзеш.

— Міцька, мусіць, цяжкі быў, от і не паляцеў. Каб хто лягчэйшы сядзеў у кашы, дык...

— Людцы вы мае, — разгублена пляснула ў ладкі баба. — Ты ж хоць не ўздумай гэтыя палёты рабіць. Я так, да слова, пра дурноту людскую, сказала.

— Ік, ік, — зноў пачулася з печы. І тут жа ўслед — ныццё: — Баба, пусці мяне на двор.

— Ану цябе к свінням з тваёю ікаўкай, — узлавалася баба Рыпіна. — Усё, астатні раз паспрабую прагнаць яе. Ты ў мяне пытай: «Баба, нашто ты шпільку ў мяне ўзяла?» Я табе скажу: «Калі?» А ты мне адказвай: «Ікаўку скалі». Запомніў?

— Ыгы.

— Ну то давай, пытай.

— Баба, нашто ты шпільку ў мяне ўзяла?

— Калі?

— Ікаўку скалі.

— Баба, а колькі разоў так пытаць? Тры разы?

— Пакуль ікаўка не пройдзе, датуль і пытай.

Сяргейка пачаў зноў пытацца, а баба — адказваць. У Рыпініных руках мільгаў ладны ўжо, з качанчык, клубок суравых ільняных нітак. Маток жа на вачах танчэў. У хату праз верхнія шыбіны ў вокнах скупа свяціў кароткі зімовы дзень. У пакоі згушчаўся змрок.

— Баба, мне ўжо не хочацца пытацца адно і тое ж, — не выцерпеў, папрасіўся Сяргейка.

— Надакучыла — дык маўчы. Я ж не змушаю цябе гаварыць.

— А калі я пайду дадому?

— Вернецца маці з работы, дык і завяду. Сам жа знаеш, яна не можа забегчы і цябе забраць. Ёй жа яшчэ нямала работы і дома. Ухадзіцца, вячэру згатаваць.

Сяргейка замоўк. Задумаўся.

— Было б лягчэй, каб твой бацька быў... Аж... — уздыхнула баба Рыпіна. — Што каму скажаш... Завязаў ён свет тваёй матцы, цябе сіратою пакінуў... Ты ж, мужчынка, хоць матку не крыўдзі. Слухайся, памагай ёй.

— Добра, — ціха прамовіў Сяргейка.

— А мы з маткаю выкачалі цябе, скора ў школу пашлём. Вывучышся, на ногі станеш, дык некалі мо яшчэ твой бацька на каленях перад табой стаяць будзе: даруй, сыночак, што пусціў цябе на свет, але кінуў, нават не пабачыўшы... Многа ёсцека такіх бацькоў. Нямала і тых, што потым просяцца...

Сяргейка, адчуваючы ранні, не для сваіх гадоў боль, маўчаў.

— Уцякла ікаўка? — спагадліва запытала баба.

— Уцякла.

— Во і добра, во і малайчына. Грэйся. А калі заснеш, дык не бядуй. І сёння ў мяне пераначуеш.

— Па мяне мамка прыйдзе.

— Можа, і не ўтрывае, прыбяжыць, — згадзілася баба Рыпіна. — Цяжка ёй і на ферме, і дома ўсё адной робячы, але яна за табою аж млее... З-за цябе нават асцерагаецца замуж выйсці, хоць і надарыўся добры чалавек...

Сяргейка нічога не адказаў. Размякчэўшы ад цяпла ды думаючы пра ласкавую маці, думаў і слухаў, як вые мяцеліца за вокнамі. Яна гудзела, вішчала, сыпала ў шыбіны снег, што ападаў і насыпаў новую гурбу.

Ды сціхні ты, сціхні, мяцеліца,
Выпусці сонейка краснае,
Промнікі чыстыя ясныя
Дзеткам маленькім на радасць...

Кінагод: лічбы і эмоцыі

З XIII АГЛЯДУ-КОНКУРСУ ПРАДУКЦЫІ «БЕЛАРУСЬФІЛЬМА»

Гартаю праграму: 12 іграв ых стужак (поўнаметражныя карціны для «вялікага» экрана, тэлесерыялы); багатая колькасць разнастайных фільмаў, створаных ВТА «Летапіс»; тры работы мультцэха. Тут і фільмы, якія ўжо выйшлі на экран і пра якія вялася гаворка на старонках «ЛіМа». І работы, яшчэ незнаёмыя шырокаму гледачу, — пра некаторыя з іх гаворка пойдзе ў будучых публікацыях...

Чарговы агляд-конкурс быў па-свойму адметны на факты. У беларускім іграв ым кіно намеціліся прыступкі да распрацоўкі сучаснай сацыяльна-маральнай праблематыкі («Даруй нам, першае каханне» рэжысёра М. Якжэна па сцэнарыі А. Аляксандрава, «Дрэвы на асфальце» У. Коласа па сцэнарыі К. Губарэвіча, «Меншы сярод братоў» В. Турава па сцэнарыі Р. Бакланава, «Раданіца» Ю. Марухіна па матывах аповесці А. Кудраўца). З'явілася сапраўднае дасягненне ў экранізацыі літаратурнай класікі («Бацькі і дзеці» рэжысёра В. Нікіфарава). Здымаліся фільмы на традыцыйныя для беларускай студыі тэмы з гераічнай гісторыі («Апошні крок» — рэжысёр Д. Вяціч-Беражных, сцэнарыст М. Бярозка; «Глядзіце на траву» У. Пазнякова, сцэнарый А. Вялюгіна паводле прозы Я. Брыля; «Блізкае і далёкае» В. Турава, тэлеэкранізацыя трылогіі І. Мележа; «Чырвоны пясок» Б. Сцяпанава з цыкла «Дзяржаўная граніца»). Падтрымлівалася ўвага творчых работнікаў да кіно для дзяцей («Юрка — сын камандзіра» М. Лук'янава, паводле аповесці М. Кругавых; «Рыжы, сумленны, закаханы...» Л. Нячаева паводле казкі Я. Экхольма «Людвіг XIV Ларсан...»; «Восеньскі падарунак феяў» У. Бычкова па матывах твораў Х.-К. Андэрсена).

Як рэжысёры поўнаметражнага кіно дэбютавалі М. Якжэн, У. Колас, М. Лук'янаў, Ю. Марухін. У цітрах пераважалі імёны маладых беларускіх кампазітараў: П. Альхімовіч, А. Залётнеў, У. Кандрусевіч, У. Солтан, Я. Паплаўская. Больш чым 30 беларускіх акцёраў, сталых і пачаткоўцаў, зняліся ў вядучых ролях і ў эпізодах. Сярод іх — Г. Макарава, А. Клімава, Р. Янкоўскі, Ф. Шмакаў, С. Станюта, М. Захарэвіч, Г. Гарбун, У. Куляшоў, Т. Мархель, А. Дзянісаў, А. Мілаванаў, С. Кузьміна, В. Бандарэнка, А. Лабуш, В. Катавіцкі...

Лічбы, прозвішчы. Ды нават у дакументальным кіналетапісе простых фактаў недастаткова, каб апеляваць да эмоцый гледача. А без эмоцый — якое ж мастацтва?

НЕ «ГУЛЯЙЦЕ Ў ГЕРОЯ»!

На дзіва захопленае і ўдумлівае, жывым і свежым голасам напоўненае, чытанне! Услед за стваральнікамі экранізацыі «Бацькоў і дзяцей» мы перачытваем хрэстаматый н ы тургенеўскі раман. Так блізка адчуваеш подых і пульс таго, не блізкага ўжо, часу. І якая багатая, магутная, прываблівая і па-сённяшняму праўдзівая няпростая натура — Базараў маладога акцёра У. Богіна. А варты яго партнёр-апанент — Павел Пятровіч акцёра Б. Хімічава! У кадры — пэўны час, адпаведныя часу героі...

Не лічыш экранныя гадзіны. І даруеш пэўную праставатасць Адзінцовай (аблічча «без меткі», нейкі закончаны выраз твару). Даруеш абстаўлены па-вадэвільнаму візіт Аркадзя да губернскага сваяка; расцягнутасць карцін хваробы Базарава. Даруеш і пралікі ў карпатлівай працы мастака (у інтэр'ерах дома Адзінцовай знакаміты віцебскі дыван-прызёр «Колас»; келіхі, відавочна, са шклозавода «Нёман», з арнаментальнай насечкай крыжыкамі; цяперашні мельхіёравы падстаканнік, якімі штодня карыстаюцца ў знаёмых мне кватэрах, у якім стаіць шклянка для хворага Базарава і які даволі доўга абыгрываецца на буйных планах).

«Бацькі і дзеці»—фільм, які многія наведвальнікі праграмы кінагода з задавальненн е м глядзелі паўторна, і, мабыць, не хацелася б надоўга развітвацца з гэтай карцінай. Вядома, фільм быў відным «удзельнікам» дыскусіі на старонках цэнтральнага друку пра экранізацыю класікі. Яго стваральнікі знайшлі пераканальны варыянт, сугучны ўспрыманню сённяшняга гледача. Нарэшце, гэтая работа выявіла даволі высокі ўзровень беларускай кінастудыі, яе падрыхтаванасць да вырашэння складаных, маштабных вытворча-мастацкіх задач.

Пра герояў і час, пра характары і праблематыку, адлюстраваныя іграв ым кіно-84, гаварылася і ў час канферэнцыі, якая завяршыла конкурс. Кіназнавец Н. Фральцова, прынамсі, зазначыла, што ў цэлым накіраванасць прагледжанай праграмы адпавядала сацыяльна-эстэтычным задачам, што ставіць перад мастацтвам Камуністычная партыя. Аднак агульная выснова не абараняе канкрэтныя фільмы ад крытычных стрэл.

На жаль, кінагод-84 нічога яркага не дадаў да стужак на сучасную тэматыку. Новыя фільмы расказваюць пра сярэднестатыстычнага чалавека, прадстаўніка нейкай «сярэдняй» прафесіі. Яны не маюць акрэсленага зыходнага пункту, канкрэтнага адрасата, не могуць плённа ўплываць на эмоцыі і свядомасць сённяшняга гледача. Сацыёлагамі даказана, што сучасныя гледачы — пераважна людзі маладыя, ды ці заўсёды ўлічваюць гэта кінематаграфісты?

У трактоўцы тэмы, герояў многія стваральнікі фільмаў, па словах Н. Фральцовай, паказалі ўласную «сацыяльную атрафіраванасць» — праз гэта пацярпела і якасць карцін. Пра што фільм «Даруй нам, першае каханне»? Аналагічнае пытанне выклікае «Раданіца», дзе таксама лакальны сюжэт не ўзвышаецца да ўзроўню сацыяльна значнай размовы, абагульнення. Да таго ж, дае зусім расплывістае ўяўленне пра асобу галоўнага героя, яго грамадскі статус, яго, у рэшце рэшт, біяграфію. У фільме «Меншы сярод братоў» пэўныя маральныя праблемы героя проста дэкларуюцца. Здымачная ж група, здаецца, пільна займалася не даследаваннем ягонай псіхалогіі, а фіксацыяй натуральных рэалій сённяшняга побыту. Ды скрупулёзнае адлюстраванне знаёмага бытавога асяроддзя само па сабе не мастацкая вартасць, калі з гэтага не вынікае сацыяльна значная думка.

Распрацоўкі глыбокіх пытанняў нашага жыцця, над якімі мы задумваемся штодня ў сям'і, на рабоце, у час адпачынку, даводзіла Н. Фральцова, не адчуваецца ў фільмах мінулага кінагода. Мабыць, на студыі не з'явіўся сцэнарый, які дапамог бы кінематаграфістам паразважаць: куды ж ён ідзе, сённяшні чалавек? Прывычна паўтараць ужо знаёмае, азірацца на мінулае, звяртацца да духоўнага і творчага вопыту старэйшых пакаленняў. А чаму б не паспрабаваць зазірнуць наперад, паразважаць пра тое, што, можа, чакае нас заўтра?

З кожным годам, як слушна заўважалі ўдзельнікі канферэнцыі, усё больш цяжка выбіраць кінематаграфічныя сродкі для ўвасаблення тэмы мінулай вайны. Есць у гэтай галіне велізарны вопыт літаратуры, кіно, мастацтва ў цэлым. Багатыя і праўдзівыя веды дае нам хроніка, лепшыя сённяшнія дакументальныя апавяданні пра Вялікую Айчынную. І якая супярэчнасць паміж гістарычнай праўдай дакументальнага кадра і псеўдапраўдзівасцю некаторых нядаўніх мастацкіх стужак! «Глядзіце на траву», «Апошні крок» здымаліся з добрымі намерамі. А мастацкі грунт саміх намераў?.. Нядобрасумленны паўтор мінулага кінавопыту, няшчырая «гульня ў вайну» на экране.

Так, вядомы гістарычны факт (самаахвярны ўчынак савецкага воіна, які цаной уласнага жыцця выратаваў ад куль нямецкае дзіця і ў гонар якога ўзведзены сімвалічны манумент у Берліне) стаў вытокам спрошчанага сюжэта, прыблізна пазначаных схем-характараў. Подзвіг фармальна заяўлены ў фільме «Апошні крок», а далей? Павярхоўнасць ігры акцёраў. Бутафорская піратэхніка ў так званых батальных сцэнах. Надта знаёмая натура — «зруйнаваны горад» здымаўся на фоне капітальных рэстаўрацыйных работ у мінскім Траецкім прадмесці. Паспешлівы грым на юначым твары «пасталелага» героя — чорныя промнепадобныя лініі «зморшчыны» ў кутках вачэй. Гладкі, дагледжаны з дапамогай касметычных сродкаў, твар жанчыны — савецкай палоннай у канцлагернай вопратцы... Усё гэта абуджае эмацыянальную рэакцыю гледача, аналагічную той, якую выклікае ў чалавека з чуйным слухам фальшыва ўзятыя ноты ў знаёмай музычнай тэме.

Недаравальна рабіць фальшывыя фільмы «на тэму»! Тым больш, як падкрэсліла Н. Фральцова, беларускім кіно назапашаны неблагі вопыт, і ў год юбілею Перамогі па-ранейшаму востра, эмацыянальна гучыць, напрыклад, паўтораны нядаўна па Цэнтральным тэлебачанні серыял «Доўгія вёрсты вайны».

У РАДКАХ «ЛЕТАПІСУ»

Кранальныя лаканічныя кадры пра Юрыя Тарыча (фільм А. Канеўскага па сцэнарыі А. Красінскага). Па-жыццёваму непасрэдная гаворка скульптара З. Азгура, трапна занатаваная на стужцы яго манера звяртацца да субяседніка («Спасціжэнне таямніцы» І. Вейняровіча, сцэнарый Б. Стральцова). Па-рэпарцёрску жвавы і назіральны расказ пра каманду мінскіх гандбалістаў і яе старшага трэнера С. Мірановіча («Гуляючы, вер» У. Цеслюка, сцэнарый С. Новікава)...

А вось 20-мінутная стужка, знятая на аснове кампазіцыі У. Мулявіна «Праз усю вайну» (аднайменны фільм рэжысёра С. Лук'янчыкава па сцэнарыі В. Тараса і П. Якубовіча). Прызнацца, ніякавата ад своеасаблівага «мантажнага эпатажу», калі заспакоеныя (каб не сказаць абыякавыя) твары некаторых салістаў ансамбля «Песняры» імкліва чаргуюцца з паказам кадраў ваеннага часу. Калі гістарычныя і зусім нядаўнія дакументальныя здымкі часам робяцца нейкім візуальным падрадкоўнікам да пазакадравага гучання песень. Або наадварот: сваім урачыста-цырыманіяльным настроем пярэчаць характару музыкі і тэксту... Здаецца, што эклектычнасць фармальных кінасродкаў нават зніжае вядомыя вартасці новай работы «Песняроў». Шкада...

Пра дакументальнае кіно вёў размову на канферэнцыі мастацтвазнавец А. Красінскі. Зазначаў якасныя зрухі ў беларускай кінаперыёдыцы. Дакументалісты ўжо робяцца даследчыкамі пэўных жыццёвых з'яў, цікавяцца не так адметным вынікам пэўнай справы, як буднямі, што яму папярэднічалі. З імкненнем няспешна ўглядацца ў жыццё звязана і нетаропкая, некрыклівая, разважлівая інтанацыя дакументаліста-апавядальніка. Гэты перспектыўны падыход да жыццёвай праблематыкі выявіўся ў фільме «Круглы год» (сцэнарыст і рэжысёр Ю. Лысятаў).

Аднак работы многіх кінадакументалістаў нецікавыя. Чаму сумнымі атрымліваюцца фільмы пра заслужаных, вартых цёплага слова, людзей? Бывае, разважаў А. Красінскі, не кожны перадавік вытворчасці можа зрабіцца героем фільма. Паказ яго ў сюжэце кінахронікі — адно, зрабіць яго героем фільма — можа, і не атрымаецца. Часам дакументалістам не ўдаецца раскрыць на экране цікавую асобу свайго героя. Бо, гаворачы пра сучасніка, яны прымаюць на сябе ролю гэткіх іканапісцаў, якія выяўляюць героя ў арэоле славы, быццам не здаралася няўдач і сцялілася перад ім гладкая жыццёвая дарога. Паўпрэды «Летапісу» актыўна шукаюць, здымаюць герояў дня. Бракуе ж ім творчай смеласці ў адносінах да праблемнага матэрыялу, увагі да негатыўных бакоў нашага жыцця (праявы спажывецкай псіхалогіі, напрыклад), якія трэба ведаць, даследаваць, пераадольваць. І яшчэ—не абмяжоўваюцца стварэннем «заказнога летапісу», здымаць не толькі па слядах падзей, а ўмешвацца ў бег жыцця.

А ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ!

Нашы кінематаграфісты пакуль яшчэ не асвоілі так званую мадэль сямейнага фільма, які дзеці маглі б глядзець разам са старэйшымі, і так ці інакш было б цікава ўсім. Пытанне гэта актуальнае не толькі для беларускай студыі. Актуальнае пытанне і пра свет сучаснага дзіцяці, і пра тое, якім ён падаецца на экране, і які эмацыянальны настрой, які разумовы ідэал нясе фільм маленькаму гледачу.

Ці ёсць у фільмах кінагода-84 герой, які прывабіў і захапіў бы дзяцей? Ацэньваючы сцэнарную аснову фільма «Юрка —сын камандзіра», кінакрытык Т. Цюрына звярнула ўвагу на яго станоўчы патэнцыял. Прывабны «хлапечы» сюжэт: жыццё на пагранзаставе, рамантычнае сяброўства Юркі з мужным і вясёлым байцом... На экране ж — запаволенае, бесканфліктнае відовішча, аморфны сам хлапчук, рэкламна-прыхарошаны сямейны побыт, «кардонныя» дарослыя. У жыцці ж дзеці ўспрымаюць свет дарослых глыбока, чуйна і складана!

Лісяня Людвіг з казкі «Рыжы, сумленны, закаханы...». Гэта заяўка на героя, маленькага Дон-Кіхота, які адзін змагаецца са страшнаю сілай: з мяшчанскім укладам у сям'і, з крывадушнымі парадкамі ў школе, з жорсткімі законамі лесу... Далікатна, рамантычна, прывабна паказаны, як гаварыла Т. Цюрына, узаемаадносіны паміж юнымі істотамі — Людвігам і ягонай сяброўкай, курачкай Тутай.

Цалкам падалося, што новы фільм — не з лепшых кінаказак Л. Нячаева. Дзеянне відавочна расцягнута на дзве серыі за кошт неабавязковых пабочных дыялогаў, манатонных, статычных песенек, «устаўных нумароў», накшталт споведзі савы Ілоны, доўгіх блуканняў героя на ўлонні крымскага лесу, ужо добра знаёмага па фільмах «Прыгоды Бураціна» і «Пра Чырвоную Шапачку».

Казка ж «Восеньскі падарунак феяў», ахарактарызаваная многімі гледачамі як іранічная і журботная гісторыя, звернута, бадай што, да недзіцячай аўдыторыі.

На жаль, у кінадакументалістыцы пра дзяцей і для дзяцей не з'явілася прыкметных набыткаў. Цікавасць выклікаюць, пераважна, кадры, дзе камера назірае за дзятвой—непасрэднай, захопленай нейкімі сваімі жывымі заняткамі.

Зусім засмучаюць «мульцікі», дзе адно толькі шматслоўнасцю і дыдактычнасцю сцэнарыяў (асабліва ў стужках «Хлеб», «Пінчэр Боб і сем званочкаў») разбураюцца добрыя мастацкія намеры. Дый у саміх малюнках, на што звярнуў увагу мастак-графік Г. Паплаўскі, ёсць пластычныя недапрацоўкі, стылявая стракатасць, а то і проста недарэчнасці.

●

Журы конкурсу не мела на мэце вызначаць лепшыя сярод стужак з маркай «Беларусьфільм, 1984 г.». Мэта, падкрэслі ў старшыня Дзяржкіно БССР У. Мацвееў, — вылучыць тых прадстаўнікоў розных кінематаграфічных прафесій, што ўнеслі пэўны ўклад у развіццё беларускага савецкага кінамастацтва.

За найбольш яркі ідэйна-мастацкі ўклад у работу над фільмам памятнымі дыпломамі і прэміямі адзначаны рэжысёр-пастаноўшчык В. Нікіфараў, аператары Н. Суханава і У. Спарышкоў, мастак У. Дзяменцьеў (фільм «Бацькі і дзеці»). У ліку адзначаных таксама рэжысёр мультыплікацыйнага кіно Т. Жыткоўская, рэжысёры-пастаноўшчыкі Б. Сцяпанаў, М. Лук'янаў, мастакі па касцюмах Н. Сардарава, А. Грыбава, грымёр Л. Емяльянаў, гукааператар Б. Шангін, кампазітар Я. Паплаўская, група адміністрацыйных работнікаў студыі. Лепшымі акцёрскімі работамі названы вобраз бабулі Ягорыхі, створаны Г. Макаравай («Дрэвы на асфальце») і Базараў у выкананні У. Богіна («Бацькі і дзеці»). Спецыяльнымі дыпломамі адзначаны дэбюты Ю. Марухіна (рэжысура фільма «Раданіца»), С. Зубікава (аператар, «Даруй нам, першае каханне»), В. Катавіцкага (выканаўца цэнтральных роляў у фільмах «Апошні крок», «Восеньскі падарунак феяў»).

Па раздзеле дакументальнага кіно два асноўныя дыпломы і грашовыя прэміі ўручаны рэжысёрам Ю. Лысятаву (за яркае мастацкае ўвасабленне сельскагаспадарчай тэмы ў фільме «Круглы год») і У. Цеслюку (за яркае ўвасабленне спартыўнай тэмы ў стужцы «Гуляючы, вер»). Спецыяльных дыпломаў за работы, прысвечаныя 40-годдзю Перамогі, удастоены рэжысёры В. Дашук (заключныя стужкі цыкла «У вайны не жаночы твар») і С. Лук'янчыкаў (творчы пошук у рабоце над фільмам «Праз усю вайну»). За прафесійныя дасягненні адзначана спецыяльнымі дыпломамі група творчых і адміністрацыйных работнікаў.

Аддаючы належнае рабоце асобных спецыялістаў над той ці іншай стужкай, нельга замоўчваць ацэнку супольнай працы студыі. Кінагод-84, як зазначалі члены журы, сам па сабе не характарызуе дасягнуты ўзровень і накіраванасць развіцця экраннага мастацтва ў рэспубліцы. Як у кожнай жывой справе, у кінавытворчасці бываюць перыяды ўздымаў і спадаў. Журы адзначала, што многія карціны на гэты раз характарызуюцца неглыбокім асэнсаваннем тэмы, другаснасцю мастацкага ўвасаблення задумы, адсутнасцю творчых пошукаў. Як найбольш чулы кампанент фільма выяўляе драматургічныя і рэжысёрскія выдаткі музыка. Кампазітары і рэжысёры працуюць кожны нібы сам па сабе, а музычная рэдакцыя студыі застаецца ўбаку... Відавочны застой у нашай мультыплікацыі.

У новым годзе, паводле слоў старшыні Дзяржкіно БССР У. Мацвеева, кінастудыя вырашае больш складаныя вытворча-мастацкія задачы, бо сёлета вядзецца і завяршаецца работа над больш складанымі і маштабнымі кінатворамі. Падсумоўваючы абмеркаванне кінагода-84, ён зычыў майстрам і дэбютантам экраннага мастацтва Беларусі творчых поспехаў. Ёсць надзея, што эмацыянальная палітра кінагода-85 парадуе больш разнастайнымі і свежымі фарбамі.

С. БЕРАСЦЕНЬ.

ТАНЕЦ-АГОНЬ

«БАЛЕРО» М. Равеля ў Дзяржаўным тэатры оперы і балета БССР

Гукі маюць колер. У кожнага, вядома, па-рознаму, але нейкія колеравыя асацыяцыі гукі выклікаюць у нас заўсёды. Гэтаксама і колер можа «гучаць». То грозна і трывожна, то пяшчотна і мякка, то радасна, то сумна... І толькі ў сцэнічным, у драматычным відовішчы, дзеянні яны—колер і гук—злучаюцца. Музыка «матэрыялізуецца» ў колеры, форме, лініі. Гэта адбываецца ў балеце. І штораз здзіўляе.

У «Балеро», новай пастаноўцы нашага тэатра оперы і балета, дамінуе чырвоны. Колер барацьбы. Колер крыві і кахання. «Балеро» Марыса Равеля было напісана ў 1929 г. для танца, але хіба гэтая музыка—толькі танец? «Балеро» часта гучыць у праграмах сімфанічных аркестраў, дзесяткі гадоў не сыходзіць са сцэн, нязменна прываблiваючы пастаноўшчыкаў. Твор М. Равеля не старэе. Музыка гэта гіпнатычная, як ёсць штосьці гіпнатычнае ў поглядзе вялікіх чорных вачэй кампазітара на партрэтах.

У самой назве твора быццам чуецца спалучэнне двух колераў: чорнага і чырвонага — як у нацыянальным іспанскім касцюме. Чорная карункавая касынка і пунсовая ружа ў валасах! Каханне, страсць «чулася» на працягу многіх гадоў у «Балеро». І неяк забывалася, што М. Равель напісаў свой — цяпер гэта зрозумела — геніяльны твор у той час, які прынята называць гадамі зараджэння фашызму. У час, калі ўся еўрапейская культура перажывала крызіс, калі свет стаяў на парозе самай жудаснай вайны і быццам прадчуваў яе непазбежнасць. Кампазітар і перадаў у музыцы — свядома або міжволі — жудасную «механічнасць» надыходзячай небяспекі. І ў той жа час — магутны рытм барацьбы, якая «пераломлівае», «пераварочвае» гэты сталёвы ход. Музыканты ведаюць адну з загадак «Балеро», калі на дзевятым «калене» — паўторы музычнай фразы — раптоўна, як выбух — мяняецца танальнасць. І ўсё афарбоўваецца гучаннем трыумфу.

Думаеш: нездарма ў жылах кампазітара цякла іспанская кроў. Яго маці была родам з краіны баскаў — самай вольналюбівай народнасці Іспаніі. Колькі пераплялося і сфакусіравалася ў лёсе гэтай краіны, у лёсе іспанскай рэспублікі! Тут упершыню быў дадзены бой фашызму, які адкрыў тут сваё аблічча, асветленае полымем будучых пажараў. Тут адбылася і прагучала на ўвесь свет трагедыя Гернікі, паказаная таксама вялікім мастаком свайго часу — Пабла Пікасо. Іспанія зрабілася паролем міжнароднай салідарнасці людзей, паролем цэлага пакалення. І пра гэта ў канцы трыццатых напісаў свой верш савецкі паэт Мікалай Забалоцкі. І ў музыцы «Балеро» чулася барацьба, гучала чалавечая салідарнасць перад фашызмам. А такая тэма вымагае і асаблівай пастановачнай інтэрпрэтацыі, суровых і пякучых фарбаў.

...Чырвоная пілотка інтэрбрыгад на дзяўчыне, высветленай промнем з чорнай гушчыні прыцемненай сцэны. Яе постаць, якая застыла ў позе «лотас»,—нібы графічная «застаўка» ўсяго спектакля. Яна адкрывае яго, «задае» пластычны вобраз. І мы адразу разумеем гэты знак — знак Іспаніі, якая змагаецца. Чырвоныя блікі ў глыбіні сцэны — зарыва блізкага пажару. Чырвоныя, крывавыя плямы на абпаленым адзенні байцоў інтэрбрыгад. Чырвонае адзенне самой Іспаніі. І... чорныя бясформенныя нагрувашчанні — быццам цень страшэннага прывіду — на гарызонце. Разгараецца вогненная заслона пажару, расце тое чорнае, злавеснае на гарызонце, а ў кульмінацыі злучыцца чорнае з чырвоным, белая ўспышка на імгненне высветліць «экран» сцэны — і ўсё паглынецца пунсовым агнём.

Танцам агню хочацца назваць «Балеро» — новую работу пастаноўшчыка В. Елізар'ева і мастака Э. Гейдэбрэхта, музычнага кіраўніка Я. Вашчака і балетнай трупы тэатра, прысвечаную байцам-антыфашыстам. З'яўленне менавіта такога спектакля напярэдадні святкавання 40-годдзя Перамогі заканамернае. Бо перамога над фашызмам нараджалася на нашай зямлі. Харэограф, звярнуўшыся да музыкі «Балеро», пераасэнсоўвае традыцыйную трактоўку яе зместу, арыентуючыся на духоўны вопыт чалавецтва, якое перажыло вайну і імкнецца папярэдзіць новую. Прыцягальнасць гэтай творчай работы і ў тым, што напал эмацыянальны яе вельмі высокі. Толькі праз узрушэнне можна сёння гаварыць з гледачом і пра пагрозу сусветнай катастрофы, і пра сілу міжнароднай салідарнасці.

...Ажываюць рукі дзяўчыны-Іспаніі, яе імклівыя, рэзкія ўзмахі-рухі быццам рассякаюць заслону ночы. За ёй паўстаюць усё новыя байцы. Тут людзі розных нацыянальнасцей. Тут маці, сёстры, каханыя. Але ўсе яны адзіныя. Іх цэлы могуць «ператварацца» ў непрыступныя сцены, у баявыя гарматы. І нават калі падае скошаная куляй дзяўчына-Іспанія, баец паднімае і ўзнімае яе, як сцяг. Толькі к фіналу раскрываецца на ўсю сцэну кашмар «Гернікі» П. Пікасо. І — гіне ў сімвалічным агні. Агні гневу і барацьбы.

Як кулямётныя чэргі гучаць ударныя ў моманты самага высокага напружання музычна-сцэнічнай драматургіі. Дырыжор Я. Вашчак «выстройвае» дынаміку партытуры ў адпаведнасці з мастацкай задачай пастаноўкі як драму барацьбы, акцэнтуючы групу ўдарных інструментаў, завастраючы іх гучанне. Гэта выкананне не назавеш педантычным. Яно такое ж эмацыянальнае, як і харэаграфія. Бадай, аркестравая «рэжысура» пастаноўкі «Балеро» такая ж свежая, як і вонкавае аблічча спектакля.

Балетмайстар В. Елізар'еў у многіх сваіх работах развівае тэму проціборства сіл дабра і зла, справядлівасці і насілля. Гэтая тэма гучыць і ў «Стварэнні свету», і ў «Цілі Уленшпігелі», і ў «Спартаку». А ў «Балеро» яна асабліва абвострана, ярка выражана. Новая пастаноўка ўражвае сваёй экспрэсіяй, «спружыннай» імклівасцю развіцця, эмацыянальным уздеяннем на гледача — што для твора такога гучання асабліва важна. Назіраючы за рэакцыяй залы, можна з упэўненасцю сказаць, што раўнадушным гэта невялікая па часе, але ёмістая па змесце харэаграфічная паэма не пакідае нікога.

У «Балеро» некалькі выканаўчых складаў. Кожны артыст надае спектаклю нейкую сваю інтанацыю. Дзяўчына ў І. Душкевіч больш аскетычная, а ў Т. Шаметавец гэты вобраз — па-жаноцку эмацыянальны. Юнак у А. Куркова — парывісты, рамантычны. Ва У. Іванова ён апантаны страсцю бітвы, барацьбы...

«Балеро» гучыць усяго семнаццаць мінут. Але эмацыянальны напал гэтых мінут роўны вялікаму спектаклю. І танцоўшчыкі — усе без выключэння — па-творчы самаадданыя ў гэтым гарачым танцы. А інакш і нельга танцаваць «Балеро».

Т. МІХАЙЛАВА.

НАШ КАЛЯНДАР

23 сакавіка — семдзесят гадоў заслужанай артыстцы БССР Матроне КУЗЬМЕНКА. Працуючы з 1950 г. у Рускім тэатры БССР імя М. Горкага, выступала ў гераічных і характарных ролях. У ліку лепшых яе сцэнічных работ — вобразы Камісара («Аптымістычная трагедыя» У. Вішнеўскага), Клаўдзіі («Песня нашых сэрцаў» В. Палескага), Надзі («Выгнанне блудніцы» І. Шамякіна), Марыі Васільеўны («Толькі адно жыццё» А. Маўзона), Маланні («Дзеці сонца» М. Горкага), Аніссі («Улада цемры» Л. Талстога).

25 сакавіка — 50 гадоў народнай артыстцы БССР Аляўціне КАРЗЯНКОВАЙ. Выпускніца Ленінградскага харэаграфічнага вучылішча, яна да 1977 года была адной з вядучых салістак Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР. Сярод вобразаў, створаных А. Карзянковай на мінскай харэаграфічнай сцэне, Марыя, Натальна («Мара», «Выбранніца» Я. Глебава), Дзяўчына («Пасля балю» Г. Вагнера), Адэта — Адылія («Лебядзінае возера» П. Чайкоўскага), Эгіна і Фрыгія («Спартак» А. Хачатурана) і інш. З 1977 г. выкладае ў Беларускім дзяржаўным харэаграфічным вучылішчы.

27 сакавіка — 75 гадоў з дня нараджэння заслужанай артыстцы БССР Галіны ЦЭПАВАЙ. З 1938 па 1962 г. працавала салісткай беларускай опернай сцэны. Стварыла ў спектаклях Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР вобразы Ганкі («Міхась Падгорны» Я. Цікоцкага), Хрысцінкі («Кветка шчасця» А. Туранкова), Любашы («Царская нявеста» М. Рымскага-Корсакава), Кармэн (аднайменная опера Ж. Бізэ) і інш.

КНІГАПІС



Р. БЯРОЗКІН. Звенні. Творчая індывідуальнасць і ўзаемадзеянне літаратур. На рускай мове. М., «Советский писатель», 1984.

У кнізе выдатнага крытыка Рыгора Бярозкіна «Звенні», якая летась выйшла на рускай мове ў выдавецтве «Советский писатель», — два раздзелы. Першы з іх называецца «Купала, Багдановіч і руская паэзія», другі — «Куляшоў і Твардоўскі».

Кнігу з беларускай на рускую пераклала Юлія Канэ.

К. РОЗАЎ.

АМАТАРАМ ПРЫРОДЫ

Бярэзінскі запаведнік, які знаходзіцца ў паўночнай частцы рэспублікі на тэрыторыі Барысаўскага, Докшыцкага і Лепельскага раёнаў, адзін з першых, які быў арганізаваны ў краіне для аховы і развядзення каштоўных дзікіх жывёл. Ён заснаваны 30 студзеня 1925 года як дзяржаўны запаведнік, а з 1978-га атрымаў статус біясфернага.

З жыццём насельнікаў гэтага запаветнага кутка краю, яго прыродай знаёміць камплект паштовак «Бярэзінскі запаведнік», які выпусціла выдавецтва «Планета». Аўтар здымкаў І. Канстанцінаў.

Г. ЛОСЕЎ.

У ТЭАТРЫ ЧЫТАЛЬНІКАЎ— ПРЭМ'ЕРА

Народны тэатр чытальнікаў «Жывое слова» Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага паказаў гледачам сваю новую работу — інсцэніроўку па аповесці Галіны Шчарбакова «Адважная восень». Твор гэты расказвае аб узаемаадносінах бацькоў і дзяцей, настаўнікаў і вучняў.

У спектаклі заняты студэнты Ірына Забаўская, Юрый Чарэнка, Аксана Ляшчынская, Людміла Янкевіч і іншыя.

У наступным годзе лаўрэат Першага Усесаюзнага фестывалю самадзейнай творчасці працоўных народны тэатр чытальнікаў адзначыць сваё 20-годдзе. За гэты час ім падрыхтавана больш за 25 праграм. Калектыў выступаў у Валгаградзе, Варкуце, Вільнюсе, Гродне, Брэсце. У гэтыя дні ён знаходзіцца на гастролях у Віцебскай вобласці.

У. САЎЧЫКАЎ.

ПРЭМ'ЕРЫ

40-годдзю Вялікай Перамогі прысвяціў сваю новую работу — спектакль па п'есе маладога беларускага драматурга Васіля Ткачова «Сівы бусел» Магілёўскі абласны драматычны тэатр. Пастаноўку ажыццявіў галоўны рэжысёр тэатра А. Дольнікаў, мастак— М. Волахаў, кампазітар—В. Брайлоўскі.

Ролі выконваюць народны артыст БССР С. Бульчык, заслужаны артыст БССР В. Гусеў, артысты Г. Белацаркоўскі, А. Барысава, З. Бурцава і іншыя.

Тэкст і фота М. БЯЛЬКОВІЧА.

У КОЖНЫ ДОМ

Гучаць па радыё словы: «Прэм'ера радыётэатра», і наша ўвага абвастраецца. Якую сустрэчу падорыць нам радыё, з якім драматургам пазнаёміць, галасы якіх акцёраў прагучаць, а галоўнае—аб якіх праблемах пойдзе гаворка?

Нядаўна Беларускае радыё пазнаёміла сваіх слухачоў з новай работай — радыёспектаклем «Злавеснае рэха» паводле аднайменнай п'есы лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР Аляксандра Петрашкевіча ў пастаноўцы Валерыя Анісенкі.

Маючы багаты тэатральны вопыт, В. Анісенка з поспехам прымяняе веды акцёрскай і рэжысёрскай прафесіі на радыё. Ён шчасліва пазбягае распаўсюджанага штампа—беспадстаўнай бадзёрасці, ігры «ўвогуле», гунавой засмечанасці масавых сцэн. У яго спектаклях чуцен кожны герой з усімі адценнямі галасавой палітры. Рэжысёр заўсёды яскрава ўяўляе звышзадачу спектакля і дакладна вядзе акцёраў да яе мастацкага вырашэння.

Радыёспектакль «Злавеснае рэха»—яшчэ адно гэтаму сведчанне. У ім заняты акцёры высокага выканаўчага майстэрства: народная артыстка БССР Марыя Захарэвіч (Паліна), народны артыст БССР Генадзь Гарбук (бацька). Упершыню на радыё ў вялікай рабоце прагучаў голас заслужанага артыста БССР В. Філатава. Можна парадавацца радыёдэбюту гэтага самабытнага тэатральнага акцёра, які, трэба чакаць, парадуе слухача яшчэ не раз. Нечакана прагучаў заслужаны артыст БССР А. Памазан. Цікавы, вострахарактарны тэатральны акцёр (успомнім хоць бы яго пана Быкоўскага ў знакамітай «Паўлінцы»), ён апошнім часам пачынае цікава працаваць і на радыё. Роля Дытрыха Шварцмана—сведчанне несумненнай творчай удачы артыста.

У шырокім творчым дыяпазоне сыграны вобраз Берты—заслужаная артыстка БССР Г. Арлова. Праўдзівая, як заўсёды, артыстка Я. Кавалёва. Крыху спрошчаны вобраз Міхася ў выкананні Ю. Кухаронка. Затое Г. Кухальская, якая выконвала разам з ім некалькі сцэн, смела можа занесці ў свой творчы актыў работу ў гэтым спектаклі.

Асобна хочацца сказаць пра моўную культуру спектакля. І не толькі пра культуру беларускай мовы. У радыёспектаклі гучыць нямецкая мова. Нават пачынаецца спектакль нечакана — сцэна ідзе на чыста нямецкай мове. Для работы над радыёспектаклем быў запрошаны кансультант па нямецкай мове, што сведчыць пра грунтоўную падрыхтоўку ўсёй пастановачнай групы, у тым ліку гунарэжысёра Ю. Букіна і кампазітара А. Залётнева. А ў выніку атрымалася сур'ёзная, глыбокая работа напярэдадні знамянальнай даты—40-годдзя Вялікай Перамогі.

Е. САЗОНАВА.

НА АБСЯГАХ КУЛЬТУРЫ

МЕЛОДЫІ «МІНСКАЙ ВЯСНЫ»

Фестываль мастацтваў «Мінская вясна» прыходзіць у горад-герой у чарговы раз. Ён прысвечаны 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. І таму канцэрты «Мінскай вясны» — гэта перш за ўсё музычныя прэм'еры.

Некалькі іх адбудзецца ў першы дзень фестывалю, які ўрачыста адкрыецца ў аўторак, 2 красавіка, у канцэртнай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Аматары музыкі ўпершыню пазнаёмяцца з араторыяй А. Багатырова «Бітва за Беларусь», канцэртам для скрыпкі з аркестрам Г. Вагнера, сімфанічнымі паэмамі «Прынашэнне свяшчэннаму агню» У. Дарохіна і «Памяць» В. Помазава.

У канцэрце прымуць удзел Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр БССР, Аб'яднаны хор Белдзяржкансерваторыі імя А. В. Луначарскага і Беларускага радыё і тэлебачання, вядомыя выканаўцы — скрыпачка В. Пархоменка, вакалісты В. Кучынскі, Т. Пячынская, С. Машкоў, В. Пархоменка, М. Жылюк, музыкант-рэстаўратар беларускіх музычных інструментаў У. Пузыня.

У чацвер сваё майстэрства пакажуць Дзяржаўны народны аркестр БССР імя І. Жыновіча і Дзяржаўны акадэмічны народны хор БССР. Адбудуцца музычныя прэм'еры — музычная карціна В. Іванова «Салдацкае поле», музычная фрэска Д. Смольскага «Партызанская мадонна», фантазія для аркестра А. Мдзівані «Лянок».

Адбудзецца аўтарскі канцэрт народнага артыста СССР кампазітара Я. Глебава. У праграме — араторыя «Запрашэнне ў краіну маленства», сімфонія «Да міру», фрагменты з балетаў «Маленькі прынц», «Ціль Уленшпігель», святочная ўверцюра.

Аўтарскі вечар заслужанага дзеяча мастацтваў БССР, кампазітара Д. Смольскага пройдзе ў зале камернай музыкі філармоніі.

Мінчане і госці сталіцы пабываюць і на аўтарскім вечары заслужанага дзеяча мастацтваў БССР кампазітара С. Картэса — таксама ў зале камернай музыкі. У гэтай жа зале народная артыстка СССР С. Данілюк выступае з сольным канцэртам.

У праграме фестывалю — канцэрт творчай моладзі рэспублікі, у час якога выступяць лаўрэаты ўсесаюзных, міжнародных і міжрэспубліканскіх конкурсаў М. Мурадзян, В. Полазаў, Г. Забара, А. Сікорскі.

Сярод гасцей — Кіеўскі камерны хор імя Б. Ляташынскага, а таксама вакальна-інструментальны ансамбль Гомельскай дзяржаўнай філармоніі «Сябры». Дарэчы, эстраднай музыцы прадастаўлена сцэна мінскага Акруговага Дома афіцэраў. У вялікім канцэрце сучаснай песні, акрамя «Сяброў» — у адзін з вечароў яны выступяць і з уласнай праграмай, прымуць удзел заслужаныя артысты БССР Н. Багуслаўская, Т. Раеўская, В. Кучынскі, В. Скорабагатаў, вакальна-інструментальны ансамбль «Верасы».

«Мінская вясна-85» — гэта і аўтарскі вечар заслужанай артысткі БССР Н. Багуслаўскай, вечары ансамбляў «Песняры», «Верасы».

Завяршыцца свята 10 красавіка.

Р. ШЫМКЕВІЧ.

ПРАБЛЕМЫ МЕРКАВАННІ

ШЛЯХ — ФАКУЛЬТАТЫЎ

У першым нумары штотыднёвіка за гэты год быў змешчаны артыкул Н. Первяковой «Ці патрэбны Віцьку Моцарт?», які ўзнімаў праблемы выкладання музыкі ў школе, эстэтычнага выхавання школьнікаў. Закранутыя аўтарам пытанні ўсхвалявалі чытачоў — настаўнікаў, выкладчыкаў ВНУ, людзей розных прафесій. Пра гэта сведчылі шматлікія лісты ў рэдакцыю. 1 лютага газета змясціла першыя водгукі. Сёння чытачы працягваюць размову.

ДОБРА, што праблемы, якія стаяць перад савецкай школай, хвалююць не толькі педагогаў, але і ўсю нашу грамадскасць. Яшчэ адно сведчанне гэтага — публікацыя ў газеце «Літаратура і мастацтва» артыкула Н. Первяковай «Ці патрэбны Віцьку Моцарт?» Узняты ў ім важныя, актуальныя пытанні. Хацелася б выказаць і некалькі сваіх меркаванняў.

Так, у школе ўсё залежыць ад настаўніка! І не можа быць апраўдання няведанню свайго прадмета. Ні адсутнасць «дакумента на эксперымент» і патрэбных тэхнічных сродкаў навучання, ні дрэнныя праграмы не з'яўляюцца прычынай таго, што настаўнік блытае Індыю з Італіяй.

Уявім сабе на момант урок гісторыі, дзе блытаюць Кулікоўскую бітву і Лёдавае пабоішча. Каментарыі тут, як кажуць, лішнія. А хіба ж да выкладчыкаў музыкі і спеваў меншыя патрабаванні?

Музыцы належыць вялікая роля ў выхаванні асобы. Вядомы дырыжор Л. Стакоўскі пісаў: «Як ні адзін від мастацтва, музыка здольная закрануць у душы чалавека схаваныя таямніцы. Словамі можна толькі акрэсліваць тыя эмацыянальныя вышыні, якіх дасягае музыка, адчуць іх па-сапраўднаму можна толькі пры дапамозе самой музыкі».

Як не пагадзіцца з Н. Первяковай — карэнных змен у справе выкладання музыкі патрабуе само жыццё, змен не толькі ў праграмах і вучэбных гадзінах, а ў першую чаргу ў адносінах да прадмета з боку настаўнікаў, кіраўнікоў школ і г. д. Такіх «нармальных» урокаў, як апісаны ў артыкуле, не павінна быць. І не толькі ў сталічных школах.

Безумоўна, на праграмы спасылацца лёгка, але хочацца запытаць: няўжо ў рэспубліцы ніхто не працуе творча, мэтанакіравана па дзеючых праграмах? Зрэшты, не выконваць праграму не дазволена нікому, а ўсе эксперыменты павінны праводзіцца ў яе рамках. Бо дзеля чаго тады праграмы зацверджаны Міністэрствам асветы БССР? Для пачатковых класаў складзена нават па два варыянты.

Ці дастаткова сямігадовага навучання музыцы і спевам у школе? На мой погляд, дастаткова. Бясспрэчна, добра было б да 245 гадзін школьнага курса спеваў дадаць і яшчэ, вывучаць музыку ў 8—10 класах. Але давайце пацікавімся ў любога настаўніка (які сапраўды любіць свой прадмет), што ён думае аб колькасці вучэбных гадзін на яго выкладанне. Усе будуць скардзіцца на недастатковасць вучэбнага часу, прапаноўваць уводзіць новыя вучэбныя дысцыпліны ў старэйшых класах. Калі ўвесці музыку ў 8—10 класах, то чаму б у іх не пачаць выкладаць і выяўленчае мастацтва? Чаму б не пашырыць час на вывучэнне беларускай мовы і літаратуры, рускай савецкай літаратуры ў тых жа класах? Нашы ж старшакласнікі, як вядома, і без таго перагружаны. Трэба мець на ўвазе і тое, што «Асноўнымі напрамкамі рэформы агульнаадукацыйнай і прафесійнай школы» своечасова і правільна прадугледжваецца павелічэнне вучэбнага часу на грамадазнаўства і працоўнае навучанне.

Разам з тым усё-такі неабходна больш увагі надавяць ідэалагічнаму, эстэтычнаму і маральнаму выхаванню старшакласнікаў. Якім чынам? Найбольш спрыяльны шлях — праз факультатыўныя заняткі. Вялікую дапамогу тут могуць аказаць факультатывы «Сусветная мастацкая культура», «Гісторыя сусветнай культуры». Для правядзення факультатываў лягчэй знайсці чалавека патрэбнай кваліфікацыі.

У нашай школе пэўная спроба ў гэтым напрамку зроблена. Распрацавана праграма факультатыва «Гісторыя беларускай культуры», вядуцца заняткі. Пры распрацоўцы факультатыва былі выкарыстаны праграмы па гісторыі, літаратуры, выяўленчым мастацтве, музыцы і спевах.

Выкладаючы свой факультатыў, я бачу, што такі курс для школы неабходны. Магчыма, у іншай школе ён будзе інакшы, але — абавязкова па культуры, абавязкова сінтэтычны.

В. ВАБІШЭВІЧ,
дырэктар Арлоўскай СШ Столінскага раёна.

ПАЧЫНАЕЦЦА З УРОКАЎ СПЕВАЎ...

Бясспрэчна: любоў да музыкі мы павінны выхоўваць у дзяцей са школы, ды нават і раней. Пачуццё цудоўнага трэба развіваць з дзяцінства. Музычнае выхаванне спрыяе развіццю лепшых чалавечых якасцей. На жаль, яшчэ даволі часта даводзіцца сустракаць выпускнікоў сярэдніх школ эстэтычна неадукаваных, якія маюць вельмі збедненае, спрошчанае ўяўленне пра мастацтва, паэзію, жывапіс, багатую музычную спадчыну. Яны абыякавыя да сур'ёзнай музыкі — опернай, балетнай, камернай. Тое ж можна сказаць і пра выпускнікоў ВНУ, у тым ліку і педагагічных.

Вопытны настаўнік музыкі Цэнтральнай музычнай школы № 1 Гомеля В. Гузянок мяркуе так:

— Я перакананы, музычная адукацыя — гэта вельмі сур'ёзная праблема. Да слёз бывае крыўдна, калі бачыш, як малады чалавек бясконца слухае музыку заходніх радыёстанцый, перапісвае на магнітафонную стужку маральна шкодныя ўзоры «поп-» і «рок-» музыкі. Манера ж выканання мае дыялектычную здольнасць перарастаць у манеру паводзін, а потым і ў пэўны лад жыцця...

Музыказнавец Н. Первякова правільна спаслалася ў сваім артыкуле на праграму музычнай адукацыі школьнікаў, распрацаваную яшчэ ў 70-х гадах кампазітарам Д. Кабалеўскім. Настаўнікі школ, хоць і ведаюць яе, на практыцы прымяняюць рэдка. Як лічыць старэйшы гомельскі выкладчык музыкі, заслужаны дзеяч культуры БССР, мастацкі кіраўнік камернага хору абласной філармоніі А. Лукомскі, важным сродкам вырашэння праблемы музычнай адукацыі быў бы выпуск новага дасканалага дапаможніка для школ, куды б увайшлі звесткі па гісторыі рускай і беларускай народнай музыкі, а таксама тэатра, жывапісу. Не сакрэт, што веды сучаснай моладзі аб нацыянальным меласе мізэрныя. Хацелася б бачыць у дапаможніку і расказы аб савецкіх кампазітарах, майстрах савецкай песні, папулярных эстрадных ансамблях.

Настаўніку музыкі мала валодаць пэўным інструментам і хоць бы сярэднімі вакальнымі дадзенымі. Ён павінен любіць дзяцей, жыць з імі агульнымі інтарэсамі, быць добрым педагогам і псіхолагам, павінен любіць прыроду і ўмець адкрыць сваім вучням прыгажосць навакольнага свету праз гармонію гукаў.

Праблема падрыхтоўкі вопытных педагагічных кадраў таксама стаіць вельмі востра. Так, напрыклад, у Гомелі сваё прафесійнае майстэрства настаўнікі музыкі павышаюць толькі на курсах пры Гомельскім інстытуце ўдасканалення настаўнікаў.

Урокі спеваў — вось з чаго пачынаецца навучанне. Дзеці павінны слухаць музычныя творы — класічныя, народныя, сучасныя — і з дапамогай настаўнікаў вучыцца разумець іх.

Трэба змяніць у школах стаўленне да ўрокаў музыкі як да другарадных, неабавязковых, тым самым падняць і аўтарытэт настаўнікаў музыкі.

Мікалай БАНДАРЭНКА.
г. Гомель.

У ЧАКАННІ НОВАГА

Чарговыя метадычныя заняткі настаўнікаў музыкі і спеваў Кастрычніцкага раёна г. Мінска пачаліся як звычайна: адкрытым урокам з наступным яго разборам. На гэты раз заняткі скончыліся гарачым абмеркаваннем артыкула Н. Первяковай «Ці патрэбны Віцьку Моцарт?»

Усіх нас хвалюе праграма, па якой мы працуем. Тэрмінова патрэбна новая праграма! Нас хвалююць умовы работы (у раёне з 16 школ толькі 5 маюць кабінеты, але імі адначасова карыстаюцца пры выкладанні якога-небудзь іншага прадмета). Гэта не папрок адміністрацыі школ. Проста, многія школы раёна перапоўнены, таму вельмі цяжка арганізаваць паўнацэнны навучальна-выхаваўчы працэс.

Сёння асабліва актуальна гучаць словы Н. К. Крупскай: «Прафесія настаўніка — адна з самых адказных, самых удзячных. Роля і значэнне гэтай прафесіі будуць усё больш і больш узрастаць». Разам з тым узрастае адказнасць настаўніка перад грамадствам за навучанне і выхаванне падрастаючага пакалення.

Якімі вырастуць нашы выхаванцы? Гэта ж ім, сённяшнім школьнікам, жыць у XXI стагоддзі, быць у адказе за лёс Радзімы. Буржуазныя ідэолагі імкнуцца праз музыку выхоўваць нашу моладзь у духу антысаветызму. Памагчы юнакам разабрацца ў плыні музычнай інфармацыі, развіваць уменне разумець і цаніць высокамастацкія творы і тым самым паставіць надзейную заслону пранікненню ў маладзёжнае асяроддзе безыдэйнасці, пошласці — справа гонару настаўніка музыкі і спеваў.

Даўно наспеў час надаць пэўную ўвагу ўрокам музыкі і спеваў. Але школьніка выхоўваюць не толькі ўрокі, а і пазакласная работа. У кожнай школе ёсць харавы калектыў, але — што спяваць? Новыя таленавітыя песні ёсць. Але не заўсёды знойдзеш іх у нотна-музычнай бібліятэцы. Праўда, у бібліятэцы імя У. І. Леніна ў зале мастацтваў стараюцца памагчы ўсім, чым могуць, але і тут магчымасці невялікія. Відаць, выдавецтвам, іх музычным рэдакцыям трэба быць больш актыўнымі прапагандыстамі дзіцячай музыкі. Музычная літаратура і грамзапісы павінны быць не толькі ў Ленінскай бібліятэцы, дзе з ёй працуеш у зале, але і ў школьных бібліятэках, каб яны сталі верным памочнікам настаўніка музыкі.

Недастаткова ў гэтым плане працуе і фірма «Мелодыя». У базісны магазін вельмі рэдка паступаюць пласцінкі, неабходныя ў нашай рабоце. А калі і паступаюць, то ў невялікай колькасці, што, натуральна, не можа задаволіць патрэбу ў іх многіх настаўнікаў.

Хочацца, каб выдавецтва «Советский композитор», фірма «Мелодия» былі актыўнымі прапагандыстамі той музыкі, што ствараюць для дзяцей рознага ўзросту кампазітары. Тым самым у нас, настаўнікаў музыкі і спеваў, былі б верныя саюзнікі ў справе навучання і выхавання падрастаючага пакалення.

В. АСТРОЎСКАЯ,
кіраўнік метадычнага аб'яднання настаўнікаў музыкі і спеваў Кастрычніцкага раёна г. Мінска.

КНІГАПІС

А. ЛІС. Вечны вандроўнік. Нарыс пра мастака Язэпа Драздовіча. Для старэйшага школьнага ўзросту. Мінск, «Юнацтва», 1984.

«Ён быў самабытным мастаком і цікавым чалавекам...»

Так пачынаецца прадмова народнага паэта Беларусі Максіма Танка да кнігі Арсеня Ліса «Вечны вандроўнік».

Бадай, упершыню ў нас выйшаў аб'ёмны мастацкі нарыс пра жыццё і творчасць прадстаўніка выяўленчага мастацтва. І вельмі паказальна, што кніга гэтая — пра Язэпа Драздовіча, арыгінальнага майстра, які звязаў свой лёс з вызваленчым рухам у царскай Расіі і буржуазна-памешчыцкай Польшчы, супрацоўнічаў з прагрэсіўнымі беларускімі выданнямі, пачынаючы ад «Нашай Нівы».

Са старонак кнігі перад намі паўстае постаць Я. Драздовіча — жывапісца, графіка, скульптара, этнографа, педагога. Ён першы сярод мастакоў не толькі свядома паставіў сябе на службу Беларусі і яе культуры, але і першы пачаў распрацоўку гістарычнай тэмы ў беларускім выяўленчым мастацтве.

Складаны лёс гэтага творцы, драматычны. Арсень Ліс разглядвае жыццёвы і творчы шлях Я. Драздовіча ў цеснай узаемасувязі з сацыяльнымі і палітычнымі рэаліямі самадзяржаўнай Расіі і белапанскай Польшчы, у кантэксце развіцця беларускай культуры, змагання супраць сацыяльнага і нацыянальнага ўціску.

Гэтая кніга дапаможа чытачам — і не толькі «старэйшага школьнага ўзросту» — лепш зразумець значэнне творчасці Я. Драздовіча для развіцця беларускага выяўленчага мастацтва, яго месца і ролю ў гісторыі нацыянальнай культуры.

Кніга, якую афармляў мастак Мікола Купава, ілюстравана дакументальнымі фотаздымкамі, рэпрадукцыямі (на жаль, толькі чорна-белымі) работ Я. Драздовіча.

Р. БЯДАК.

В. ГАРДЗЕЙ. Дом з блакітнымі аканіцамі. Аповесць і апавяданні. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1984.

Паэт Віктар Гардзей выдаў летась сваю першую кнігу прозы «Дом з блакітнымі аканіцамі».

Назву кнізе дала аднайменная аповесць, якая друкавалася ў 1982 годзе ў часопісе «Маладосць»; тады ж яе рэцэнзаваў «ЛіМ». Апрача аповесці, у кнізе змешчаны чатыры апавяданні. Два з іх друкаваліся ў свой час на старонках «ЛіМа».

К. РАСІНСКІ.

...І ЖЫВАЕ КАЗКА Ў ДРЭВЕ

Мінула ўсяго некалькі дзён пасля закрыцця выстаўкі выяўленчага і прыкладнога мастацтва Віцебшчыны, як зала аддзялення Саюза мастакоў зноў запрасіла гледачоў на вернісаж вядучых народных і самадзейных майстроў разьбы па дрэве. Гледачы, якія наведалі выставачную залу, сцвярджаюць, што ўбачылі казку ў дрэве. І гэта сапраўды так.

У экспазіцыі было прадстаўлена больш за трыста твораў дробнай і скульптурнай пластыкі, рэльефныя пласты, утылітарна-дэкаратыўныя вырабы і прадметы побыту, ажурна-рэльефныя дэкаратыўныя кампазіцыі, якія з'явіліся ў апошнія гады (гэты від разьбы, роднасны слаўнай «беларускай разьбе», паступова пачынае адраджацца).

Пры ўсіх відах і спосабах апрацоўкі дрэва павінна заставацца дрэвам. Вось чаму дастойнае месца ў экспазіцыі займаюць самабытныя творы рэзчыка з Оршы С. Шаўрова. Майстар старэйшага пакалення, вядомы гледачу з 1960 года, ён — неаднаразовы ўдзельнік выставак самага высокага рангу. Яго творчасць пачыналася з корнепластыкі, характэрным для майстра было абпальванне драўніны. Цяпер ён шукае сябе ў розных матэрыялах, розных тэхніках выканання. Яго работы выкананы з таполі, асіны, елкі і хвоі. У апошні час тэкстурны малюнак хвойных парод усё больш вабіць майстра. Анімалістычная тэма з'яўляецца любімай у творчасці С. Шаўрова. І гэтая захопленасць яскрава адлюстравана ў работах «Барс», «Лось і ласіха», «Зубр», «Кабан», «Тыгр», «Сава» і інш. Праўда, у апрацоўцы паверхні некаторых твораў мастак празмерна ўжывае лак, што зніжае іх мастацкую вартасць.

У асобную серыю можна аб'яднаць дробныя скульптуркі музыкантаў, танцораў і спевакоў гэтага майстра.

Героі літаратурных твораў таксама знайшлі шырокае адлюстраванне ў яго творчасці. Лепшымі работамі з'яўляюцца «Гусляр», «Сейбіт», «Шчукар», «У суботу Янка...».

Больш за шэсцьдзесят работ у дробнай пластыцы прапанаваў у экспазіцыю адзін са старэйшых рэзчыкаў Полацка А. Міхеенка, які прадстаўляў Віцебшчыну на многіх рэспубліканскіх і ўсесаюзных выстаўках. Яго манера разьбы, гранічна абагульненыя скульптуркі з нязначнай дэталізацыяй узмацняюць вобразнае гучанне твораў. «Лявоніха», «Ціт», «Першае каханне», «Партызан з гранатамі», «Дзед Талаш», «Партызаны», «Паляўнічы», «Шахматы», «Несцерка» ўяўляюць найбольшую цікавасць.

Бытавы жанр у работах вясковай настаўніцы Г. Асіпковай прасякнуты тонкім, добразычлівым гумарам. Кожны персанаж — гэта своеасаблівы вобраз з непаўторным характарам. Яе шматфігурныя кампазіцыі аб'яднаны як сюжэтнай задумай, так і пластычным вырашэннем, якое падпарадкавана адной ідэі. Да лепшых трэба аднесці такія работы, як «Дзядуліны казкі», «Пацеха», «Панас, лаві нас», «Абноўка», «Кум».

Г. АСІПКОВА. Кум.

Самабытнасць творчасці Ю. Халаднова ўжо некалькі гадоў захапляе гледачоў. У яго руках звычайны корань хвойнага дрэва, які праляжаў шмат гадоў у балоце, ператвараецца ў арыгінальную скульптуру. Аўтар выступае ў садружнасці з прыродай. Яго разцу належаць прадстаўленыя на выстаўцы работы «Дэман», «Казка пра папа і яго работніка», «Спявак», «Разведчык», «Сувязная», «Камандзір», «Праваднік атрада». Ваенная тэматыка яму блізкая, бо ён у нядаўнім мінулым кадравы ваенны. Цяпер Ю. Халаднову — вялікі энтузіяст развіцця дзіцячай творчасці ў Полацку. Яго вучні — удзельнікі і прызёры Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі СССР.

Нельга раўнадушна прайсці і міма работ маладога наваполацкага майстра А. Вярыгі. Яго пано ў тэхніцы ажурна-рэльефнай разьбы «Жалейка», «Совы», «Дэкаратыўная птушка» прымушаюць гледача ўважліва прыглядзецца да іх.

Большасць твораў В. Котава — гумарыстычныя. Адпаведныя і назвы — «Як заяц на нешчы капусту вазіў», «Квартэт», «Як баба мужыка прадавала». Аўтар, ствараючы вобразы герояў, пранікае ў іх псіхалогію, стан, і гэта адбіваецца на вырашэнні. У майстра вялікія патэнцыяльныя магчымасці, і трэба спадзявацца, што ў будучым ён парадуе нас сваімі новымі творамі.

Работы народнага майстра з Браслаўскага раёна Б. Лабкоўскага вылучае наіўна-рэалістычнае бачанне. Усё жыццё гэтага чалавека аддадзена зямлі, нялёгкай сялянскай працы. Яго персанажы — сяляне і жывёльны свет. У экспазіцыі мы сустракаем скульптуркі «Селянін», «Карова», «Парася», «Каза», «Сабака», «Лось», «Птушка».

Многія работы на выстаўцы вартыя таго, каб знаходзіцца ў пастаяннай экспазіцыі ў нашых музеях. І верыцца, што так і будзе. Бо гэта створана рукамі тых, хто стаіць каля станка, вырошчвае хлеб, вучыць дзяцей, а ў вольны час творыць цудоўнае.

І. ХІЦЬКО,
старшы выкладчык мастацка-графічнага факультэта Віцебскага педагагічнага інстытута імя С. М. Кірава.

А. ШЫШАНКОЎ. Вёсачка.

ФАНТАЗІЯ І МАЙСТЭРСТВА

Калі б некалькі гадоў назад Галіне Шацкай сказалі, што будзе працаваць мастаком па пляценні з саломкі, яна палічыла б гэта жартам. Але яна стала мастаком Брэсцкай фабрыкі сувеніраў. І менавіта па пляценні з саломкі.

У нейкай ступені Галіна была падрыхтаваная да гэтага. У дзіцячым узросце ў вольны час выпільвала лобзікам па дрэве, здзіўляючы гэтым не дзявочым заняткам сваіх сяброўак. Любіла маляваць, і гэтае захапленне дапамагло ёй паступіць і закончыць Мінскі архітэктурна-будаўнічы тэхнікум. У гады вучобы па-ранейшаму малявала, у дадатак займалася інкрустацыяй. Мастакоўскія схільнасці і прывялі яе на фабрыку сувеніраў.

Але з саломкай як матэрыялам для мастацкіх вырабаў Г. Шацкая знаёма не была. Надарылася аднойчы, праўда, дакрануцца да твораў «саламяных спраў» майстра. Прыехаўшы неяк у сваё сяло на Гродзеншчыне, Галіна на гарышчы бацькоўскага дома знайшла саламяную шкатулку. З цікаўнасці распляла яе, падзівілася багацтву фантазіі, умелым рукам невядомага майстра.

Але вось лёс прывёў Галіну ў Брэст. Яна ўладкавалася на работу на фабрыку сувеніраў. А праз два месяцы прынесла на прадпрыемства куфэрачак уласнай работы з саломкі. Усе анямелі: быў ён незвычайна прыгожы. Потым кожная новая работа Галіны пацвярджала думку, што адкрыты новы талент, які зробіць нямала цудоўных узораў сувенірных вырабаў з саломкі.

Зробленыя ёю ўзоры захоўваюцца ў асартыментным кабінеце прадпрыемства. Гэта своеасаблівы музей народнай творчасці, у якім работы мастака Г. Шацкай прыцягваюць увагу кожнага наведвальніка. Яны арыгінальныя, самабытныя, у іх шмат фантазіі і сапраўднага майстэрства. Некаторыя унікальныя, прызнаны творамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Салому з даўніх часоў выкарыстоўвалі нашы продкі: плялі патрэбныя ў гаспадарцы асміны для захоўвання збожжа, капелюшы, шкатулкі, іншыя рэчы, якія аздаблялі жыллё і... жыццё. Але паступова старажытны від народнай творчасці стаў забывацца, прыйшоў у заняпад. Брастаўчанцы Веры Ільінічне Гаўрылюк выпала на долю адрадзіць яго ў вобласці, навучыць і далучыць да гэтай справы многіх.

Галіна Шацкая, вядома ж, знаёмая з мастаком фабрыкі сувеніраў Верай Ільінічнай, з яе метадамі пляцення, з распрацаванымі ёю ўзорамі сувеніраў з саломкі.

— Мне гэта дае вельмі шмат для творчага росту,— расказвае Галіна.— Але ў творчасці нельга ісці па ўжо пройдзеным шляху. Вера Ільінічна больш працуе над стварэннем мастацкіх народных вырабаў. У мяне ж пераважна рэчы ўтылітарныя: куфэрачкі, шкатулкі, рамкі для фотаздымкаў, вазы, сумкі, капелюшы... Але ёсць і казачныя матывы...

Сапраўды. Вось «Хатка на курынай ножцы». Тут выкарыстаны розныя матэрыялы. Сцены — з чароту, сама ножка — з саломы, дах — з вымачаных каласоў. Не хатка — дзіва!

Вельмі сімпатычны бусел у капелюшы. Але галоўнае ўсё ж — утылітарныя рэчы. Яны вельмі эфектныя. Прыгожая вітая пляцёнка: ромбавідныя выпуклыя ўстаўкі ствараюць гульню залацістых блікаў, а буйныя рэльефныя жгутавыя накладкі надаюць работам асаблівую прыгажосць.

Не ўсе з гэтых узораў запушчаны ў вытворчасць. Некаторыя існуюць пакуль у адным або двух экземплярах. Пасля зацвярджэння мастацкім саветам будуць асвоены і яны. А потым трэба падрыхтаваць работніц, навучыць новым спосабам пляцення, тэхналогіі вырабу сувеніраў. Іх вучыць сама Галіна Шацкая.

...Пальцы жанчыны няўлоўнымі рухамі ператвараюць саламяныя сцяблінкі ў пляцёнкі. Пакуль што цяжка сказаць, які выраб атрымаецца. Гэта ведае толькі сама Галіна. Але, думаецца, будзе гэткі ж арыгінальны твор, як і ўсе папярэднія.

У. МАЛАШЭУСКІ.
Фота С. САСОННАЙ.

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

ГЕРОЙ БАЛАДЫ

Герой Савецкага Саюза Г. Палаўчэня.

Калі я ўпершыню ўбачыў гэты дакумент, дык доўга не мог адарвацца ад яго. Лістоўка, надрукаваная вясной 1942 года, вельмі зацікавіла мяне. Вось яе змест:

«Маёр Гаўрыла Антонавіч Палаўчэня вёў танкі на Андрэапаль (горад у Калінінскай вобласці. — Ул. С.). Стаяў моцны мароз. Снегу было так многа, што лёгкія танкі вязлі на цаліне. Галаўны танк Палаўчэні зайшоў далёка ўперад. Вось і першая вёска. Вуліца запруджана варожымі аўтамашынамі, павозкамі, палявымі кухнямі. Суцэльны заслон. Танк зрабіў паўразварот на месцы, на хвіліну-другую спыніўся, як бы рыхтуючыся да скачка, і рвануўся. Немцы кінуліся з лямантам ва ўсе бакі, машыны наскоквалі адна на адну, коні ўзнімаліся на дыбы...

Вёска засталася ззаду. Наперад! Наперад! Сярод пустыннага поля паказаліся два батальёны немцаў. Танкісты выстралілі па іх з гарматы ва ўпор. Тое, чаго не паспела зрабіць гармата, завяршылі кулямёты і цяжкія гусеніцы.

Нечакана аднекуль зусім блізка ўдарыла нямецкая супрацьтанкавая гармата. Снарад прабіў бензабак. Гаручае стала выцякаць. Матор пачаў глохнуць. Вадзіцель уключыў другі сілкавальны бак і хацеў развярнуцца, але ў гэты час з укрыцця з'явілася дзесяткі два варожых салдат. Немцы абляпілі машыну, як мухі. Некаторыя з іх залезлі на вежу і закрылі глядзельную шчыліну.

— Тут недзе блізка павінны быць нашы, — сказаў Палаўчэня. — Будзем трымаць шлях да іх.

Немцы, убачыўшы, што танкісты не здаюцца, прыцягнулі брызент, прамочаны гаручым. Яны накінулі яго на вежу танка і падпалілі. Едкі дым пачаў пранікаць унутр машыны, хутка напальвалася браня...»

Аб тым, што было далей, расказаў сам Гаўрыла Антонавіч Палаўчэня ў час нядаўняй сустрэчы.

— Я загадаў вадзіцелю павярнуцца ў поле і прыбавіў хуткасць. Разлічвалі на тое, што паветраны паток скіне палаючы брызент. Але ён працягваў гарэць. Нарэшце з'явіўся прасвет у глядзельнай шчыліне.

Танкісты заўважылі, як зусім блізка, на шляху танка, рулічыць хуткасць і адкрыць агонь. Экіпаж танка — рускі Мікалай Пушкарскі, украінец Васіль Бандарэнка і яўрэй Давыд Гольцман — у гарачыні і дыме працаваў зладжана. Танк хаўся батальён варожай пяхоты.

— Асколачным, — скамандаваў Палаўчэня.

Гольцман выстраліў з гарматы, а сам камандзір прыпаў да кулямёта, даў доўгую чаргу.

— Гусеніцамі, — падказаў ён вадзіцелю.

Вогненны танк урэзаўся ў калону.

І зноў наперад. Вецер, нарэшце, сарваў брызент. Танк спыніўся. Палаўчэня адкрыў люк, прыслухаўся і пачуў рускую мову. Цяпер яны былі сярод сваіх.

На наступны дзень капітана Палаўчэню выклікаў камандуючы артылерыяй 4-й ударнай арміі генерал Хлебнікаў.

— У горадзе Андрыапалі фашысты рыхтуюцца да адпраўкі ў Германію савецкіх грамадзян і нарабаванай маёмасці. Трэба не дапусціць гэтага. Пажадана, каб вы самі ўзначалілі аперацыю.

Капітан вырашыў выканаць гэтую задачу двума экіпажамі танкаў. Але на падыходзе да горада машына камандзіра праламала лёд і загразла ў невялікай рэчцы. Што рабіць? Як выйсці з танка? Праз дэсанцкі люк не вылезеш — машына ў вадзе. Праз верхні люк—і думаць нельга: вакол немцы.

Надыходзіў вечар. Неўзабаве савецкія танкісты пачулі нямецкую гаворку. Баючыся падысці да танка, гітлераўцы абстралялі яго з гарматы.

— На агонь не адказваць, — шэптам папярэдзіў Палаўчэня. — Хай думаюць, што мы пакінулі танк...

Тым часам у небе паказаліся нямецкія самалёты. Яны скінулі некалькі бомбаў. Але машына па-ранейшаму маўчала.

ПОШУКІ ЗНАХОДКІ

Міфы і рэальнасць

Яшчэ раз пра аўтарства паэмы «ТАРАС НА ПАРНАСЕ»

Не дае спакою ананімная паэма «Тарас на Парнасе» нашым крытыкам і даследчыкам. Цэлую манаграфію прысвяціў ёй Генадзь Кісялёў. У сваёй кнізе «Пошукі імя» з уласцівай яму дакладнасцю і дасведчанасцю ўсебакова разгледзеў дэталі зместу паэмы, яе найдрабнейшыя рэаліі. Здавалася б, што ён зрабіў немагчымае і сказаў больш, чым можна было б. І тым не менш пра аўтара твора мы і сёння нічога не ведаем. Ці не таму, што на працягу многіх дзесяцігоддзяў мы трымаемся за нейкія стэрэатыпныя меркаванні, якія сябе не апраўдваюць, але лічацца агульнапрынятымі і зыходнымі пры ўсіх далейшых разважаннях?

Мы прывязваем паэму да 40-х гадоў XIX ст. (у апошні час — да 50-х) і толькі ў гэтым перыядзе шукаем яе аўтара. Невядома, чый радок «Як Гогаля у прошлым леце» даў падставу адносіць твор да 1837 або 1843 года. А між тым у першай публікацыі сказана: «Як Гогаля у прошлым веку» (трэба думаць — у мінулым, зямным жыцці).

Рабіць канчатковыя вывады на падставе тых ненадзейных слоў нельга і з іншай прычыны. Калі ўважліва ўчытацца ў змест паэмы, то можна заўважыць, што аўтар адносіць падзеі, апісаныя ў ёй, да нейкага неакрэсленага, даўно мінулага часу. І гэта адзначаецца двойчы — у самым пачатку і ў канцы твора.

Пачынаецца паэма словамі:

Ці знаў з вас, браццы, хто Тараса,
Што ў палясоўшчыках ён быў?
На пуцявішчы ля Панаса
Ён там ля лазні блізка жыў.

Так звычайна гавораць пра людзей, якіх ужо няма на зямлі або якія даўно некуды зніклі. Мы даведваемся толькі, што Тарас «быў» і «жыў». А колькі часу таму назад — невядома.

У канцы твора мы зноў чытаем:

Так во што відзеў наш Тарас,
К багам узлезшы на Парнас.
Ён мне ўсё гэта расказаў,
А я ў паперку запісаў.

А калі расказаў? Праз колькі часу пасля саміх прыгод — не ўдакладняецца. Але аб тым, што прайшоў нейкі час, сведчаць і такія радкі:

З тых пор Тарас уж не хадзіў
Так дужа часта па барам,
А чыраз тое не шкадзіў
Бярвення красці ён варам.

Так вызначаецца неабмежаваная адлегласць у часе паміж самім здарэннем і паведамленнем аб ім. Гэты перыяд у адношках ступені мог вымярацца гадамі і дзесяцігоддзямі. Але ясна, што ўсе тыя падзеі даўно мінулі.

Хтосьці пусціў у свет легенду, быццам паэма пасля свайго нараджэння шырока распаўсюджвалася ў рукапісах. А кім і дзе гэта засведчана? XIX стагоддзе пакінула нам розныя варыянты адных і тых самых друкаваных і рукапісных твораў. «Энеіда навыварат» называлася ўпершыню яшчэ да яе публікацыі. Да нас дайшлі не толькі рукапісныя, але і тры друкаваныя варыянты «Павіншавання бондара Савасцея» (1844, 1867, 1869 гг.). Захаваліся розныя тэксты «Гутаркі Данілы са Сцяпанам», верша «Вясна» («Вясна гола перапала»). А вось «Тараса на Парнасе» або якіх-небудзь спасылак на яго мы не знаходзім не толькі ў 40-я, але нават і ў 80-я гады, аж да самага дня яго публікацыі.

Чаму так здарылася? Можа, збіральнікі фальклору і аматары беларускага мастацкага слова не ўмелі ацаніць твор? Дык чаму ж паэма пасля 1889 г. столькі разоў перадрукоўвалася і перапісвалася? Застаецца адно меркаванне: была яна напісана не ў 30—50-я гады, а недзе ў 70—80-я і захоўвалася ў аўтара.

У свой час ужо рабіліся спасылкі на тое, што ўсе пералічаныя пісьменнікі ідуць «з таго свету». Найпазней з іх памёр Грэч, аж у 1867 г. Затое ж не называюцца класікі тагачаснай літаратуры, якія яшчэ жылі. Звярталася ўвага і на тое, што тут і ў паміне няма прыгоннага ладу, хоць на Парнасе ўсё адбываецца так, як у заможнай сялянскай хаце. У той жа час у «Энеідзе навыварат» паншчына называлася шмат разоў.

Задача гэтага артыкула не ў тым, каб паўтараць тое, што ўжо гаварылася. Проста ўзнікла неабходнасць і магчымасць пашукаць нетрадыцыйны падыход да паэмы. Настаў час задаць пытанне: а ці не пакінуў яе аўтар іншых твораў, якія былі б блізкімі паводле стылю, формы, духу? І зыходзіць пры гэтым з меркавання, што паэма магла нарадзіцца нават і ў 80-я гады.

Якая мастацкая асаблівасць паэтычнай структуры і стылю «Тараса» (такі быў загаловак першай публікацыі) кідаецца адразу ж у вочы, нават пры самым павярхоўным знаёмстве з ім? Звяртае на сябе ўвагу наяўнасць апавядальніка, які з гумарам балагурыць пра нейкія незвычайныя падзеі. Ёсць у яго апавяданні нешта ад традыцыйнай гутаркі, быліцы, гавэнды, сказа, а таксама і ад літаратурнай паэмы. Звяртаючыся спачатку да ўяўных слухачоў («Ці знаў з вас, браццы, хто Тараса...»), аўтар затым як быццам хаваецца за свайго героя, перадаваючы яму весці гутарку з чытачом. І хоць сам апавядальнік — лірычны герой — на нейкі час знікае з поля зроку тых, каму апавяданне адрасуецца, аднак прысутнасць яго адчуваецца амаль на кожным кроку. Палясоўшчык месцамі быццам нічога не ведае (і хто такі курчавы хлапчынка з лукам «запліч», і «што за шатан такій Парнас», і што за крыкуны ціснуцца з паўнюсенькімі мяхамі), ён гаворыць толькі тое, што бачыць: «тоўсты, як чурбан, плюгавы, дужа ня прыгожы» і г. д. А ў іншых месцах аказваецца, што ён усё ведае: сам пералічвае рускіх пісьменнікаў — Пушкіна, Лермантава, Жукоўскага, Гогаля, — а на Парнасе называе ўсіх багоў (сабраўшы ў адно месца і рымскіх і грэчаскіх).

Ці няма ў беларускай літаратуры другой палавіны XIX ст. іншых твораў, дзе б галоўную, арганізуючую ролю адыгрываў таксама апавядальнік-гумарыст? Ёсць, прытым не адзін: «Панскае ігрышча» («Каб ты ведаў, брат кумішча, што ўчора відзеў я...»), «Саўсім не тое, што было» («Я стар, нядуж, саўсім сівею... А раскажу я, што сумею, бо, дадушы, век свой не лгаў»), «Ён і яна» («На тройцу, звычай, як у свята, пад'еў сабе і ўздумаў спаць, аж чую, загаманіў тата: «Ідзі пшчол панскіх пільнаваць!»).

У кожным з гэтых твораў апавядальнік выступае ў новай ролі. Гэта не бязлікі герой, задача якога зводзілася б толькі да абмалёўкі нейкіх падзей, а жывы чалавек, са сваёй рэакцыяй на ўсё, што адбываецца вакол яго, са сваім жыццёвым вопытам. Адзін раз перад намі выступае стары, нядужы, сівы лёкай, у якога доўгая служба выпрацавала ўменне назіраць і параўноўваць звычкі розных паноў, характарызаваць змены ў іх норавах («Саўсім не тое, што было»); іншы раз — юнак, што яшчэ толькі пачынае сваю службу пры панах і таму шмат чаму здзіўляецца («Ён і яна»). Служыць у паноў і Тарас-палясоўшчык. Але побач з усімі гэтымі героямі — дарослымі і юнакамі — адчуваецца наяўнасць некага больш дасведчанага, адукаванага — чалавека, які ўмее дакладна перадаць нават дыялогі на чужых мовах.

Дзіўным збегам акалічнасцей гэтыя вершаваныя апавяданні сталі вядомы чытачу ці толькі збіральнікам помнікаў беларускай пісьменнасці прыблізна ў адзін і той жа час. «Тарас» і «Панскае ігрышча» як ананімныя творы былі апублікаваны ў 1889 г. (першы з іх — у газ. «Минский листок», другі — у «Виленском вестнике»). «Саўсім не тое, што было», а таксама «Ён і яна» трапілі ў славутую рукапісную хрэстаматыю Браніслава Эпімаха-Шыпілы ў 1890 г.

Ёсць яшчэ адзін ананімны твор, у якім просты селянін у гумарыстычнай форме апавядае пра свае незвычайныя прыгоды ў горадзе. Гэта — вершаванае апавяданне «Тэатр». Сёння цяжка было б уявіць сабе, што ў беларускай літаратуры канца XIX ст. раптам з'явіліся два ці тры паэты-гумарысты, такія блізкія духам, стылем, мастацкай манерай, асаблівасцямі светаўспрымання. І зусім заканамернай можна лічыць думку, што напісаў іх адзін і той самы чалавек — Фелікс Тапчэўскі, або Хвелька з Рукшэніц.

Думка не новая. Але яе ніхто дастаткова сур'ёзна не ўспрымаў. Генадзь Кісялёў у сваёй кнізе «Пошукі імя» паведаміў і пра гэтую версію: «Намер звярнуцца па разгадку непасрэдна да самога Тапчэўскага можа выклікаць усмешку... Сапраўды, паміж Тапчэўскім і аўтарам нашай паэмы («Тарас на Парнасе». — **У. К.**) шмат агульнага. На блізкасць іх творчых манер указвалі такія даследчыкі, як Сцяпан Майхровіч, Міхась Ларчанка, а ў апошні час Міхась Лазарук. Пытанне, ці не мог Фелікс Тапчэўскі быць аўтарам «Тараса на Парнасе», зусім правамернае. Творчасць Тапчэўскага звязваецца звычайна з апошняй чвэрцю мінулага стагоддзя, але цяпер высветлена, што паэт нарадзіўся ў 30-х гадах, г. зн. пачатак яго творчай дзейнасці мог адносіцца да 50-х гадоў, якраз, калі ўзнікла наша паэма. Іншая справа, ці мог ён са сваёй параўнальна невялікай адукацыяй (ён скончыў Лепельскае павятовае вучылішча) у правінцыяльных умовах узняцца да такіх вышынь культуры, якая, відавочна, характарызуе аўтара нашай паэмы. Зрэшты, жыццяпіс Тапчэўскага, яго акружэнне мы ведаем вельмі слаба, таму даваць канчатковы адказ на пытанні, якія нас цікавяць, яшчэ зарана» («Пошукі імя», с. 202).

Для Г. Кісялёва гэта — адзін з варыянтаў, кожны з якіх можа аказацца праўдзівым. На

Тады асмялелыя фашысты вырашылі выцягнуць савецкі танк з вады: Замацавалі тросы і цягачом завалаклі машыну на тэрыторыю былога фарфоравага завода. Зачынілі вароты і паставілі ля іх вартавога.

А раніцой Палаўчэня гучна скамандаваў:

— Поўны наперад!

Праламаўшы плот, «Т-34» выбраўся на волю. Да чыгункі было не больш чым 700—800 метраў. Там стаяў варожы эшалон. Бачнасць была выдатная.

— Колькі ёсць бранябойных? — запытаў Палаўчэня.

— Дзевяць.

— Трэба разбіць паравоз.

Шосты снарад перакуліў паравоз. Пакуль экіпаж капітана вёў бой, падышлі іншыя танкі. І разам з імі Палаўчэня пайшоў на Андрэапаль.

Подзвіг Г. А. Палаўчэні і яго экіпажа стаў шырокавядомы на фронце. Паэт Міхаіл Матусоўскі напісаў «Балладу о капитане Половчене», якая 1 лютага 1942 года была надрукавана ў «Красной звезде».

Радзіма па заслугах адзначыла подзвіг гераічнага экіпажа. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 5 мая 1942 года Гаўрылу Антонавічу Палаўчэню было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Урадавыя ўзнагароды атрымалі і астатнія члены экіпажа.

І нарэшце кароценькая біяграфічная даведка. Нарадзіўся Г. Палаўчэня ў 1907 годзе ў вёсцы Ляскі Старадарожскага раёна ў беднай сям'і. Скончыў 7 класаў Языльскай школы, курсы малодшых камандзіраў. Удзельнічаў у вызваленні Заходняй Беларусі, у фінскай кампаніі.

Вайну з фашыстамі прайшоў ад першага да апошняга дня. Дзень Перамогі сустрэў у Венгрыі.

Цяпер Герой Савецкага Саюза Палаўчэня ўжо больш як 20 год жыве ў горадзе Нікалаеве. Там доўгі час працаваў інжынерам на Чарнаморскім суднабудаўнічым заводзе. У г. Андрыапалі былая Вакзальная вуліца, на якой некалі адважныя танкісты вялі бой, названа імем Палаўчэні. Гаўрыла Антонавіч — ганаровы грамадзянін гэтага горада.

У. САЗАНОВІЧ,
удзельнік Усесаюзнай экспедыцыі «Летапіс Вялікай Айчыннай вайны».

ВІНШУЕМ

Міколу ВІШНЕЎСКАМУ~75

Пісьменніку Мікалаю Вішнеўскаму 28 сакавіка споўнілася 75 гадоў. З гэтай нагоды праўленне СП Беларусі накіравала юбіляру прывітальны адрас, у якім гаворыцца:

«Дарагі Мікалай Аляксеевіч!

Мы, Вашы сябры і калегі, рады шчыра павіншаваць Вас з 75-гадовым юбілеем!

Вы нарадзіліся ў рабочай сям'і і самі рана далучыліся да працы. Святло Вялікага Кастрычніка, якое зазірнула і ў акенца Вашай хаты, паклікала Вас да вучобы. Скончыўшы Беларускі педагагічны тэхнікум, Вы апынуліся на ніве савецкага друку — працавалі ў старэйшай нашай газеце «Звязда». Калі доўгачаканая свабода завітала і на заходнебеларускія прасторы, Вы атрымалі адказнае даручэнне па арганізацыі абласной «Сялянскай газеты».

У Вялікую Айчынную вайну Вы служылі ў будаўнічым батальёне Чырвонай Арміі, пасля ў рэдакцыях франтавых выданняў «За свабодную Беларусь» і «Партызанская дубінка». Неўзабаве Вас адклікалі ў рэдакцыю рэспубліканскай газеты «Савецкая Беларусь». Звязаўшы рана свой лёс з беларускім савецкім друкам, Вы не пакідалі яго і ў пасляваенныя гады — працавалі ўласным карэспандэнтам «Звязды», а потым намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Сельская гаспадарка Беларусі».

Апублікаваўшы першае апавяданне перад самым пачаткам вайны, Вы праз усе гады пранеслі вернасць аператыўным жанрам прозы — апавяданню і нарысу. Асобнымі выданнямі выйшлі нарысы пра вядомых працаўнікоў сельскай гаспадаркі, зборнік апавяданняў «Скарб зямлі». Шмат творчай энергіі Вы аддалі супрацоўніцтву ў перыядычных выданнях, як нарысіст, і ў навукова-папулярным кіно, як сцэнарыст.

Ваша старанная праца адзначана ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі.

Віншуючы Вас, дарагі Мікалай Аляксеевіч, з юбілеем, жадаем Вам яшчэ многіх гадоў актыўнага жыцця на карысць нашага грамадства!»

Супрацоўнікі штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» шчыра далучаюцца да гэтага віншавання.

У КНІЗЕ ЎСПАМІНАЎ

Да 90-годдзя з дня нараджэння вядомага ўкраінскага паэта выдавецтва «Советский писатель» выпусціла кнігу «Успаміны пра Максіма Рыльскага», у якой змешчаны згадкі больш як пяцідзесяці літаратараў. Гэта Мікалай Ціханаў, Паўло Тычына, Аляксандр Пракоф'еў, Антанас Венцлава, Карней Чукоўскі, Сіман Чыкавані, Уладзімір Сасюра, Грант Багразян, Платон Варанько, Мікола Нагнібеда і іншыя.

У кнізе ёсць і ўспаміны беларускіх пісьменнікаў. Друкуюцца артыкулы Петруся Броўкі «Жыццялюб» і Янкі Брыля «Культура і душа».

М. ВІЦЮК.

маю ж думку, іменна гэты варыянт з'яўляецца найбольш верагодным, і на карысць Ф. Тапчэўскага можна набраць больш аргументаў. У першай публікацыі паэмы ёсць зноска, у якой, у прыватнасці, сказана: «Говор Витебской губ.». Такім чынам, сваім паходжаннем твор звязваецца з Віцебшчынай, адкуль, як можна меркаваць, рэдакцыя і атрымала паэму. Як вядома, Ф. Тапчэўскі паходзіў з Віцебшчыны, а ў канцы 80-х — пачатку 90-х гадоў працаваў у маёнтку Ухвішча на Полаччыне. Галоўным героем такіх твораў, як «Тарас на Парнасе», «Саўсім не тое, што было», «Ен і яна», з'яўляецца слуга. Паміж паэмай «Тарас» і вядомымі творамі Ф. Тапчэўскага выяўляецца моўнастылявая агульнасць і структурна-кампазіцыйнае падабенства, на што ўжо даўно звярнулі ўвагу даследчыкі. Але рашуча і ўпэўнена прыпісаць іх аднаму аўтару ніхто не адважваўся, таму што лічылася, быццам «Тарас на Парнасе» ўзнік ці то ў 1837, ці то ў 1843 г., а Ф. Тапчэўскі пісаў у канцы XIX ст. Аднак гэты аргумент аказваецца вельмі непераканаўчым.

Кідаецца ў вочы, напрыклад, наяўнасць блізкіх выразаў: «Авохці мне, як тут прыгожа!» («Тарас»); «Авохці мне! была прыгожа, такой не відзеў дадушы» («Ен і яна»); неаднаразова ўжываюцца такія спецыфічныя словы, як «дадушы», «разініш» (рот або ляпку) і інш.

Усе даследчыкі аднадушна падкрэсліваюць высокі мастацкі ўзровень паэмы. Але такой, якой мы яе ведаем сёння, яна стала, прайшоўшы праз сотні рук. Кожны выдавец і рэдактар шліфаваў яе, як хацеў і як умеў. У першым жа варыянце мы назіраем недакладнасці вершаванага памеру, перабоі рытму, парушэнне рыфмаў, а то нават і іх адсутнасць. Сустракаюцца там і выразы, якія потым шматлікія рэдактары замянілі новымі, больш мілагучнымі ці зразумелымі. Вось толькі адзін прыклад. У радках: «Памалу, браццы, не давіце маёй хвілятывай пчалы» незразумелы прыметнік «хвілятывай» ператварыўся ў назоўнік «фельетон». Слова «хвіля», як сведчыць слоўнік І. Насовіча, значыць «бура», «моцная сварка». А ці не ў значэнні «сварлівай» ужываецца эпітэт «хвілятывай»? Тут больш дакладна і правільна павінны адказаць дыялектолагі і даследчыкі мовы XIX ст. (а можа, нават і жыхары Віцебшчыны).

Першы апублікаваны варыянт паэмы з боку тэхнікі верша значна ўступае паасобным творам беларускай паэзіі XIX ст. Яна нагадвае імправізацыю — у такой ступені яна неадшліфаваная, неадгладжаная, шурпатая. Адразу відаць, што ў аўтара былі нейкія веды, жаданне пісаць, творчая фантазія і гумарыстычны погляд на свет. Але яшчэ адсутнічалі практычныя навыкі, каб адчуць сябе сапраўдным паэтам і смела выходзіць са сваім творам у людзі.

Але выходзіць у людзі ён меў усе падставы. Есць у паэме такія творчыя знаходкі, якія робяць яе наватарскай, забяспечваюць ёй трывалае месца ў гісторыі беларускай літаратуры, адкрываюць дарогу для новых творчых пошукаў, характэрных ужо для XX стагоддзя. Незвычайным ужо з'яўляецца сумяшчэнне дзвюх эпох — сучаснай аўтару, паказанай у рэальным плане, і антычнай, прадстаўленай багамі ды і гарой Парнас, на якую Тарас трапляе са свайго лесу. І характэрна, што ў тых багоў на першы план як быццам выступаюць іх прыроджаныя звычкі і рысы, замацаваныя за імі міфалогіяй. І ў той жа час яны нагадваюць сучасных аўтару сялян.

А калі прачытаць тэкст паэмы больш уважліва, то можна пераканацца, што ў ёй адлюстроўваюцца не дзве, а тры ці нават чатыры рэальнасці. Першая з іх — той свет і тая эпоха, сучаснікам якой з'яўляецца сам аўтар або яго лірычны герой. Інакш кажучы, той час, калі паэма была створана. Сам апавядальнік неаднаразова падкрэслівае, што паказвае падзеі даўно мінулых дзён. Пра галоўнага героя гаворыцца так, быццам даўно яго няма на свеце.

Другая рэальнасць — той час, калі жыў Тарас, калі ён працаваў, калі яшчэ мог апавядаць, нешта паведамляць. Прыгоды палясоўшчыка як быццам утвараюць цэзуру ў яго лёсе. Раней ён быў старанным, руплівым, дбайным. Пасля ж яго адносіны да сваіх абавязкаў карэнным чынам змяніліся.

Сама сцэна ля падножжа Парнаса мае зусім самастойнае значэнне. Яна не звязана ні з папярэднім лёсам героя, ні з яго далейшымі прыгодамі, нават і з падзеямі на гары. Дарога на Парнас — гэта ўжо трэцяя рэальнасць, галоўнымі дзейнымі асобамі якой з'яўляюцца рускія пісьменнікі. Сярод іх называюцца пайменна Пушкін, Лермантаў, Жукоўскі і Гогаль, а па сваіх прыкметах, зразумелых дасведчанаму чытачу, яшчэ вылучаюцца Грэч і Булгарын. Праўда, гэта былі ўсяго толькі цені «з таго свету», якія на момант з'явіліся і тут жа зніклі. У кампазіцыйным плане твора яны адыгрываюць усяго толькі эпізадычную ролю.

Чацвёртая рэальнасць — свет рымскіх і грэчаскіх багоў. Тут аўтар адыходзіць ад самой міфалогіі, праяўляючы асаблівую творчую выдумку. На гары Тарас знаходзіць тых багоў, якія, паводле ўяўленняў старажытных грэкаў, жылі на Алімпе. Затое ж няма там ні Апалона, ні муз — законных гаспадароў Парнаса. Да таго ж няма там і ніводнага пісьменніка, хоць найбольш выдатныя з іх у прысутнасці палясоўшчыка шпарка прамчаліся наперад.

Уся незвычайная гісторыя падарожжа Тараса ўспрымаецца як фантастычны сон, у якім можна дапускаць чаргаванне і спалучэнне самых неверагодных і нечаканых здарэнняў. У беларускай літаратуры канца XIX ст. паэму «Тарас на Парнасе» нечым нагадвае толькі вершаванае апавяданне Ф. Багушэвіча «Быў у чысцы», герой якога таксама наведвае той свет.

Тут узнікае законнае пытанне: калі лічыць, што паэма ўзнікла ў 70—80-я гады XIX ст., дык чаму ж яна звязана з падзеямі літаратурнай барацьбы 40-х гадоў? Вядома, тут можна рабіць толькі здагадкі. Але калі аўтар жыў у глухой правінцыі, адгароджаны ў сталым узросце ад шырокага жыцця, дык ён мог вяртацца думкамі ў мінулае, якое аказала на яго калісьці асабліва моцнае ўражанне і ўплыў. Ці толькі па гарачых слядах падзей пішуцца творы? Тым больш з такім замыславата- фантастычна-прыгодніцкім сюжэтам? Ды варта ўсё ж такі прыняць пад увагу, што сцэна ля падножжа гары — гэта ўсяго толькі эпізод, пасля якога прайшоў неабмежаваны перыяд часу.

Можна ўлічыць яшчэ адно. Не было тады ні радыё, ні тэлебачання, ні вялікай колькасці бібліятэк і кнігарань. І зусім заканамерна дапусціць, што ў глухой правінцыі для чалавека ў сталым узросце найбольш блізкімі былі тыя імёны, з якімі ён добра пазнаёміўся яшчэ ў школьныя гады.

Нявырашаных пытанняў, звязаных з паэмай і яе ідэйным зместам, шмат. Які глыбінны, унутраны сэнс прыгод Тараса? Чаму на Парнасе не аказалася ніводнага з пісьменнікаў? Чаму аўтар так свабодна абыходзіцца з міфалогіяй? Што ў гэтым канкрэтным выпадку сімвалізуе сабой Парнас і чаму на ім аказаўся толькі беларус з простанароддзя? Пры чым тут травестацыя і парадзіраванне высокіх прынцыпаў эпохі класіцызму? Як паэма звязана з літаратурнымі традыцыямі — нацыянальнымі і іншамоўнымі?

Адказ на гэтыя пытанні патрабуе і адпаведных архіўных пошукаў, і ўдумлівага пранікнення ў гісторыка-літаратурны працэс, і новага ўважлівага прачытання самой паэмы. Але некаторыя папярэднія заўвагі можна зрабіць і адразу. На Парнас, апярэджваючы іншых, прабіраецца просты беларускі чалавек. На зямлі ён прыслугоўвае панам. (Заўважым, што і Ф. Тапчэўскі таксама служыў у маёнтку, і яго галоўныя героі паводле свайго сацыяльнага становішча пераважна блізкія шмат у чым да аўтара).

Важна падкрэсліць таксама, што Тарас, як і героі Ф. Тапчэўскага, паходзіў з простанароддзя (успомнім, што Эней быў панам, які, праўда, «удаўсь ласкавы»). У паэме «Тарас на Парнасе» выявіўся новы этап грамадскай і эстэтычнай свядомасці. Новая эпоха засведчана, у прыватнасці, тым, што Тарас не шапку здымае перад панамі (у эпоху прыгоннага права ён так павінен быў бы зрабіць), а сам сярод іх праціскаецца наперад. І абганяе іх.

У гэтай сувязі ўспомнім, што героі ананімнай «Гутаркі Данілы са Сцяпанам» напярэдадні скасавання прыгоннага права мараць:

Будзе тое, браце, дажджом, мой Сцяпане,
Што пан на нас скажа: мой наханы пане.
Мы на іх не глянем і шапкі не знімем,
Хоць блізка нас будуць, не кланяўшысь, мінем.

Парнас сімвалізуе сабой той ідэал ці нават той рай, куды найбольш таленавітыя жыхары зямлі хацелі б трапіць пасля сваёй смерці. Такі ідэал Тарасу, беларускаму мужыку (ці палясоўшчыку, што, па сутнасці, адно і тое ж) уяўляецца ў выглядзе заможнай гаспадаркі, дзе ёсць усё для забяспечанага, бязбеднага жыцця, у тым ліку і добрыя стравы, і вясёлыя пагулянкі. Тарас са шчырым захапленнем, але і з гумарам, апавядае пра гульні багоў, увасабляючы ў іх вобразах звычайных сялян, абмалёўваючы іх падчас з іроніяй, але больш з сімпатыяй:

Узяўшы хустачку, Вянера
Пашла мяцеліцу пісаць;
Прыгожа дужа, чыраз меру,
Ня можна перком напісаць:
Чырвона, тоўста, круглаліца,
А вочы, быць на калясе;
Як жар гарыць яе спадніца,
Устушка длінна у касе.

З захапленнем пазірае на яе апавядальнік. Тут можна ўспомніць, як кантрастуе з гэтым вобраз Венеры ў «Энеідзе навыварат», дзе аўтар бязлітасна абышоўся з багіняй прыгажосці:

Прышла Венера і завыла,
Саплямі змазала ўсё рыла
І так зазюзюкала яна...

Ці той Парнас, што паказаны ў паэме, патрэбен панам, якіх Тарас сустрэў ля падножжа гары? У іх, напэўна, былі іншыя ўяўленні і ідэалы. Таму беларускі аўтар іх тут не паказвае, не цікавячыся наогул іх далейшым лёсам, вынікам іх барацьбы і намаганняў.

У цэлым жа сустрэча Тараса з антычнымі багамі, вясёлыя скокі, у час якіх палясоўшчык выклікае агульнае здзіўленне і захапленне, сімвалізуюць сабой узыходжанне простага беларускага селяніна на нечаканыя вышыні, яго далучэнне да найбольш традыцыйных здабыткаў культуры. Аўтар быццам сцвярджае, што і просты беларус можа з годнасцю трымацца там, дзе традыцыйна пакідалася месца толькі для багоў або людзей высокага звання і герояў. Тарас, пацясніўшы ўсіх і ўзышоўшы на свяшчэнную гару, даказвае сваё права заняць дастойнае месца ў літаратуры.

Вядома, аўтар зніжае колішнія эстэтычныя ўяўленні пра антычных багоў і боскія справы. Але не тут ён з'явіўся наватарам. Галоўнае для яго не парадзіраванне, а абмалёўка простага чалавека, ператварэнне яго ў асноўнага героя свайго часу.

Паэма «Тарас на Парнасе» заслугоўвае таго, каб да яе яшчэ раз вярнуцца нашым даследчыкам. Надзённая задача сёння — сабраць усё, што можна, пра Фелікса Тапчэўскага. І калі ўдасца канчаткова даказаць, што ён з'яўляецца аўтарам не толькі такіх твораў, як «Панскае ігрышча», «Ен і яна», «Саўсім не тое, што было», «Вечарынка», «Грошы і праца», але і паэмы «Тарас на Парнасе» ды вершаванага апавядання «Тэатр», тады ён зойме ў гісторыі беларускай літаратуры XIX ст. ганаровае месца побач з Я. Чачотам, В. Дуніным-Марцінкевічам, Ф. Багушэвічам, А. Абуховічам-Бандынэлі. І прыйдзецца перагледзець некаторыя нашы ўяўленні пра гісторыка-літаратурны працэс таго перыяду.

Уладзімір КАЗБЯРУК.

Музам на пацеху

Уладзімір ПРАВАСУД

Самы сур'ёзны дзень

Такая ўжо завядзёнка ў нашай канторы, што да дня першага красавіка мы рыхтуемся загадзя. Кожны думае, як у гэты дзень найлепш пажартаваць з суседа-таварыша. Нават эканаміст Яўламп Мікітавіч Засмуцянскі, чалавек перадпенсійнага ўзросту, і той не застаецца ўбаку. Праўда, жарты яго носяць аднабаковы характар, больш за ўсё датычацца надвор'я.

Словам, як вы ўжо здагадаліся, дзень першага красавіка ў нас праходзіць пад дэвізам: «У здаровым целе — здаровы смех». Ці ж да работы тут? Іншы за ўвесь дзень нават не можа сесці за свой рабочы стол, таму што, акрамя свайго аддзела, трэба падкінуць хітрых жартаў-сюрпрызаў і суседзям...

І на гэты раз раніцай першага красавіка супрацоўнікі нашай канторы ішлі на работу ўзброеныя рознымі ідэямі і планамі. Кожны ў думках пацяшаўся, як ён «падкудзеліць» таго ці іншага калегу.

Супрацоўнікі адзін за адным ныралі ў праёмы дзвярэй і расцякаліся па сваіх рабочых кабінетах, хоць рабіць у гэты дзень ніхто нічога не збіраўся.

І тут — о, жах!— па канторы папаўзла чутка, што сёння пасля абеду кантору наведаюць ці то рэвізоры, ці то народныя кантралёры. Яе прынесла сама сакратарка нашага начальніка Рамана Сідаравіча Ляпёшкіна — ружовашчокая прыгажуня Рая. Яна клялася, што на свае вушы чула, як нехта «звяху» папярэджваў аб гэтым самога Ляпёшкіна.

Гэтая навіна пераблытала нам усе планы. Адразу стала не да жартаў. Кожны кінуўся да свайго стала, бо ў такога не бывае па рабоце, як кажуць, прарэхаў ці недаробак! Людзі займаліся той справай, якой павінны былі займацца паўсядзённа. І нават тады, калі гадзіннік паказваў абедзенны перапынак, не многія асмеліліся пакінуць кантору. Ліха з ім, з абедам! Не да яго, калі можаш зарабіць на арэхі.

Вось ужо і абед прайшоў, а правяраючых усё няма. Але ніхто на гэта не скардзіцца. Кожнаму на руку, каб яны затрымаліся як мага даўжэй.

Ужо і вечаровы змрок паволі пачаў згушчацца, а кантора і не думала спыняць работы. Вось на калідоры пачуліся крокі нашага паважанага дырэктара Рамана Сідаравіча Ляпёшкіна.

— Што гэта сёння ўсе так дружна працуюць?— нарэшце запытаўся ён.

— Дык жа гаварылі, што нас правяраць будуць,— адарваўся ад сваіх папер Яўламп Мікітавіч Засмуцянскі.

— Хто?

— Ці то рэвізоры, ці то народныя кантралёры,— удакладніў эканаміст.— Сама Рая нас папярэдзіла...

І тут нашага паважанага Рамана Сідаравіча нібы чэрці пачалі казытаць. Ён зарагатаў так гучна, як, напэўна, ніколі яшчэ ў яго і не атрымлівалася.

— Дык гэта ж я раніцай пажартаваў,— не ў сілах стрымаць смех, прагаварыў ён.

А мы аслупянела глядзелі на нашага дырэктара, і толькі цяпер да нас дайшло, які сёння быў дзень.

ДЗІВАК-ЧАЛАВЕК...

— Што б яшчэ адбіць: у скульптуры нічога не павінна быць лішняга.

Мал. М. ШЫШЛОВА.

ДЗІВАК-ЧАЛАВЕК...

Мал. П. КОЗІЧА.

Анатоль КЛЫШКА

СУЧАСНАЯ ЭПІГРАМА АНТЫЧНЫМ ПАМЕРАМ

Дарыш мне кнігу сваю цаной тры рублі з палавінай...
Братка, навошта яна, — дай лепш гатоўкай цану!

СТАРШЫНІ ТЫРАЖНАЙ КАМІСІІ

Тыраж некаторых раённых газет
Дасягае 10 тысяч экземпляраў.
(З даведніка)
Забыўшы пра культуру і пра публіку,—
Як бы сышоўся клінам свет,—
Для шматмільённае пісьменнае рэспублікі
Дае тыраж — на сельсавет!

Язэп БЯРОСТА

ПРАМОВА

На сходзе
Аўтара рамана
Гарачым словам крытыкі пяклі.
Прамовы палымяныя цяклі...
Дайшла чарга да чытача Івана.
Іван устаў,
Разумны позірк кінуў
І кажа:
— Гэтак не павінны
Мы аўтара крытыкаваць,
Бо твор напісаны на «пяць»,
Героі, кампазіцыя, сюжэт...—
Усё абдумана як след!
Відаць, у крытыкаў кульгае густ.
І з імі я згадзіцца не магу!
Прамова мела сваю мэту:
Іван сам нарысы пісаў,
А друкаваць насіў іх у газету,
Дзе аўтар кнігі працаваў.

Мікола ЧАРНЯЎСКІ

ЯК ГАЛУБЫ...

— Адгрымелі вясельныя маршы
Толькі ўчора нібы.
Як жывуць маладзёначкі нашы?
— Ды, сват, як галубы.
— Што, парадак у хаце,
Сцэн і звад — ні гу-гу?
— Сам, прызнаюся шчыра я, сваце,
Зразумець не магу.
Бо гляджу і гадаю:
Згода ў іх ці вайна? —
Сёння —
Ён праз акно вылятае,
А назаўтра —
Яна.

З НАРОДНАГА

ПАРАІЎ

— Скажы, Сцяпан, чаго гэта Пранук глядзіць на мяне скоса і зубамі скрыгае?
— Ён на цябе скрыгае, а ты на яго паляскай.
— Ого, паляскаеш, калі ў роце ніводнага зуба.

ВЫЧЫСЦІЛА

— Чаго гэта ў вас, Даніла, учора пад вечар моцна крычалі?
— Сажа ў коміне загарэлася.
— Ну і што, вычысціла комін?
— Ага, усё вычысціла, адна печ асталася.

АШУКАЎСЯ

Жонка крычала на ўсю хату, сварылася на мужа.
— Але ж я раз у жыцці і ашукаўся.
— І калі гэта было?
— Тады, як на табе, крыклівай, жаніўся.

Сабраў П. ГРЫНЕЎСКІ.

На блакітным экране

з 1 па 7 красавіка

1 красавіка, 20.15

ДЗЕННІК УСЕСАЮЗНАГА АГЛЯДУ самадзейнай мастацкай творчасці, прысвечанага 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Мінск.

3 красавіка, 20.15

ЛІТАРАТУРНЫ ТЭАТР. П. МАКАЛЬ. «СМАК ЯБЛЫКА».

Рэжысёр У. Траццякоў. Ролі выконваюць А. Жук, Л. Улашчанка.

4 красавіка, 19.45

АДКРЫЦЦЕ ФЕСТЫВАЛЮ «МІНСКАЯ ВЯСНА».

Сімфанічны канцэрт у 2-х аддзяленнях.

6 красавіка, 10.00

ТЭЛЕВІЗІЙНЫ КЛУБ САМАДЗЕЙНАЙ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ.

Вы пазнаёміцеся з народнымі тэатрамі Брэсцкай вобласці: з Іванава, Целяхан, Баранавіч, Пінска.

Размова пойдзе аб спектаклях, прысвечаных 40-годдзю Вялікай Перамогі.

Вядучы — журналіст М. Пракапові́ч.

6 красавіка, 14.30

ФЕСТЫВАЛЬ МАСТАЦТВАЎ «МІНСКАЯ ВЯСНА».

Канцэрт песні.

6 красавіка, 17.05

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ».

У гэтым выпуску літаратурнага альманаха мы сустрэнемся з нашымі літаратарамі ў не зусім звычнай якасці. Паэтэса Н. Тулупава раскажа пра сваю работу ў якасці песенніка. Паэтэса Г. Каржанеўская выступіць з разважаннямі пра маладую драматургію. Пісьменніца Г. Васілеўская знаёміць з работай Бюро прапаганды пры Саюзе пісьменнікаў Беларусі. В. Іпатава прачытае свае новыя вершы. У перадачы прымае таксама ўдзел спецыяльны карэспандэнт «Литературной газеты» А. Казловіч.

6 красавіка, 23.15

«СУСТРЭНЕМСЯ ПАСЛЯ АДЗІНАЦЦАЦІ».

Эстрадная музычная праграма з удзелам В. Лявонцьева, Я. Йоалы, Р. Паўлса, вакальна-інструментальных ансамбляў «Песняры», «Верасы», «Сябры», «Зямляне», балетнай групы з ЧССР.

7 красавіка, 15.20

АУТАРСКІ КАНЦЭРТ народнага артыста СССР Я. Глебава.

7 красавіка, 17.05

«КІНААФІША».

Перадача знаёміць з красавіцкім кінарэпертуарам.

Вядучы — В. Анісенка.

АБ'ЯВЫ

Саюз пісьменнікаў БССР, выдавецтвы «Мастацкая літаратура» і «Юнацтва» і Мінскі аблкнігагандаль 4 і 5 красавіка праводзяць у Доме літаратара (вул. Фрунзе, 5) Дні выдавецтваў «Мастацкая літаратура» і «Юнацтва» з пашыранай выстаўкай-продажам кніг гэтых выдавецтваў.

У гэтыя дні для вас будуць арганізаваны сустрэчы з супрацоўнікамі выдавецтваў і кнігагандлёвымі работнікамі. Вы зможаце выказаць свае заўвагі і прапановы па змесце, мастацкім афармленні і паліграфічным выкананні кніг.

Запрашаем вас на выстаўку-продаж. Час работы выстаўкі—з 11 да 19 гадзін.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
АТ 04163 П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП. Мінск, вул. Захарава, 19.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная рэдакцыі—33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—33-25-25, адказнага сакратара — 33-19-85, аддзела публіцыстыкі — 33-19-65, аддзела прозы і паэзіі — 33-22-04, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-22-04, аддзела мастацтваў — 33-21-53, аддзела арганізацыйна-масавай работы — 33-19-65, аддзела культуры — 33-24-62, аддзела інфармацыі—33-24-62, аддзела мастацкага афармлення і машынапіснага бюро — 33-44-04, фоталабараторыі — 33-24-62, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65, карэктарскай — 32-20-64.

Рэдакцыя прымае і разглядае апавяданні, нарысы, артыкулы — да 12 старонак, рэцэнзіі, інтэрв'ю, карэспандэнцыі, нататкі — да 6 старонак, вершаваныя творы — не больш як 150 радкоў. Матэрыялы прымаюцца надрукаваныя на машынцы ў двух экземплярах.
Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь ЖУК.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Барыс БУР'ЯН, Мікола ГІЛЬ (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Віктар КАВАЛЕНКА, Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА, Віктар ТУРАЎ, Паўла УКРАІНЕЦ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ.

Адказны сакратар Пятро СУШКО.